Людміла Рублеўская

Шыпшына для Пані

Вершы і эсэ

www.kamunikat.org

Мінск
“Мастацкая літаратура”
2007

САД

1

Я прыйшла ў гэты сад — бы ў свет
Немаўля — праз боль і пакуты.
Так да прозы ідзе паэт,
А мысляр — да сваёй цыкуты.
Я прыйшла ў гэты сад — таму,
Што дарогі ў кропку сышліся,
І не ўпасці ў ногі таму,
Хто ні разу мне не з'явіўся.
Я прыйшла ў гэты сад — не быць,
А забыцца, як лёс ірвецца,
І разблытаць срэбную ніць,
На якой падвешана сэрца.
Ад спрадвечнай нашай журбы
Па нязбытным — сысці, схавацца...
Я прыйшла ў гэты сад — нібы
На радзіму вярнуўся здрайца.

2

Самотны сад!
Хіба самотным сад бывае?
Біблейскай горыччу напоена лістота.
Тут цень — карункавы і цішыня — жывая,
Нібы анёл сыходзіць па зялёных сходах.
Плыве каўчэг пад чарапічным вострым дахам,
У моры кветак патанае сэнс пакуты.
І танчаць кветкі, быццам гоеўскія махі,
Нібы пялёсткі іх калісь не стануць брудам.
Тут растаюць мядовай кропляй забабоны,
Тут чысціня сваёй абранасці баіцца.
Святы Францыск з ружовай хмаркі, бы з амбона,
Гаворыць з ластаўкай, малой сваёй сястрыцай.
Самотны сад! Адкуль твая жывая горыч?
Чаму вада твая адно абвострыць смагу,
Тугу па садзе тым, дзе нас любоў агорне,
Тугу па тых краях, дзе кветкі шчасцем пахнуць?

3

Мы будуем сабе не дамы — астравы.
Вып'е сад твой цябе — бо тваёй прыгажосцю
Ён квітнее, пакуль малады і жывы.
Гэтак пышна буяе трава на пагосце.
Мы пагост прыкрашаем... А думаем — дом.
І крывавая лінія крывіцца ў шыбах,
І ляцяць аскалёпкі, і сад быльнягом
Зарастае, і мерзнуць буслянкі на ліпах.
Мы будуем сабе не дамы — астравы
У спадзеве таемным застацца наверсе,
Над сабой, над зялёным патопам травы,
Недасяжныя ў брыдкай зямной куламесе.
Ды сцяжынкі сплятаюцца, быццам кубло
Засынаючых гадаў, гадоў жураўліных.
І ў пагост ператворыцца наша жытло,
І садоўнік абрэжа сухія галіны.

4

Кола пракоціцца сцежкамі саду твайго,
Па маргарытках — слядах Прыснадзевы Марыі.
Вогненная калясніца. У садзе — агонь.
Кветкі — навошта, калі тваё сэрца спалілі.
Госць не заўважыць пяшчотны пялёсткавы дождж,
Не пераступіць жука, што паўзе па сцяжынцы.
Пройдзе праз сад — як праз яблык навостраны нож.
І распадзецца Сусвет твой на дзве палавіны.
Князь не павінен ніколі вяртацца дамоў —
Сад, што жанчына ўзрасціла, занадта пяшчотны.
...І выцякае з суніцаў салодкая кроў,
Круцяцца колы, нібыта пякельныя жорны.

5

Сястра! Як гэта ўсё несправядліва.
Не помніць кветка аб памерлым зерні.
Сыходзіць князь, абразліва шчаслівы,
У той палац, дзе не сады, а сцены.

Што ім, сур'ёзным, самавітым воям,
Да маргарытак, хмарак і пакутаў.
Сад аніхто не забярэ з сабою,
Лацвей — куфэрак, золатам акуты.
Сцякаюць рэкі з цёмных плеч Атласа,
Тытана, што сцярог сады багіняў,
Ды не ўсцярог...
Садоў любых акраса
Не для таго, хто дзеля іх загіне.
Сады расцяць не для сябе... Ніколі
Не адгадаць, хто стопча тваю квецень.
І ломіцца галінка з крыкам болю,
Не ёй смяецца пераможны вецер.

6

Чужыя дамы... Як абрыдлі чужыя дамы!
Па іх нажабруеш наўрад цеплыні і любові.
І звязвае ў роце, як прысмак няспелай хурмы,
Ад слова любові, прыветна-адчэпнага слова.
На ўскрайку чужога гнязда немагчыма любіць.
І ў дом ператворыцца сад і мяне абароніць
Ад злых карагодаў і ад залатых калясніц,
Ад усведамлення, што лёс мой — стаяць на пероне
І быццам чакаць... А каго? Уратуй мяне, сад!
Я ружу вятроў з твайго сэрца з карэннямі вырву.
Ты — дом мой... Ты — свет мой...
Засцелецца твой лістапад
Кілімам — па сцежцы маёй у завоблачны вырай.

7

На хвалях лазуркавых бэзу, над белымі зоркамі глогу
Гайдаецца чоўнік малітвы — вось-вось адляціць за аблокі.
Між кветкаю кожнай і небам
тут ёсць ланцужок непарушны.
А я — ці патрэбная ў гэтым сумоўі суквецця ў і душаў?
Так Сын Чалавечы маліўся ў начы Гефсіманскага саду,
І поўня здавалася ў небе чырвонай, як кветка граната.
А людзі нічога не чулі, як зараз не чуюць нічога,—

Ні ўласнага сэрца, ні болю чужога, ні кветак, ні Бога.
І я ў гэтым садзе — як птушка,
што вырасла ў цеснае клетцы.
Навошта мне дадзены крылы, навошта пакутуе сэрца?
І з чоўнікам кволым малітвы спрабую ўзляцець над сабою...
І з кветкамі ўверх узлятаю і падаю ўніз з лістабоем.

8

Змяя заўсёды марыць аб кароне.
А кветка проста аддае пялёсткі
За свой працяг, за маладыя гронкі,
І век яе — бясконцы і кароткі.
Змяя ўспаўзае на алтар каменны
І грэецца ў святле Царыцы Ночы.
І лес вакол яе ўздымае сцены —
Карона без палаца быць не хоча.
А сад сваіх былых не помніць кветак.
Ён — Храм, які яны сабой будуюць.
Безабаронны, вечны, ціхі, светлы —
Адзіны Храм, які мяне ўратуе.
Блішчыць карона ў белых промнях поўні.
Начныя кветкі раскрываюць сэрцы.
Я не хачу — цяжкі абруч на скроні.
Я ў сад іду, каб з кветкамі сустрэцца,
Каб знішчыць боязь знікнуць назаўсёды,
Не зажадаць скрываўленых скрыжаляў...
А на алтар змяіны носяць соты
І цягнуцца далонямі да джала.

9

Сад камянёў і сад шыпшыны...
Далёкія, як дзве краіны,
Бясконцыя, нібы вар'яцтва.
Што можа сэрца? Разарвацца
Між імі, прымірыць не ў змозе
Іх моц — нібыта верш у прозе.
Дзве ісціны... Дзве формы снення...

Мой сад — і кветкі, і каменне.

2002

Сад камянёў

Камень — падмурак Сусветнага Дрэва. Камень — Пётр, той, хто тройчы адрокся ад свайго Настаўніка, але стаўся падмуркам яго Храма...

Паводле Борхеса, некаторы час Заір — рэч, пра якую, раз убачыўшы, чалавек не перастае думаць, пакуль не звар'яцее, знаходзілася ў жылцы мармуру адной з тысячы двухсот калон мячэці ў Кардове.

Кожны камень — гэта Алеф таго ж Борхеса, кропка, у якой увесь сусвет.

Беларуская легенда расказвае, што людзі ўтварыліся ад камянёў. Водгулле антычнага міфа пра Сусветны патоп, які Зеўс учыніў пасля дзёрзкай кражы Праметэя. Ацалелыя мужчына і жанчына скарыліся Зеўсу і прыніжана малілі аб выратаванні чалавецтва. Зеўс злітаваўся. Каменне, што кідала праз плячо жанчына, ператваралася ў жанчын, кінутае мужчынам — у мужчын. Відаць, такіх жа пакорлівых і жывучых, як ацалелая пара.

А яшчэ на Беларусі гавораць, што камяні колісь раслі, аж пакуль Маці Божая не пабіла аб адзін з іх нагу.

Менск узнік наваколь млына, у якім асілак Менеск малоў каменную муку. Які хлеб з яе пёкся?

Зямля — гэта цвердзь. Цвердзь — камень. Тонкі слой глебы — не больш чым пот, які праступае на каменнай скуры планеты.

У «Беларускай энцыклапедыі» няма артыкула «камень». Ёсць каменныя рэкі, ёсць камень філарэтаў і камень кахання, ёсць каменямёт — старажытная ліцвінская гармата. Ёсць нават камень як старажытная адзінка масы ў Вялікім княстве Літоўскім. Адзін камень быў роўны 40 фунтам, каля пятнаццаці кілаграмаў. А вось проста каменя — няма... Можа, яго залічылі да паняццяў, якім немагчыма даць тлумачэнні?

Кажуць, камень — метафара гары. З якой чалавек толькі й можа звяртацца да Бога. У нас няма гор, таму ёсць камяні-следавікі, на якіх пакінулі сляды святыя і прарокі. Таму — і

гранітныя трыбуны правадыроў. Слова, сказанае з каменя, лічылася асвечаным нетутэйшай моцай.

Японцы кожны камень насяляюць духам.

У японскім садзе камянёў — пятнаццаць валуноў на белым пяску, які разроўніваюць граблямі, прыпадабняючы хвалям. Але з якога боку ні глядзі — ты ўбачыш толькі чатырнаццаць камянёў. Пятнаццаты заўсёды будзе схаваны за іншымі. Але ты ведаеш, што ён ёсць.

Горад называюць каменным светам. Папікаюць ягонай каменнасцю. Можа, таму, што камень яго — штучны? Або пасечаны на кавалкі, разроўнены, скалечаны?

У Японіі рыхтаваць камяні для ўпрыгожвання садоў — пачэсная, патомная прафесія. Аказваецца, прыродны камень рэдка выглядае дастаткова «дзікім». Яго натуру трэба раскрыць, «абнатуральніць» з дапамогай чалавека.

Нашы далёкія продкі шанавалі ўсё, што можа служыць верным знакам на доўгіх шляхах пакаленняў — магутнае дрэва, гару, вялікі камень... У пустцы насыпалі каменныя крушні. Сённяшні наш зямляк усё разгладжвае, зруйноўвае, здрабняе. Занадта высокія дрэвы высякаюцца — а раптам паваліцца, правады абарве? Кудысьці знікаюць валуны... Брукаванкі заліваюцца асфальтам. Праўда, апошнім часам у горадзе пайшла новая мода. Замест асфальту ў найбольш важных месцах кладуцца маленькія бетонныя плітачкі, што мусяць імітаваць колішнія камяні. Маленькія магільныя пліты нашай гісторыі.

Неяк вычытала, што ў тоўшчы пліты егіпецкай піраміды знайшлі чалавечы волас.

Святая чаша Грааль на самай справе была каменнай. Высечанай з простага булыжніку. Памятаеце, у спілбергаўскім «Індыяне Джонсане» належала выбраць сапраўдны Грааль з мноства чаш? Злыдні хапаюцца за самую прыгожую, залатую, з каштоўнымі камянямі пасудзіну — і гінуць. Герой выбірае «чашу цесляра» — з гліны. Фактычна, таксама з каменю.

У Мецы пакланяюцца чорнаму каменю, па сцверджаннях навукоўцаў — метэарыту.

Святарныя камяні змазвалі тлушчам, палівалі віном. Часам крывёй ахвяр. Мы кладзём на камень кветкі — да ўсёмагчымых помнікаў.

На магіле Караткевіча — камень. Каб мы не зблудзілі сярод бронзавых бюстаў.

Дзе бываю — стараюся прывезці адтуль каменьчык ці кавалачак цагліны. Раскладзеныя на стале, яны нібыта палоннікі з розных краін, сагнаныя на скрыжаванне. Кавалак Берлінскай сцяны, куплены ў Берліне ў турка, ляжыць ля паўкруглага аскалёпка ад маскоўскага Васіля Блажэннага. А побач — кавалачак Мірскага замка. Аскалёпак каменя дарогі, па якой пятае стагоддзе басанож паломнікі ўздымаюцца да манастыра Святога Васіля Астрожскага ў гарах Чарнагорыі. Каменьчык з вежы Гедыміна... Каменьчык з Вавеля... З Калізея... Як пасля Армагедона. Ёсць і кавалак сёмага цуду свету — храма Артэміды Эфескай, таго самага, што спаліў, прагнучы славы, Герастрат. Цяпер храм — на тэрыторыі Турцыі. Балота, сабраная з розных фрагментаў калона, на ёй — гняздо буслоў...

Для атрымання філасофскага каменю належала здзейсніць дванаццаць этапаў Вялікага дзеяння. Філасофскі камень ператварае цела ў святло. Менавіта пра гэта — ператварэнне цела ў святло — і гавораць тыя, хто вывучае Турынскую плашчаніцу з адбіткам цела Хрыста. Часам філасофскі камень атаясамлялі з Краевугольным каменем свету — з Хрыстом.

Самае моцнае чароўнае люстра — з каменю, адшліфаванага да люстранасці.

Праметэй на памяць пра доўгія пакуты на скале насіў на руцэ металёвае кальцо з часткай ланцуга і аскалёпкам скалы, да якой быў прыкаваны. Адсюль пайшла легкаважная мода на пярсцёнкі і бранзалеты з камянямі.

Чалавек заўсёды імкнуўся прыўлашчыць сабе сілу каменя. Маліўся яму, ствараў штучныя горы, збіраў каштоўныя камяні і камяні-талісманы...

А Мандэльштам проста назваў свой рукапісны зборнік «Камень».

Камяні руін — наша гісторыя. Яны распаўзаюцца з парэшткаў замкаў — Наваградскага, Гальшанскага, Крэўскага... Надмагільныя камяні на Кальварыйскіх могілках быццам чаўны, што разбіліся аб бераг бяспамяцтва... Камяні менскіх брукаванак — пад асфальтам... Храм нашае гісторыі — гэта проста камень.

* * *

Мы шукаем адзін аднаго, быццам птушкі ў віхуры.
Мы, як птушкі, збіваемся ў зграйкі — сагрэцца і выжыць.
Ды каб выстаяў дом.
Нашы сэрцы паклалі ў падмурак,
І запоўнены стогнамі ў сценах каменныя нішы.
Над высокімі вежамі рвуцца на часткі аблокі,
Мы не мелі прытулку, які падарылі камусьці.
І даворвае час па-за нашымі снамі валокі.
І пасеецца зерне,
І нас у калоссях не будзе.

Род

Высокі род. Разбураны палац
Ці хата, што на тым жа самым месцы
Раз дзесяць будавалася.
Глядзяць
Праз вокны продкі,
А жыве там — вецер.
Род.
Кроў яго ўбірае, бы рака,
Дабро і зло і рысы вызначае,
З якімі сын твой будзе ці дачка
Жыць з ганьбаю, са славай ці звычайна.
Не выдумка блакітнае крыві,
А ісціна разумнае істоты —
Свой ведаць род і гонар радавы
І рушнікі захоўваць, і кляйноды.
У свеце адасобленых няма.
І ты — камень у бруку ці ў кароне.
Знайдзі свой герб.
І прадзеда імя
Успомні.

www.kamunikat.org

Радавое гняздо

Пальцы гладзяць патрэсканы лак на партрэце.
Здасца, што фарбы праменяць чамусьці цяпло.
І праз разбіты вітраж завітае пан вецер...
Вось яно, продкаў, амаль што забытых, жытло.

Колькі змянілася тут пакаленняў і лёсаў!
Колькі вяселляў і колькі самотных старых!
Гэтыя сцены, што пахнуць гніллём і марозам,
Бачылі смерць, і каханне, і вояў чужых.

Бедны нашчадак у джынсавых портках, якія
Прадзед аддаў бы прыслузе на стайню насіць,
Памяць твая анічога табе не адкрые,
Як тут жылі! Так ніколі табе не пажыць.

Што за размовы ўчынялі за кубкам гарбаты
Інтэлігенты мясцовыя ўзросту твайго.
Свет перайначыць хацелася! «Хто вінаваты?»
Ды «Што рабіць?» — паўтаралася з году ды ў год.

Тут атэізм прапаведвалі кветкі-курсісткі,
Потым — вянчаліся, дзетак хрысцілі сваіх.
Тут пачыналіся спрэчкі аб мове мужыцкай
І беларусам назваў сябе нехта з сям'і.

Як яны марылі шчасце нашчадкаў наблізіць!
Волю ўспявалі, шукалі дарогі прамой...
Дом іх зрабіўся маёмасцю сацыялізму,
І пад нагамі нашчадка — тынкоўка і гной.

...Цені паненак вальсуючых, рэшткі паркета,
Мат рускамоўны на сценах, парваны плакат...
Цьмяны пагляд ацалелага цудам партрэта...
Час не павернецца... Дый і не трэба — назад.

Выйдзі адсюль, з апаганенай цёмнай грабніцы.
Хто вінаваты — не думаць пра гэта лягчэй...
Ветах запаліцца яснаю свечкай грамніцаў.
З вёскі чужой ты паедзеш як можна хутчэй.

Могілкі Роса

Каменная Вільня... Сляпыя дажджы...
На могілках Роса — раса і смаўжы
На помніках, што не вартуюць магіл.
На плітах — адбіткі абсечаных крыл.
Запозна прыйшлі мы сюды на паклон.
Заместа магіл — толькі рэха імён...
Разбіліся нашы легенды на друз...
У кожным каменьчыку — ёсць Беларусь,
Ды імі пасыпаны сцежкі даўно
Да помнікаў іншых гісторый і сноў.
Каменная сцэна... Кулісы — дамы,
Дзе ролі герояў пісалі не мы,
Дзе нашых герояў іначай завуць,
Дзе ў кожным каменьчыку спіць Беларусь...

Злодзей

Ладдзі праплывуць аднойчы між гэтых лясістых выспаў,
Анёл праляціць аднойчы над гэтай азёрнай пушчай.
І дождж са слядоў стамлёных маіх ці казуля вып'е,
Ці то капыты пагоні расплешчуць, як лёс раструшчаць.
Анёл праляціць аднойчы... А куля заб'е адразу.
Гуляй, маладое цела! Здабычу хавай і волю.
Дукаты мне не патрэбны, каштоўней — абразіць князя,
Хай коні яго шаленства патопчуць і лес, і поле.
Але яшчэ найкаштоўней — пра вусны княгіні памяць,
Усмешлівых па-юнацку і строгіх — пры строгім мужу.
І ведае зараз лірнік, каго высмейваць і славіць,
І ведае князь, што ганьбы і смерцю маёй не здужаць.
Ківаецца святаяннік агнём хваравіта-жоўтым,
Я сам выбіраю месца апошняй бойкі і славы.
Я вольны і ў самай смерці — і гэта мне ўзнагарода.
І золата сыплю ў рэчку. А сам я — умею плаваць.

Княгіня

Карункавы вэлюм у колер асенняга неба
Застаўся на хвойцы, дрыжачай ад брэху сабак.
Ад блізкасці звера загоншчыкі быццам аслеплі,
Інакш не ад'ехаць бы мне з-пад нагляду ніяк.
Мой князь, малады і зацяты, карбач прыўздымае.
Ён добра наўчыўся ударам адным забіваць.
А я ад'язджаю, і пушча мяне паглынае,
І нат паляўнічых рагоў тут ужо не чуваць.
Я іншую музыку чую. Я помню музыку,
Які за агністыя вочы, за песні з нябёс
Зрабіўся ахвярай — было паляванне вялікім.
Ён доўга ўцякаў — і загінуў без крыку, без слёз.
Нічога мой князь не сказаў ні тады мне, ні потым.
Ды лютні сваёй не знайшла я аднойчы нідзе.
Прысады палаца схавалі мой скрушлівы роздум,
Каханне ж схаваць — толькі ў лесе, зямлі ці вадзе.
Змыкаюць пушчанскія хвоі над сцежкаю шаты,
І конь спатыкаецца...
Можна яго адпусціць.
Дарую зямлі беларускай убор свой багаты,
А душу — душы, без якой я не згодная жыць.

Наваградскі замак

Камяні апусцелага замка спаўзаюць з гары,
У прабоіны сцен зазірае сузор'е Дракона.
Сняць князі наваградскія замка былыя муры,
У зямлі сваёй сняць, што зямля іх жыве нескарона.
Камяні апусцелага замка пад небам ляжаць,
Быццам воі забітыя, замка таго абаронцы.
Там Радзіма мая, там з мінуўшчынай слаўнай мяжа,
Там буслы пераносяць на крылах чырвонае сонца.
Сны князёў наваградскіх, я веру, паўстануць калісь
Гэткай явай — якая не снілася тым, хто не верыў.
І муры апусцелага замка пацягнуцца ўвысь,
І за вежу зачэпіць сузор'яў бурштынавы нерат.

Вільня

У горадзе мінулага жыцця
Ты пазнаеш абрысы цёмнай вежы,
Што ў снах так часта над табой ляцяць
І пахаванай памяці належаць.
Ты ведаеш, як можа пахнуць брук,
Калі ляжаць на ім з апошняй ранай.
І кожны мост напомніць крокаў гук,
І бляск паходняў — кожны мур цагляны.
Ты раптам зразумееш, дзе зручней
Ад вершніка ўцякаць, якім завулкам.
Дзве зоркі раптам скоцяцца з вачэй,
Калі каменны крыж пагладзяць рукі.
Вось гэтае вакно дарыла сум,
А тыя дзверы —
памятаюць шчасце,
І дзіўны водар страчаных парфум,
І шоргат пазалочанага плацця.
У горадзе мінулага жыцця
Ты сустракаеш твары, як маланкі,
Што асвятляюць нешта з небыцця,
Дзе тэлевежу не вартуюць танкі.
Тут нават вецер — смаку таямніц.
Тут могілкі імя маё хаваюць.
Цяпер цяжэй, напэўна, будзе жыць,
Так бессаромна агаліўшы памяць.
Але лягчэй, напэўна, паміраць,
І сэнс жыцця знаходзіць не ўсляпую,
І гэты горад назаўжды кахаць
І ў вечнасць узірацца напрамую.

Пясняр

Мой шлях абмінае густыя лясы,
Высокія замкі і вежы.
Спакою не ведаць, карон не насіць
І Госпаду толькі належаць —
Раскоша! Кілім верасовы і ноч,
І райскія птушкі шчабечуць.

www.kamunikat.org

І што мне да нечых спалоханых воч,
Да брыдкіх страсцей чалавечых?
Я — песня. Аднойчы замоўкнуць — не жыць.
Гукну — і сусвет адгукнецца.
І з неба крынічкай вясёлка збяжыць,
І ў камні загрукае сэрца.
Але для людзей назаўсёды нямы.
Стаміўшыся лаяць і хапаць,
Яны спачываюць і поўняць дамы
Юрлівымі снамі і храпам.
Ніколі, нікому — ні слова майго.
Што перлы — свінячай пародзе?
Я буду спяваць для дажджоў і снягоў,
Для ветраў і траваў — і годзе.
Чаму ж ты знясілела, песня мая?
Цябе адпусціў я на волю.
Ніхто тут не зможа нас больш абсмяяць.
Не зведаеш крыўды і болю.
Ніхто не пагоніць, ніхто не заб'е...
Ляці, як калісьці, да зорак!
Пакінуць не можаш ты грудзі мае,
Як мацерку хворы дзіцёнак.
Чаго не хапае? Няўжо бізуноў
І сытага рогату з вокнаў
І трэба вяртацца ў зняволенне зноў
Для нейкіх вар'яцкіх законаў?
Слязінкамі капаюць зоры з нябёс...
А помніш, як плакалі людзі
І слухалі песню, як слухаюць лёс,
Як моляцца Богу аб цудзе?
А помніш, як часам у нечых вачах
Ад песні успыхвалі зоры,
І значыць, што нехта забыўся на страх
І здрадзіў навечна пакоры.
Імгненні... Як рэдка такія былі...
А можа, іх дзеля — і толькі —
І дадзена быць песнярам на зямлі
І грэх адлятаць за аблокі?
Мой шлях абмінае густыя лясы,
Высокія замкі і вежы.
Спакою не ведаць, карон не насіць

І Госпаду толькі належаць
І быць — да апошняга — гэтым жыву —
З народам сваім і ў народзе.
Ці кінуць за спевы мядзяк на траву,
Ці зноў бізунамі заплоцяць.

Стары інсургент

Мы запалім пахавальныя свечкі.
Пад нагамі — футра срэбнай лісіцы.
У высокіх кубках пеніцца вечнасць
З пахам верасу і свежай ігліцы.
Пад вакном — віжы, віжы — за дзвярыма,
І карэта з дзверцай закратаванай
Пад'язджае, як Атыла — да Рыма,
Да сядзібы нашай абрабаванай.
А пакуль што вогнік скача ў каміне,
Футра белае — з чырвоным адценнем,
А пакуль што любы край не загіне,
Засцянковым створаны летуценнем.
Срэбным колерам лісіцы загнанай —
Мае скроні... Колер зімняе буры...
Вып'ем келіхі свае, мая панна!
Шаблю продкаў не хаваюць у куфры.

Вечар у засценку

Стары крышталь, ад часу цьмяны,
Блакітным сяйвам шафу поўніць.
Віжамі дзверы не ўзламаны,
І зоры ўцягваюцца ў комін.
Засохлым лісцем пахнуць кнігі.
Чытанне пры агні — як воля.
І ў наваколлі ціха-ціха,
Таемна ціха — як ніколі.
Дрымота дыхае за крэслам
Ці смерць? Прыпынак ці дарога?
А сэрца стукае, як цесля,
Збівае лесвіцу да Бога.

www.kamunikat.org

На разуменне спадзявацца
У гэтым свеце — проста слабасць.
І мы выходзілі на пляцы,
Вучыліся дзвярыма ляпаць.
І вось — па склепах, па маёнтках
Параспаўзлося пакаленне.
А варта высунуцца вонкі —
Гразёй запэцкаеш каленкі.
Напалеоны і Касцюшкі
Сядзяць у вальтэр'янскіх крэслах.
Хай сцены і прыдбаюць вушы —
Душу маўчанне робіць смелай.
Занадта ўтульна ў гэтым крэсле,
Каб сцюжу наклікаць праз слова.
Няхай крышталь у шафе свеціць —
Звычайны посуд засцянковы.

Курсісткі

Вы жылі, паненкі-шыпшыны,
На маёй пакутнай зямлі.
Ад бацькоў, багатых і слынных,
Ад партрэтаў фамільных пыльных
У бядачкі-курсісткі йшлі.
Састрыгалі цяжкія косы,
Як адвечны жаночы шлях.
Не над пяльцамі — а над прозай
Дастаеўскага і Спінозы
Вы сядзелі па вечарах.
Як вы верылі, як любілі!
Як за любымі йшлі ў народ!
Толькі ў дзеўках часцей хадзілі
Ці ўміралі вы ад сухот.
І ў дзявочых танклявых пальцах
Скальпель цвёрды быў, як душа.
Толькі ў ятрасці пракламацый
Ды ў самоце падчас вакацый
Голас ваш цудоўны дрыжаў.
Вас цураліся нават блізкія,
І дзівіліся з вас віжы:

Што вам сілы давала выстаяць,
Польскі гонар у сэрцы вытравіць,
Беларускамі быць і жыць?
Перад вамі, бы прад святымі,
На калені хочацца ўстаць.
Хоць магілы вашы забылі,
Сэрцы вашыя маладыя
На шыпшыне вясной гараць.

Шляхта

Першы снег над мястэчкам,
І мерзнуць званы на званіцы;
І ў маленькі маёнтак з'язджаецца шляхта на баль.
І глядзяць з-пад рукі на паненак здаля маладзіцы —
Люд мясцовы, загадкавы, просты, як белы паркаль.
Мы жывём, нібы прыхадні тут,— шляхта, кветкі-прыкрасы.
Пакаленні змяняюцца — тыя ж бязродцы растуць.
Што за людзі жывуць тут? Якія тут рэчкі і краскі?
Што за песні пяюцца? На мове якой нас клянуць?
Невядома. Бліжэй нам героі пагаслай Элады
Ці маркізы парыжскія, нават расейскі разбой...
І не нам напяваюць балады пушчанскія шаты,
Абыходзіць дамы нашы лірнік з пагардай сляпой.
Як расплоцяцца горка за гордую пыху нашчадкі,
Як завяцуць яны на зямлі, што не стала сваёй.
Выцвітаюць, як душы, кляйнодаў старыя пячаткі,
І змяшаецца смерць назаўсёды з блакітнай крывёй...
І ляцяць над мястэчкам іскрыстыя Штрауса вальсы,
А званы на мясцовай званіцы цяжкія, як лёс.
Не заўважаць вас нават, бязродныя кветкі-прыкрасы,
У гнілой каляіне ад бедных сялянскіх калёс.

Партрэт бабулі

Прабачце, паненка, у строях шляхетных, цнатлівых,
З бялюткім праборам у гладкіх, як лён, валасах.
Былі вы з гасцямі прыветнай, прыстойна-маўклівай.

І думка адна пра каханне навейвала страх.
А мне ўжо нічога ад вас не пакінулі воды,
Імклівыя воды старой радаводнай ракі.
Спадніцы крухмальныя сталі пялюшкамі потым,
Каўнер-самавяз памяняны на лыжку мукі.
І рукі, што ўмелі задумліва клавішы лашчыць,
І крыжыкам шыць, і лацінскія кніжкі гартаць,
Пасля навучыліся працы штодзённай, бяднячай,
І ўнукам нічога амаль не змаглі перадаць.
І я ці змагу на калені ў царкве апусціцца
Так проста і шчыра, ці маўзеру ў вока зірнуць
І, нат не збялеўшы, чужынцу шпурнуць завушніцы
І шлюбны пярсцёнак — а годнасці — не забяруць.
Прабачце, паненка у строгім шляхецкім убранні.
Я ведаю — вы не такой уяўлялі мяне.
Ды нейкую сувязь пакінула неба між намі,
Таму і вісіць ваш партрэт у мяне на сцяне,
Таму і складаюцца гэткія дзіўныя вершы,
Таму непамысна мне ў тлумных сучасных сяброў,
І дом мой заўсёды — як ціхая кутняя вежа,
І мову — адну выбіраю між роднасных моў.

Балада
пра Міхала Падабедава

Струны весела спявалі:
«Воля, шчасце, доўгі век!»
Волю выкупіць за талент
Спадзяваўся чалавек.

«Маладосць! — спявалі струны.—
Час, калі мы — каралі!»
Ды музыку ў горад тлумны
Разам з песняй прадалі.

Ці ў нявольнікі, ці ў госці —
Ды чужая старана!
І натхнёнай маладосці
Звонка лопнула струна.

Што ж далей? Няўжо за славу
Волі вольнай не здабыць?
Сёння пан гарлае: «Брава!»
Заўтра — пра цябе забыў...

У тэатры добра плацяць,
І музыка там — прывык.
А струна былога шчасця
Абарвалася, бы крык.

Немату душы агучыць
Толькі часу вольны рух:
Дзве прыгожанькія ўнучкі
Скораць модны Пецярбург,

Сын калісь разбагацее.
Ты ж — нажыў грахі свае,
І струна жывой надзеі,
Як праменьчык, растае.

Што далей? Хвароба, шаты
Шклоўскіх ліп, гады журбы.
Сын — і вольны, і багаты.
Ты — прыгонны і сляпы.

Праляцела ўсё, як вецер,
Слава высахла слязой.
І струну жыцця нарэшце
Смерць абрэзала касой...

Ноч перад двабоем

І выбраны час. І прызначана месца двабою.
Начышчана зброя, і коні трывожацца ўноч.
Царква атрымала даброты ад кожнага воя,
І сон не кранае жаночых спалоханых воч.
А нехта ўжо біўся ў заклад на віно і на коней,
Хто з рыцараў першы жыццёвую чару дап'е.
І толькі адно невядома нікому, нікому —
За што гэта рыцары жыцці крыжуюць свае.

www.kaznikat.org

Над лесам — зубчастым і цёмным, як воўчая крэпасць,
Плыве маладзік, бы турэцкая шабля, крывы.
І спее ахвярнасць у душах, і гасіцца рэўнасць,
І сон пераможна ў свае уступае правы.
Святар, што на споведзі кожнаму ўпёк за гардыню,
Малітвы свае адчытаўшы, таксама заснуў.
Усё — як належыць.
І біцца павінны мужчыны,
Бо маюць радзіму, жанчыну і гордасць — адну,
І што ім, ахопленым дзікай гульнёй самагубства,
Жыцця непаўторнасць і смерці глухая драма...
Спяць рыцары...
Сняць тую самую, пэўна, спакусу,
Якая звяла іх,
Якой не адкрыюць імя.

Скарына ў Празе

Зноў Багемская Камора
Шле свой допіс Фердынанду:
«Пан Францыск, садоўнік новы,
Завіхаецца не надта.

Трэба гнаць яго без жалю
Ці рабіць як след прымусіць.
Лайдака сюды прыслалі
Нам з якойсьці Белай Русі!»

Вулкі пражскія святлеюць
Цёплым снегам тапаліным.
Па замеценай алеі
Сам ідзе мудрэц Скарына.

Снег таполевы знікае
На сівым яго валоссі.
Там, у родным белым краі,
Вецер пух таксама носіць...

Пан садоўнік, столькі сілаў
Ты ахвяраваў асвеце,

Каб зрабіўся іх магілай
Каралеўскі сад — і вецер.

Бібліі жывое цела
Разрывае поп рукамі...
Пан садоўнік, ты пасеяў
Зерне на сцюдзёны камень...

І твае гараць усходы
У кастрах Масквы і Вільні,
Бо над Захадам і Ўсходам
Нецярпімасць — бог адзіны.

Пан садоўнік, пан Скарына
Па алеях саду крочыць.
Цёплым снегам тапаліным
Засыпае вецер вочы...

А Багемская Камора
Крэхча, грошы лічыць, піша,
Піша пра беларусіна,
Што садоўнік ён няўвішны.

А Багемская Камора
Хоча ягад размаітых...
...І ляціць на чэшскі горад
З Русі — попел белы літар.

* * *

воля выбару
застаюся ў раі
змей прыніжана адпаўзае
каменні што склалі б Вавілонскую вежу
рассыпаныя па бездакорным Сусвеце
ніводзін з іх не падымецца на Авеля
таму што не народзіцца
ні ахвяра ні забойца
толькі я
буду спатыкацца

www.kamunikat.org

аб нямыя бясформенныя глыжы
занадта паслухмяная
нават для таго
каб прыбраць іх з дарогі

Аблога

Агні гараць на вежах. Вораг блізка.
Бывай, мой дружа! Нам не адстаяць
Ні дом, дзе мы гайдаліся ў калысках,
Ні храм, дзе нас хацелі адпяваць.
І колькі ні стаяць на гэтых сценах,
Зруйнуюць іх. Дарэмна ты — герой,
Бо ціха выпаўзае здрада з ценю
У час, калі патрэбны кожны вой.
Зруйнуюцца, згараць метал і дрэва,
Камень і шкло... Што застанецца нам?
Але што — сцены? Горад стане гневам,
І сэрцам стане зруйнаваны храм.
І мы і ў гэтым свеце, і ў наступны
Ідзём з любоўю да зямлі сваёй.
Гараць агні на вежах недаступных
Душы тваёй, душы маёй жывой.

Ян Баршчэўскі

Наперадзе — вецер.
За ветрам — жытло,
Якое ніколі цябе не спазнае.
Аднойчы прыходзіць у сэрца цяпло —
І сувязь з утульнымі сценамі тае.
Ідзе не па сцежках — па спевах ідзе
Аматар, бы кветкі,
збіраць калыханкі.
І лёс у спявучай купальскай вадзе
Вянком залацістым сплывае ў світанак,
І коціцца сонцам
над пылам двароў,
І песню —

святую і вечную — будзіць...
...І мова — чужая,
пад ціскам вятроў
Кладзецца на запіс —
як глеба на грудзі.

* * *

Ой, калядачкі, вярніцеся...

З народнай песні

Надыходзяць Каляды,
і зоры вышэюць уноч.
Адыходзяць у цемру сябры выпадковых
расстанняў.
Надыходзяць Каляды.
А песень не будзе ізноў.
Мы закруцім пласцінкі —
і ў музыцы дробнай
растанем.
Надыходзяць Каляды.
Мой горад знямелы сцямнеў.
Нашы рукі халодныя цягнуцца да батарэі.
Заляцеўшы ў прыціхлы наш горад,
крутыя завеі
Мне спяваюць калядкі,
спяваюць,
спяваюць у сне.
Зноў у свеце Каляды.
І месяц працягла звініць,
Як заслонка ў пакінутай,
выстылай,
выдзьмутай печы.
Глуха — звонкай калядкай
няма нас каму пабудзіць:
«Ды ці дома сам пан гаспадар?
Святы вечар!»

www.kanunikat.org

Сад скрыжавання

У дзённіках беларускага крытыка Адама Бабарэкі ёсць словы пра тое, што Беларусь — гэта вузел дарог... Вечнае скрыжаванне... Узвышша, з якога збягаюць рэчкі і ручаіны, збіраючыся ў балота...

Як дарога ўстане, дык неба дастане... Нашы памерлыя адыходзілі па зорным Шляху Продкаў. Нашу песню насілі па сцяжынках і гасцінцах лірнікі. Нашы тэатры нараджаліся на калёсах вандроўных артыстаў. Наша сталіца вандравала з муроў у муры... Полацкі князь-чарадзей Усяслаў перакідваўся ў ваўка, каб пачуць званы Сафіі...

Калісьці Шлях заўсёды пачынаўся ад парога ўласнага дома. Цяпер між Шляхам і Домам існуе вакзал — сучасная метафара сутнасці чалавечага быцця. Дзіўны стан гасцявання між небыццём і інша-быццём. Чарговая спроба цывілізацыі ўпарадкаваць усе рухі асобы — ад руху думкі да перасоўвання ў прасторы.

Нервовы вузел мегаполіса, вузел, які ўскідвае на плечы правінцыял-мігрант...

Трывога і чаканне, туга па тым, што пакідаеш, і па тым прыўкрасным, што ёсць недзе там, далёка-далёка...

Юныя закаханыя любяць прыходзіць на вакзал, сустракаць і праводзіць цягнікі. Напэўна, у гэтыя моманты, сярод віхуры чужых расстанняў і сустрэч, абвастраецца радасць ад таго, што ты — не адзін, і боязь расстання...

На вакзале ўсё незвычайнае, любая побытавая дробязь набывае вакзальны «прысмак» — ад гарбаты ў буфеце да крэсла ў пачакальні, падобнага да сагнутай далані. Паскораны пульс гэтага месца (паняцце «вакзал» шырэй за «будынак») прымушае галасы гучаць грамчэй, рухацца нейкімі перабежкамі.

А «голас зверху», гэты металёва-няўмольны, раскацісты голас вакзальных абвестак,— хіба магчыма на яго забыцца? Напэўна, многія спрабуюць уявіць сабе жанчыну, чые галасавыя звязкі служаць інструментам для стварэння Вакзальнага Голасу. Цікава, ці знаходзіўся такі дзівак, які мог закахацца ў гэты Голас і яго нябачную носьбітку? Я разумею, што ў рэальнасці яна можа быць прывабнай і нават вытанчанай...

Але доўгае знаходжанне на вакзале змяняе чалавека. Раптам перастаеш спяшацца, нібыта апускаешся на дно віру, скідваеш

абутак, уладкоўваеш стомленыя ногі на чамадан ці пустое крэсла насупраць і з паблажлівай цікавасцю назіраеш за вакзальным жыццём. Твой шлях адкладаецца на пэўны прамежак часу, і гэты час належыць найхутчэй забіць. А хвіліны марудзяць, як вадзяныя кроплі ў кітайскім катаванні. І ты адчуваеш, што ты тут — назаўсёды, што нічога іншага не можа быць, акрамя гэтай жорсткай, выгнутай пад табою пластыкавай далані крэсла, акрым гэтых людзей з заспанымі тварамі побач, акрым вакзальнага абвесткавага Голасу, гэтага Фатуму, які прымушае кагосьці зноў ускідвацца ў вір мітусні і скіроўвацца ў шлях... Куды знікаюць гэтыя людзі? Ты ніколі іх больш не ўбачыш, значыць, яны для цябе ўсё роўна што паміраюць... Як і ты для іх. Таму вакзал — месца споведзі і злачынства.

Вакзал — квінтэсенцыя грамадства. Усё, што адбываецца ў грамадстве, набывае перабольшаныя рысы на яго вакзалах. Сюды першай прыходзіць вайна. Нават чужая — яна з'яўляецца з бежанцамі, з мурзатымі смуглявымі дзецьмі, з маўклівымі кабетамі, захутанымі ў шчыльныя хусткі па самыя вочы.

На вакзале канцэнтруюцца тыя знакі, якімі горад ці краіна спрабуюць кадыфікаваць сябе ў сусветнай сістэме кодаў. Гэтыя знакі апрацаваныя маскультурай да стану кіча — яркія паштоўкі з выявамі помнікаў мясцовай архітэктуры, узоры народных рамёстваў, выкананыя фабрычным спосабам, ды іншыя «сувеніры»... Акрым як на вакзале, іх ніхто нідзе не купляе.

Але на вакзале, у гэтай прамежкавай краіне, ёсць сваё пастаяннае насельніцтва. Гэтак жа, як ёсць жывыя арганізмы ў гейзерах — дзіўныя рыбкі, інфузорыі, водарасці, што звыкліся з павышанай тэмпературай й вечным віраваннем. Але гэтак жа, як насельніцтва гейзера вымушанае з усяе моцы чапляцца за цвёрдую паверхню, каб не сысці з гарачай плынню, насельніцтва вакзала туляецца па неасветленых кутах і прывакзальных скверыках, змешваецца з вакзальным натоўпам, і кожны заўсёды гатовы патлумачыць, куды едзе і якога цягніка чакае, хаця зазвычай ехаць яму няма куды. Гэта паразіты вакзала, якія харчуюцца яго адкідамі.

Асобная катэгорыя — тыя, хто працуе на вакзале. Гэта, напэўна, гэтак жа, як працаваць у загсе. Паміранне свята і выключнасці ў бясконцым паўтарэнні. Нельга з году ў год, з дня ў дзень далучацца да радасці чужога вяселля, і немагчыма дзесяткі разоў на дзень хвалявацца ад прыбыцця й адыходу цягнікоў, тым больш, гэта тыя самыя цягнікі і тыя ж самыя

брыгады машыністаў. Пракляты прагрэс развянчаў рамантыку шляху, разбіўшы яго на элементы. Вы заўважалі, што ў цеплавоза — дзве кабіны, адна спераду, другая ззаду. Як у дажджавога чарвяка, які, перасечаны напалам, адрошчвае адной палове — галаву, другой — хвост. Цеплавоз ніколі не разварочваецца. Для яго няма панятку — наперад ці назад, вяртацца ці ад'язджаць. Ён ведае толькі адрэзак паміж двума вакзаламі.

На вакзале асаблівае значэнне набывае час, і час на вакзале — асаблівы. Ён спатыкаецца праз няроўныя прамежкі аб нацягнуты дрот неабходнай падзеі, ён загнаны ў жорсткія сеткі графікаў і раскладаў. Няма прыроднага падзелу на раніцу, дзень, надвячорак ды іншыя, няпэўныя і сузіральныя інстанцыі... Няма прыблізнасці, няспешнай акругленасці лічбаў — толькі бязлітасная дакладнасць: стаянка цягніка тры хвіліны... Адпраўленне ў шаснаццаць гадзін пяцьдзесят чатыры хвіліны... Вакзальны Голас прэпарыруе час на дэталі, з якіх складаецца сустаўчатае цела раскладу...

Горад без вакзала немагчымы. Вёска, якая мае эмбрыён вакзала ў выглядзе прыпынку прыгараднага аўтобуса ці станцыі электрычкі, носіць у сабе вірус урбанізацыі, які выбаўляе з вёскі дзеяздольную моладзь.

Дарэчы, назва «вакзал», як падае энцыклапедыя, паходзіць з семнаццатага стагоддзя ад назвы забаўляльнай установы каля Лондана... Назва, як карнавальная лічына, прыкрыла металёвы твар вакзала-кібарга Новага часу... Гэтак жа, як рамантычны флёр ахутвае выпраўленне ў Шлях... Хаця, паводле Фрэйда, сімвалам ад'езду ў цягніку наша падсвядомасць зашыфроўвае паміранне.

У беларускіх казках дарогу можна звярнуць у клубок... Калі едзеш у гарах Чарнагорыі, гэта метафара набывае моц — шлях да манастыра, які хаваецца на адхоне, як арлінае гняздо, раскручваецца, бы нітка...

Калісьці мой прадзед Максім, сялянскі нашчадак лапцюжнай шляхты, ездзіў на заробкі ў Канаду... Вярнуўся — нават не меўшы чым сплаціць пазыкі. Пазычыўшая суседка пайшла ў старчыхі... Дарога не была да нашага роду літасцівай.

Пасля мая бабуля з малой дачкой — маёй маці — прайшла пешкі з блакаднага Ленінграда на Беларусь... Каб патрапіць у вогненнае кола карнікаў і цудам уберагчыся ад таго агню.

У нашых продкаў убачыць у сне дарогу азначала хуткую смерць.

Але скрыжаванне дарог — гэта наша жыццё.

Дзень нараджэння дарогі

У дзень нараджэння дарогі трава пад нагой памірае
І гасне кароўка божая пад колам, нібы сляза.
І нават Пан Бог гаворыць: «Хай сёння сам выбірае
Мой раб напрамак да смерці, што воляй сваёй назваў».
У дзень нараджэння дарогі дрыжаць нябачныя зоры:
Якой давядзецца згаснуць, якую возьмуць з сабой
Заместа лампады людзі, што мовай звяроў гавораць,
Што мовай дажджоў гавораць і зброі мовай нямой.
У дзень нараджэння дарогі дзівяцца лёзныя людзі,
Адкуль раз-пораз злятае пад ногі крылаты цень?
А гэта крыжоў прадвесце, што ўздоўж дарогі збудуюць,
І душы раскрыжаваных, ненароджаных шчэ людзей.
У дзень нараджэння дарогі ніхто прадказаць не можа
Дабра і зла суадносіны, што ў час народзіць яна.
А людзі стамлёна тупаюць, бяздомныя ў доме Божым,
І топчуць траву высокую, і лёс вырашаюць наш.

Валянцін Таўлай

На маёй дарозе — толькі снег,
Над маёй дарогай — толькі Бог.
Пакідаю свой самотны след.
Кожны крок — нібы цераз парог.
А вакол — краіна ціха спіць,
Ціха замятае след зіма.
І на прыдарожныя слупы
Нават ліхтароў у нас няма.
Цёмна — толькі ветаха святло
Беднае, як бедны гэты край.
І сляды пагоні замяло
На дарозе ў пекла — альбо ў рай.

Забыць Венецыю

Забыць Венецыю.
А заадно — і Рым.
І Дрэздэн, і Верону, і Варшаву.
Ёсць толькі неба, шэрае, як дым,
Над горадам, з якога не з'язджаюць.
Хто выдумаў —
не акуеш душы?
І на яе ланцуг знайсці не цяжка.
І тут таксама можна добра жыць
Між комінам, і сметнікам, і пляшкай.
Вось толькі — пра Венецыю...
Пра сон,
Пра мора, смерць ад пацалунку мора,
Пра вітражы гатычныя акон,
Каменных львоў
і брукаваны дворык —
Забыць... Забыцца...
Што Гекуба — нам?
Што мы — Гекубе?
Гамлеты без трона.
Квадратныя вітрыны нашых крам
Цямней і таямнічай водаў Роны.
Нібы гандола, месяц праплыве,
Мой човен залаты, маё чаканне.
І ліст асенні на сухой траве
Зблісне тужліва
маскай карнавальнай...
Забыць Венецыю.

Шляхціц Завальня

Як лёс, шалее завіруха —
Аж слёзы выспелі ў вачах.
Вандроўнік, бачыш?
Да прытулку
Табе агеньчык меціць шлях.
Не, нездарма міргала свечка!
Пашана хаце — добры госць!

www.kaunikat.org

Заходзь, вандроўны чалавеча,
І ў бессмяротнасць уваходзь!
На Белай Русі — век завеі.
Зацішка нам не прычакаць.
Галота казкай сэрца грэе.
Дазвольце казку распачаць.
Эх, браце!
Часу снег няўмольны
Засыпле ўсё — і тут, і там.
На Белай Русі — белым полем
Застацца вам, застацца нам.
І тое, што цяпер гаворыш,
Чужою мовай замяце...
А ты запісвай — пра паморак,
Пра лесуна і пра чарцей...
Нас тут сагнала завіруха,
І ў нас ёсць келіх — і агонь,
І свечка на акне варушыць
Сваю маленькую далонь,
І новы госць ужо ля брамы,
Прыйшоў на ласку і цяпло...
...І Беларусь плыве над намі —
Завеі белае крыло.

Апанас Філіповіч

прачынаецца травень нібыта бяскрылы анёл
пазірае ўначы белай квеценню ціхіх каштанаў
хутка сэрца трымціць, быццам спыніцца хутка яно
у пагоні за тым, што здалося навечна прыдбаным.
на скрыжалях маіх высякаюцца толькі крыжы,
на далонях маіх засталіся адны скрыжаванні
я жыву між агнёў толькі каты вакол і віжы
атлусцелыя суддзі мой боль — гэта іх апраўданні
падымаецца травень зялёнаю птушкаю ўверх
я на крылах яго адлятаю ад гэтай Гаморы
быць сабою — пакута і грэх я бяру гэты грэх
і ад свечак каштанаў ляжыць як нябожчык мой горад

* * *

Праходжу праз калючыя кусты,
Нібы няма дарогі недзе побач.
Я ўсё згубіла... Куфар мой пусты.
Ёсць толькі боль і горыч, горыч, горыч...
Ды хто сказаў, што трэба лёгка жыць,
Хто сцвердзіў — мы народжаны для шчасця?
Няма мне нават сцежкі... Толькі пыл
Чужых дарог часамі вочы засціць.
Крывавы след мой — быццам лабірынт,
Але ж пакрочаць і за мной калісьці...
Таму шыпы зрываю, як дары,
І даланёй лязо згінаю лісця,
Каб зраніліся меней за мяне
Завабленыя пошукамі вежы...
Калі ж ніхто не пойдзе? Не — дык не...
Мая сцяжынка мне адной належыць.

Кракаўскія вершы

1

На фоне Еўропы здымаецца пані Людміла.
Касцёлы працягваюць небу цагляныя пальцы.
Цячэ брукаванка, як рэчка,— і пані бяссіла
Зусім патанула ў марэннях на прывідным пляцы.
Ёй Белая Дама паказвае міну мінання,
А дзіўны мастак падысці не рашаецца нават.
І ў небе Еўропы развеяны прывід кахання,
І ў цёмнай кавярні другім наліваецца кава.
На фоне Еўропы так добра чагосьці пазбыцца,
Напрыклад, віны за бязвінную прагу спакою.
Цячэ брукаванка пад колы маёй калясніцы,
І я адплываю на хвалях зямных лістабою.

2

Вавель, Вавель... Рэха Вавілона.
Камні вавілонскія ў траве.

Металёвы цмок глядзіць з адхону,
Неба па-над вежамі плыве.
Сутарэнні — цені павуціння.
Сцены — увасобленыя сны.
І кароль з патрэсканай карціны
Пазірае, быццам сон сцяны.
Я між гэтых сценаў прарастаю
Дзікім глогам — каб вярнуцца зноў
У касцёл, які ў сабе хавае
Каралёў, паэтаў, ваяроў.
Я жыву між ценяў — і карцінаў,
І дамоў вяртацца — сэнс малы.
Заплятае сцены павуцінне,
Быццам Боны Сфорцы позірк злы.

3

Паэт і кароль у касцёле адным пахаваны.
Іх веліч зямная зраўнялася чарай нябёснай.
І срэбныя сэрцы ў капліцы Нябёснае Панны —
Ахвяры за вершы або за жаўнерскія лёсы.
Жыве ў сутарэннях сугуччаў халоднае рэха.
А зброя звінела дарэмна, бо гукі расталі.
Па горадзе сёння блукаюць паэты, і снегам
Замецены сцежкі герояў забытае славы.
Ні вершаў, ні зброі не выбраў заснежаны горад
У вечным двубоі з нябытам; ён — рыцар каменння;
І ноч над касцёлам глыбокая, нібы пячора,
І спяць у касцёле радзімы далёкія цені.

4

Гатэль «Залатая ружа» мяне не прыме ніколі.
Пакоі яго для іншых люляюць меднае рэха.
Марэнне маё вандруе, а я застаюся ў полі,
Дзе воўк выпівае Свіслач
І снег, нібы смерць, на стрэхах.
Гатэль «Залатая ружа» купцам засцілае ложкі.
Сядзіць вандроўны паэта на ганку, нібы на пласе.
А я застаюся ў лютым, між Нёмнам, Дняпром і Сожам,
І места маё спаўзае ў вясну ільдзяною масай.

Але — па далёкіх вулках у панцыры брукаванкі
Душа мая ўсё вандруе, плыве ад вежы да вежы.
Гатэль «Залатая ружа».
Паэт на каменным ганку.
Над Вавелем Зорны Вознік.
Лёд існасці пальцы рэжа.

* * *

Усё жыццё за прывідам ісці,
За светлай кропкай у канцы тунеля,
Між іншымі, прарослымі ў жыцці,
Як дрэвы — у каменныя панелі.
Лістом сарваным, дзікім птушанём,
Што пачакаць не хоча дужых крылаў,
Ляцець — за небасхілам, за агнём,
І ўпасці на шляху сваім бяссіла.
Ані гнязда, ні каранёў тугіх...
Ты — вартая шкадобы, ты — дзівачка...
А да святла імкнецца кожны ўздых,
І цемры навакольнае не бачна.

* * *

Драздовіч хадзіў па палях тваіх цёмных, Айчына,
І падалі зоры, і Папараць-кветка палала,
І Чорная Плачка, найлепшая ў свеце жанчына,
Над ім нахілялася, ціха яго цалавала.

Хадзіў Караткевіч па цёмных палях Беларусі.
І з кожнай крыніцы ўсплывала маленькая знічка,
І заяц смяяўся, былі туманы як абрусы,
І проста па іх каралеўскі скакаў паляўнічы.

Хадзіў Ермаловіч сцяжынкамі цёмнымі краю.
І над курганамі ўставалі харугвы на золку,
І племя радзімічаў князь у ладдзі адпраўляўся
Да зыркіх Плеядаў, да самага сонцава вока.

Мы ходзім штодня па дарогах абранай краіны.
Мы ходзім, нібыта балотны агеньчык слізгае.
І падае ў нашы далоні ліст вузкі асіны,
І чорная поўня, як вока чужое, міргае.

* * *

Не згасні, мой вогнік далёкі-далёкі,
У сіняй імгле сакавіцкай начы.
Трывожна блішчыш, як слязінка на воку,
І мне свой спакой не даеш зберагчы.
Напэўна, так трэба — каб вабіла нешта
У далеч, у цемру, у холад і дождж,
Каб вечна вандроўнічаў Сын Чалавечы,
А Маці шаптала: «З дарогі не збоч...»
Не згасні, мой вогнік, жывая лампада.
Вось-вось прыадчыняцца дзверы мае
І сонную ноч Гефсіманскага саду
Магутнае сонца Нядзелі заб'е.

* * *

Чаго баяцца мне?
Агню, вады, дарогі?
Карыслівых людзей ці ўласнае душы?
На полі залатым прачнуся перад Богам,
Не помнячы, за што мне не далі дажыць.
Вось так і прыбягу на бераг свой высокі,
Жыццёвай мітусні стаптаўшы дываны.
І ўніз штурхнуць мяне
агонь, вада, дарога,
Рукамі землякоў — бяспамятных, нямых.

Непераможаныя
Інсургенцкая песня

У напрамку месяца, у напрамку пушчы
Нашы коні рушылі, паляцелі душы.

У напрамку вогнішчаў, паўдзікунскіх жыццяў,
Зор, на небе вышытых залачонай біццю.
Што мадзець ды бегаць нам ад служакаў царскіх?
Мы — аскепкі вольнасці нездабытай, наскай.
Што нам, белым русічам, у чужыне — слава?
Пушча будзе — бацька нам, маці і дзяржава.
Хай гайдае вісельня галавой пустою.
Едзем мы да Месяца ды па першастою.
Не загіне гонар наш, край ніхто не зганіць,
Покуль волі вастравы ёсць — а з імі памяць.
У напрамку Месяца, у напрамку волі
Нашы коні рушылі хутка, як ніколі.

Шлях да Эдэма

Ад Ільвіных варот засталіся адны камяні.
На разбураных вежах запальвае золак агні.
На памерлае царства ўспаўзае пустэльны пясок.
Ды чарговы вандроўнік не сцішвае стомлены крок.
Праз вароты Ільвіныя, кажуць паданні, ідзе
Запаветная сцежка ў забраны зялёны Эдэм.
Царства мёртвых схавае старанна сухія сляды.
Праз яго аніхто не дайшоў да жывое вады,
Бо ніхто не паверыў, што ў неба працягнуты шлях.
І чарговы вандроўнік з малітвай на чорных губах
Крочыць сцежкай памерлых між пашчаў каменных ільвоў,
І на прывідных вежах агні загараюцца зноў.

Шукальнікі раю

Ісус, напоўнены Духам Святым,
вярнуўся ад Іардана і паведзены быў
Духам у пустыню...

Ад сонца зрабіліся мутна-барвовымі вочы,
І ў роце сасмяглым жарства, і жарства ў валасах.
Дарога праз пустку ніколі, ніколі не збочыць,
Таму што нікуды не збочыш у гэтых пясках.

Пад гэтым бязлітасным, вечна бязвоблачным небам
Калісьці Настаўнік вялікі іспыт свой трымаў,
Святлом і любоўю спазнаўшы нябеснага хлеба,
І боскасць ягоную пустка прызнала сама,
Бо там, дзе ступаў Ён, крыніцы жывыя трапечуць,
На месцы, бясплодным калісьці, квітнее мігдал,
Там сэрца ўсяго, што шукае наш род чалавечы,
Куточак Эдэма, або таямнічы Грааль.
Пра гэта сказалі нам раны старых палімпсестаў,
Паданні вандроўных плямёнаў і прага душы.
Настаўнік пайшоў — і схавалі святарнае месца
Зайздросныя дэманы ў самай пагубнай глушы.
Але ў масянжовых бутэльках пакуль што пляскоча
Апошні глыток — і яшчэ не адмераны шлях,
І неба глядзіць нам амаль што спагадліва ў вочы,
І пальмы далёкія лена шумяць у прасцяг.
Настаўнік!
Сляды твае ў гэтым распаленым пекле
Мы знойдзем — і там непрытомна ўпадзём на траву
І неба спасцігнем ці раны загоім на целе
Ці проста малітву прашэпчам у славу Тваю.

* * *

Старасвецкія прарокі не пабачылі Месіі.
Зоры ссыпаліся ў попел на ахвярнікі дарог.
І скруцілася змяёю, што кусае хвост бяссіла,
Зло, якое спарадзілі, свята верачы ў дабро.
Не пазналі нашу мару — бо ў рыззі, не ў аксаміце.
Не пазналі — не на троне, басанож — не на кані.
Не пазналі — не маліце, аб інакшай — не маліце.
І ахвяры не паліце на згасаючым агні.
На нябёснай калясніцы наша вечнасць адлятае.
На жалезнай калясніцы высіцца зямны ўладар.
А свайго выратаваўцу зноў ніхто не распазнае
На сцяжынцы прыдарожнай, у падранай рызе мар.

Паланез Агінскага

Дом зачынены. Вазок стаіць ля брамы.
У гародчыку крывавыя вяргіні.
Дрэмле край прыўкрасных рыцараў і дамаў,
Дрэмле край халопаў, здраднікаў і злыдняў.
Па пялёстках і па страчаных марэннях,
У апошні раз — між родных краявідаў.
Любы край, тваё змарнуецца каменне,
Назапашанае, каб мяне закідаць.
Крылы складзены на дне маёй валізы.
Ці чужое неба іх напоўніць ветрам?
Клёна ліст ляціць, нібы краёчак рызы.
Ды ніхто яго не пацалуе з верай.

* * *

Сляды спараджаюць сляды — і спародзяць дарогу.
Мы рушым па ёй, адпачынак адклаўшы на потым.
Мы — цені дарогі. І мы не сустрэнем нікога.
Бо наша дарога замкнёная ў кола заўсёды.
А я прыпыняюся. Што мне лавіць? Толькі вецер.
А ён без таго прылятае ў абдоймы і плача.
Не варта спяшацца. Цікавага столькі на свеце,
Абапал дарогі, чаго мы не чуем, не бачым.
Стамлёна прысяду на ўскрайку сваёй каляіны.
Няхай праплываюць аблокі, трава вырастае.
Хай міма імчаць кавалькады, карэты, машыны...
Я вырвуся з кола — нібыта з ваўчынае зграі.

* * *

Дарогай залатой — праз восень, поле, неба.
Дарогай залатой — да храмаў залатых.
А золата душы яшчэ ачысціць трэба
Ад пылу мітусні, ад пожадаў сваіх.
Дарогай залатой — да храмаў белых-белых.
Між могілкаў старых, між небам і зямлёй.
Там грэшная душа, там стомленае цела

Спазнаюць цішыню, спазнаюць супакой.
Дарогай залатой імкнуць да храмаў людзі.
І ў ходнікі надзей сплятаюцца сляды.
І золата лістоў не памірае ў брудзе,
А сонцу аддае свой колер залаты.

Перасяленец

З абжытага месца зрываецца цяжэй і цяжэй —
Гады, што карэнні,
з зямлёй замацоўваюць роднасць.
Але забівае ўсе вокны накрыж Неабходнасць —
За родную хату усё-ткі жыццё даражэй.
Таму — абжывайся, як можаш, на месцы другім,
У садзе зарослым змайструй, як і дома, арэлі...
А можа, ты, прыхадзень, месца чужое заселіш
І будуць з-за плота паказваць табе кулакі?
...Прыходзяць паштоўкі — закрэслены адрас стары...
Ты мовіш і мовіш у кожнай размове: «Там, дома...»
...У садзе, што твой папярэднік садзіў незнаёмы,
Пагаслі, сініцамі сталі твае снегіры.

Мальдарор

Хай нікому больш і ніколі
не спатрэбяцца барэльефы,
мармуровыя рукі німфаў
і Мадоннаў сумныя вочы.
Хай ніколі ніхто не кіне
нават самай дробнай манеткі
ў чашу выцвілую фантана —
сын фіялкі і сын п'яўкі
спяць аднолькава моцна ў небе.
Разбураецца храм стагоддзя.
Вавілонскую вежу зараз
мы будуем не ўверх, а ўніз —
у пачварныя сутарэнні,
за паверхам паверх — у цемру,
па спіралі з бетонных плітаў.

Пераблытаны рай і пекла,
пераблытаны лёс і грэх.

* * *

Шлях пясчаны, пыльны, доўгі.
І царква каля дарогі,
У якой не бралі шлюбаў —
Адпявалі самагубаў.
Шлях пясчаны, звон і вецер.
Ты куды ідзеш, паэце?
Перапеў пра ўсё, што ведаў,
Быў паэтам між паэтаў.
Стаў шукаць сябе ці Бога —
І вакол цябе — нікога.
Толькі шлях пясчаны, доўгі.
І царква каля дарогі,
Толькі спісаныя сшыткі
Ды дарэмна лёс пражыты.

* * *

Па дарогах радасці зямной
Я дарэмна пазбівала ногі.
Толькі вораг добры быў са мной,
А сябры ў сяброў гулялі толькі.
Што ж, прымаю правілы гульні.
Толькі вось якая незадача —
Выпадковай ласкай падмані —
І душа, усцешаная, плача.
І дарэмна розум важыць фальш,
І да дна відаць падману прорву.
Ад самоты слепне розум наш
І на веру ўсе ўспрымае словы.
І нашто мне ведаць, Божа мой,
Хто кідае мне ў спіну каменне?
Па дарозе горычы зямной
Радасці нясу і летуценні.

Пілігрымы

Раздзьмуў у верасе жарынкі вецер.
Як зоры, ззяюць сэрцайкі шыпшын.
Ідзём, ідзём, адзіныя на свеце,
Хто вечны адпачынак заслужыў.
Нас не прыпыняць ні кілімы кветак,
Ні колкае кустоўе, ні дажджы.
Святло сляпое прасявае вецер
На шлях і прыдарожныя крыжы.
Мы — пілігрымы.
Ад святой мясціны
І да святой мясціны цягнем шлях.
Мы быць жывою ніткаю павінны,
Што вераю знітоўвае прасцяг.
Прыпынімся — расколіна ў сусвеце
Змяёй паміж людзямі прабяжыць.
І мы ідзём, пакуль спявае вецер,
Пакуль магчыма паміраць і жыць.
І што з таго, што ў Бога на далоні
Не святасць наша — пачуццё віны.
Бо мы ідзём, і дождж ліе халодны
Праз нашы недагледжаныя сны.

Эмігрант

Ты не пяройдзеш гэтага маста,
Таму што выбраць свой не ў змозе бераг.
І там, і тут — халодная слата,
І там, і тут — ніхто табе не верыць.
І, можа быць, зусім не варта жыць,
Калі няма прытулку і спатолі.
А пад мастом вада бяжыць, бяжыць
І цягне ў вір, дзе больш не будзе болю.
Вада бяжыць — і хмары ўсё плывуць,
І хісткія парэнчы не трымаюць.
Над безданню — мой дом, дзе я жыву,
І месца ў свеце іншага не маю.
Між берагамі — быццам на крыжы —
Расцягнуты, навек прымацаваны.

www.kamunikat.org

Каб там і тут — з надзеяю жылі:
Два берагі ў душы маёй з'яднаны.

* * *

З нікуды — у нікуды мой цягнік,
Ляцяць травой парослыя адхоны.
Манеты лічыць бледны праваднік,
Яго калісьці клікалі Харонам.
Важдацца з чоўнам — старасвецкі міф.
Куды прасцей — цягнік, вагоны, рэйкі.
Жыццё па-за жалезнымі дзвярмі
Да хваль марскіх свае зганяе рэкі.
Забудуся на цёмныя віры
У бездані, у вогненным бязмежжы.
І коціцца каменнямі з гары
Мной збудаваная калісьці вежа.

26 красавіка 1986 года

Беларусь! Душы маёй калыска!
Возера лілейнага святла!
Да сваёй загубы гэтак блізка
Ты яшчэ ніколі не была.
І адвары доктара Скарыны
Праліліся ў чэзлую траву.
Па нябёснай прывіднай сцяжыне
Пакідае доктар Беларусь.
І за ім ідзе да зор Завальня,
Свечку захінае даланёй.
Даганяе човен старадаўні,
Што з Палесся ўзяты вышынёй.
«Нешта Продкаў Шлях аж слепіць вока»,—
Здзівіцца забыты дзецьмі дзед.
І душа старэчая з палёгкай
Адляціць за позіркам услед.
А сцяжына белая танчэе,
І па ёй — як па лязе ў жыцці —
Ўсмешлівы апостал Караткевіч

З вогненнай вадой нясе пацір.
Шлях растаў — і велічныя цені
Па-за нашым позіркам плывуць.
Дождж пайшоў.
Ці смерць, ці блаславенне
Кроплі срэбнавокія нясуць?

Крывічанка

Спяшайся, любы!
Зарыва ў акне —
Сцякаюць зоры! —
плавяцца нябёсы.
І праступаюць
плямы на сцяне,
І ў Маці на іконе
свецяць слёзы.
Спяшайся, любы!
Вершнікі плывуць —
О цуд! —
над вострымі зубамі лесу,
І месяц долу
хіліць галаву.
Я чую
нашых слаўных продкаў
песню.
Спяшайся, любы!
На крывавы сон,
На рэчаіснасць,
горшую за блёкат,
Бо разгайдаўся
нашых продкаў звон,
І гук яго
плыве-ляціць высока.
Спяшайся, любы!
Ля варот —
бяда,
Бяда — і доўг.
І доўг — і смерць, магчыма.
Спяшайся!

www.kanurikat.org

У цябе, каханы, там —
Я і Радзіма
будзем за плячыма.

* * *

Ты гасіш свечку на акне,
І ноч заходзіць у кватэру.
Але не чорнаю — а шэрай,
Нібы пясок і бруд на дне.

Ні таямніцы, ні таго
Сляпога жаху сутарэння,
Што смерць даруе ці натхненне.
Свет пазалочаных багоў...

Няма самоты ў цішыні,
У белі снегу — нават ноччу.
І падарожнік крочыць, крочыць
Туды, дзе цьмяныя агні
Маленькіх хат, бясплённай працы.
І свечцы больш не загарацца.

* * *

Сняжынка апошняга верша далонь апякла.
Руку не падняць —
бо руцэ не хапае крыла.
Бясснежнай зімою адны толькі казкі наўме.
Сняжынка растала,
і скончыўся час для мяне.
Гадзіннік працэджвае светла-ружовы пясок.
Крыла не прыўзняць —
бо яму не хапае аблок.
А неба... Ці ёсць яно, неба, за хмарай чужой?
Сняжынка растала.
Затое настаў супакой.

www.kamunikat.org

На скрыжаванні лёсаў і падзеяў

Вянок санетаў

1

На скрыжаванні лёсаў і падзеяў,
Пакуль не дасягнуў нічога сам,
Так хочацца ўвайсці ў багаты храм.
Не талент правядзе — дык дабрадзеі.
Але радкі ад мітусні радзеюць,
Са шчырасцю знікае з іх жыццё.
Пісьменнік — голас Божы, не акцёр.
Прарок, які самотай сушыць цела.
І вось ты — лішні чалавек на свяце.
Вялікі горад — і высока падаць.
І тых, хто адвярнуўся,— не кляні.
Тут, дзе ніжэюць і вышэюць лёсы,
Дзе толькі сорам і п'яныя слёзы,—
Не збудаваць нам Храма цішыні.

2

Не збудаваць нам Храма цішыні
Тут, дзе на стрэл адказваюць плакатам,
Дзе вязню нават не патрэбны краты,
Дзе вершалін не бачаць карані.
Таму — пагардай слабасць захіні.
Ёсць таямніца здрады — жах салодкі,
Прад тым, хто на распяццях і паштоўках
У продажы ізноў — дзе ні зірні.
Любыя ўчынкі і падзеі — цені,
Якім так лёгка надаваць адценні.
І будзе верным той, хто ўсім маніў.
І плёскаецца мора з назвай «жыцці».
І высыхаюць кроплі на граніце.
Як хвалі, з шумам адплываюць дні.

3

Як хвалі, з шумам адплываюць дні.
Так лёгка плыннай іх паддацца волі.
І цёплы край, дзе не бываў ніколі,
Пяском прысыпле непатрэбны німб.
І дабрабытам цешыцца адным
Тваёй душы не хопіць, каб свяціцца.
Еўропы чыстай яркія сталіцы
Не нагадаюць нашы камяні.
Ці ўратаваў каго капрызны шлях
Па сонечных палянах і садах,
Якія Бог спрадвек няроўна дзеле?
Бурштын не капне кропелькай смалы.
Лісты — не стрэчы, гмах — не купалы.
Сустрэцца ў моры — танная надзея.

4

Сустрэцца ў моры — танная надзея.
Лёс не судзіў дарогі нам адной.
На новым скрыжаванні прада мной
Храм іншы ў неба купалам свяцее.
Перамагла, як і заўжды, ідэя,
Абстракцыя — над грэшным пачуццём.
І сонца заплыло ў нябёсны дом,
Ды нават сонца рознае нас грэе.
Дзве мовы не зліваюцца ў адну.
Хто так сказаў — той збудаваў сцяну,
Але было ў тым ісціны імгненне.
Я бласлаўляю ўсё, што не было.
І на цябе гляджу, нібы праз шкло,—
У гэтым існаванні мы — як цені.

5

У гэтым існаванні мы — як цені.
Нашто ж яшчэ імкнуцца да аблок?
Дарогі — гэта вецер ды пясок,
Вандроўнік — гэта боль ды летуценні.
Ад грэшнай сцэны да нябёснай сцэны

Рассцелены кілім бясплотных мар.

Няма тут роляў катаў і ахвяр,
Але й няма раптоўнага натхнення.
І хто слабы прад бедамі зямнымі,
Не трэба й небу з крыўдамі сваімі.
І, як ні прагні золкай вышыні,
Мы — цені тут. Ды ценяў не бывае,
Калі іх нехта ўніз не адкідае
Пры нейкім недаступным нам агні.

6

Пры нейкім недаступным нам агні
Згараюць і знікаюць нашы лёсы.
Паэзія — душа, а людзі — проза,
І шчасце не прыходзіць дзень пры дні.
Твой раб былы на вараным кані
Праехаў міма ў княжацкіх уборах
І на цябе зірнуў, як вечны вораг,—
І сябар твой схіліўся перад ім.
Калі дарога, на якой паўстала,
Ты прымеш за прыступку п'едэстала
І назаўсёды спынішся — зірні:
Ты — толькі цень на сонечнай дарозе.
Паэзія ў жыцці, у смерці — проза.
Быць часткай ночы — Божа, барані.

7

Быць часткай ночы — Божа, барані.
Але ў яе таксама нешта вабіць.
Ці яблык Евы, ці былая памяць,
Ці кінутыя ў спіну камяні.
Але, як дню святому ні мані —
Яго таксама ёсць табе часцінка,
У прысаку — апошняя жарынка,
На мерзлым полі — зерне дабрыні.
А можа, ноч — твой рамантычны флёр,
І ты — не вецер пекла, а актор,
І плёткі заплятаюцца дарэмна.

Хай будзе на шляху тваім святло!
Ноч ахіне заваблівым крылом,
Світанне ж паглыне нас, як марэнне.

8

Світанне ж паглыне нас, як марэнне.
А слёзы — застаюцца на зямлі.
Разбітыя да трэсак караблі
Не помняць пра зямное прыцягненне.
Нам гонар не дае згінаць калені
Нат перад Богам — толькі ў Судны час.
Але ўсё роўна там прымаюць нас,
Дзе больш няма ні добрых і ні дрэнных.
Прад зоркаю Палын ахвярнік прагны
Штодня прымае шчодры дар Арахны,
І праступае на каменнях соль.
Ты ўжо шчаслівы. Мы яшчэ зацята
Шукаем то выйсця, то вінаватых,
Растаць у сонцы — што за светлы боль!

9

Растаць у сонцы — што за светлы боль!
Ды сонца можа быць чужым і здрадным.
Нікому вечны вучань не прыдатны.
Ягоны шлях — Багрыма жырандоль.
Быць вучнем — найспакусная з няволь,
Але хто не ўцякаў — не бачыў крылаў.
А кветкі ля класічнае магілы
У зносінах з натхненнем — не пароль.
Нашто ж шпурляць каменні ўслед ідучым?
Зрабіўся сонцам — цень, забыты вучань.
Што зробіш? Неба вольнае — не столь.
І дастанецца кожнаму дарога.
Магчыма, нешта ў гэтым не ад Бога,
Ды кожны на шляхах сваіх — кароль.

10

Ды кожны на шляхах сваіх — кароль.
Няхай парваны плашч не грэе плечы,
Ёсць небасхіл і гонар чалавечы,
Няма — Радзімы. Толькі дождж і золь.
Ды голас ветру, нізкі, як бемоль,
І цяжар непатрэбных сэрцу ведаў.

І плён твой будзе — як халодны ветах,
А мне — ісці ў світанак мой дазволь.
Чужым народам непатрэбны ты,
Свайго — не п'еш крынічнае вады
І ўжо яму таксама не належыш.
Не зразумеў нічога ты, бядак.
Ды Бог судзіў. А значыць — будзе так,
Не вінавачу ні святых, ні грэшных.

11

Не вінавачу ні святых, ні грэшных.
Няма тут суддзяў — і суда няма,
І ты свой шлях размеціла сама
І ні ад кога болей не залежыш.
Як хочацца прыйсці да славы першай,
Няхай ахвяраваўшы ўсё і ўсіх,
Але самота — пыл дарог тваіх,
І свет без Бога — у замкнёных межах.
Мы верылі, што свет — у нашых душах,
І пераможа здольны, а не дужы,
І ў кожнай Папялушкі будзе баль.
Цяпер жыццё нас досыць павучыла.
Не крыўджуся на стомленыя крылы —
Я толькі помню, толькі пешчу жаль.

12

Я толькі помню, толькі пешчу жаль
І, можа, гэтым неяк выкупляю
Стварэнне адасобленага раю,

Празрыстага, біткога, як крышталь.
Вучылі вы нацягнуты паркаль
У злепак узрушэння, свята фарбаў
Пераўтвараць — як у царэўну — жабу.
І назаўжды захоўваць творцы пал.
Пасля вучылі многія і многа.
Хаця здабыткі ўсе мае — ад Бога,
Але карцін дзіцячых пастараль
Мне грэе сэрца чыстым успамінам.
І я ў сабе замкнуцца не павінна,
І прышласць прада мною — як Грааль.

13

І прышласць прада мною — як Грааль,
І ў тым, што адышло, святла хапала.
На першую прыступку п'едэстала
Ледзь прыўзняла выпадку магістраль,
А позіркі былі ўжо быццам сталь
Ад гонару, выключнасці і веры.
Якім жа звыклы свет падаўся шэрым!
Ды шакаладным стаўся наш медаль.
Але спазналі першы водбліск зор.
І дзіўны старажытны мовы ўзор,
І вольнае паэзіі бязмежжа.
Няхай было ўсё гэта толькі сном —
Ды быў, як рай, стары драўляны дом,
І неба — быццам камні Белавежы.

14

І неба — быццам камні Белавежы.
І зоры — быццам свечкі ў цішыні
Яе байніцаў. Подых свой стаі —
Пачуеш, як далёкі скача вершнік.
Нас аб'яднала неба, а не вершы.
Зайздроснікам яго не зачарніць.
Калі душа аднолькава баліць —
Важней, чым разам радасна смяешся.
Навуку жыць і прабачаць спрадвек
З пакутамі прыўлашчваў чалавек.

А мы — адразу шчасця захацелі.
Ды — як бы цяжка ні было далей,
Мы — удваіх, і можна ацалець
На скрыжаваннях лёсаў і падзеяў.

15

На скрыжаванні лёсаў і падзеяў
Не збудаваць нам Храму цішыні.
Як хвалі, з шумам адплываюць дні,
Сустрэцца ў моры — танная надзея.
У гэтым існаванні мы — як цені
Пры нейкім недаступным нам агні.

Быць часткай ночы — Божа, барані.
Світанне ж паглыне нас, як марэнне.
Растаць у сонцы — што за светлы боль!
Ды кожны на шляхах сваіх кароль,
Не вінавачу ні святых, ні грэшных.
Я толькі помню, толькі пешчу жаль,
І прышласць прада мною — як Грааль.
І неба — быццам камні Белавежы.

1988

Сад храма

Першае, што зрабілі Адам і Ева, выгнаныя з Эдэма,— склалі з камянёў ахвярнік Богу.

Апошняе, што зробіць чалавек у гэтым свеце,— зруйнуе або апаганіць Храм.

Пасля чаго панясуцца па свеце чатыры вершнікі, і вада ператворыцца ў кроў, і сонца пацямнее, як валасяніца, неба звернецца звіткам, і зоркі пападаюць на зямлю, быццам недаспелыя смоквы са смакоўніцы...

Храмасфера — адзін са слаёў сонечнай атмасферы, які можна бачыць у час зацьмення ў выглядзе яркага кольца вакол Сонца.

У Храм чалавек ідзе найчасцей у часы цемры, разгледзеўшы там святло.

У беларускага Храма заўсёды намагаліся забраць імя, гэтак жа, як і ў беларусаў. Будынак традыцыйнага беларускага Храма — «абарончага тыпу». Царква-крэпасць — гэта пра нас.

Храмам ёсць і чалавек, бо ў ім жыве Бог... Але ж у чалавеку жыве і Звер. Храм і звярынец — спалучэнне, якое не абяцае спакойнага жыцця.

Але ў чалавеку закладзеная «прага Бога». Наблізіцца да Яго, зразумець, што Ён ад цябе хоча, і выканаць гэта... Самае пэўнае — збудаваць Храм.

Па дарозе на Івянец мне паказалі драўляную цэркаўку, зробленую адным умельцам-вернікам. Падчас працы ўпаў з рыштаванняў, паламаўся... І ўсё роўна, яшчэ ў гіпсе, працягнуў будоўлю.

А брат Майсея Аарон выплавіў стод з завушніц, ахвяраваных кабетамі, якія знудзіліся па выяве бажаства. Ці не таму слова «кумір» найперш звязанае з вобразам кабеты, загіпнатызаванай экранам тэлевізара, старонкай бульварнага рамана або бляскам чарговага залатога стода?

У царкве на берлінскай Курфюрстэндам ля ўвахода — талерка з вялізнымі чырвонымі яблыкамі. Хто ахвяруе на Храм пару марак, ва ўзнагароду можа ўзяць яблык. І, напэўна, спажываючы яго, адчуць перамогу над тым, грахоўным, плодам і наблізіцца да страчанага Эдэма.

Блажэнны Аўгусцін апісваў Град Божы — адзіны вялізны Храм, які існуе тут і цяпер і вечна, супрацьпастаўлены Граду зямному. Град Божы — праведнікі. Лозунг інквізіцыі «Прымусь іх увайсці» меў на ўвазе грэшнікаў.

Калі французская прынцэса Марыя Генрыета стала іспанскай каралевай, яе чакаў вясельны падарунак — урачыстае аўтадафэ. Каралева не мела права нават страціць прытомнасць ад смуроднага дыму, якім грэшнікі прымусова ўваходзілі ў Град Божы.

Святы Францішак Асізскі маліўся ў вялікім Храме прыроды, пад купалам неба.

Але з неба можа паліцца халодны дождж, і не станеш на брудную траву каленьмі, калі ты ў залочанай рызе...

Аляксандр Мень пісаў, што Храм складаецца са слова, вобраза і таемства.

Калі няма апошняга з пералічаных складнікаў — не можа быць Храма.

Канец васьмідзесятых. Еду па Маскве на тралейбусе. Злева, у нейкай нізіне,— клубы белага дыму, быццам адкрылася пекла.

Месцічы тлумачаць — басейн на месцы Храма Хрыста Выратаваўцы.

Аднакурсніца па Літінстытуце хваліцца, што плавае ў тым басейне штотыдзень і нармальна... Толькі вада гнілая.

Мне шаснаццаць. Спякотны чэрвень. У нас практыка па малюнку. Мы размясціліся на зялёным пагорку ля мінскага кафедральнага сабора, тады яшчэ Марыінскай царквы, і робім акварэльныя накіды. Вада ў слоіках хутка мутнее. Выкладчык раіць нам ісці па ваду... у царкву. Самыя смелыя ідуць і хутка вяртаюцца з поўнымі слоікамі і вясёлым каментарам убачанага. Нарэшце і мы з сяброўкай, узяўшыся за рукі, нясмела заходзім у прахалоду і таямніцу. Набіраем у прытворы вады са звычайнага крана, але сыходзіць не спяшаемся — цікава. Прыхаджан мала — чалавек дзесяць разам са святарамі. Ціснемся да мармуровай калоны са сваімі слоікамі, у дэкальтаваных сарафанах, так што бачна адсутнасць крыжыкаў. Чарнявая цётка, якая басам спявае малітву, зіркае на нас усё пільней і замест малітвы пачынае апантана паўтараць: «Господзе, пазбаў ад спакусы!» Цётка пазірае на нас так страшна, яна хістаецца, голас яе грыміць усё гучней, і мы выбягаем з Храма, як мянялы ад Хрыстовага бізуна.

Малюнкі, выкананыя на святой вадзе, асядаюць дзесьці ў лабаранцкай, каб пасля паслужыць палітрамі для наступных навучэнцаў.

Ад таго наведвання Храма ў памяці на ўсё жыццё застаецца пачуты малітваспеў, які дасюль паўтараю ў цяжкія хвілі: «Господи, помилуй, Господи, спаси, Господи, мне больно, крест мой поднеси...»

Храм павінен быць вышэй за іншыя будынкі. Ацалелыя ў савецкім Мінску Храмы ўмуроўвалі ў бетонныя шэрагі квадратных дамоў, ссякалі крыжы і купалы, і абавязкова каб побач было вышэйшае, ідэалагічна праверанае збудаванне.

У Расіі калісьці існаваў закон «празораў» — каля Храма трэба было пакідаць незабудаваныя месцы, каб яго можна было бачыць здалёк і з усіх бакоў.

А першыя хрысціянскія Храмы ладзіліся ў катакомбах, глыбока пад зямлёй, там жа, дзе хавалі памерлых святароў і прыхаджан. Але, можа быць, адтуль, ад цёмных сырых пячораў, было бліжэй да неба, чым ад гіганцкіх раззалочаных купалоў, збудаваных на сродкі высокапастаўленых злодзеяў...

Храм нагадвае пра храмоўніка, «рыцара храма» з рамана Вальтэра Скота. Храмоўнік закахаўся ў прыгажуню габрэйку і памёр ад разрыву сэрца.

Практыка па малюнку ў Вільні. Вечарамі мы блукалі па вузкіх брукаваных вулках, заходзілі ў Храмы... Праваслаўныя цэрквы былі ў бальшыні занядбаныя, з пабітымі вокнамі, размаляваныя здзеклівымі надпісамі. У адным з такіх Храмаў я ўпершыню паставіла свечку. І ўпершыню перахрысцілася, усхвалявана разумеючы, што стала на бок пакрыўджаных і зняважаных.

Да Храма трэба ісці. І нават не заўсёды па зямлі. Храмы Новай Гвінеі — плеценыя з прутоў — будуюцца проста ў моры. Шлях да іх — па вадзе. Зазвычай усе дарогі краіны сыходзіліся да яе галоўнага Храма — і ў Рымскай імперыі, і ў дзяржаве інкаў. Нашы дарогі сыходзяцца да якогась адміністратыўнага будынка. Ён найчасцей квадратны і шэры, як ахвярны камень.

У Сярэднявеччы быў закон, паводле якога Храмы належала ўзводзіць на месцы старых, зруйнаваных.

З вакна тралейбуса добра відаць на беразе Свіслачы, ля таго месца, дзе ў яе ўцякае паланянка Няміга, белы камень на месцы старажытнага Храма. Дарожкі, засыпаныя бітай цэглай, пазначаюць контур сцен. Падмурак — глыбока ў зямлі...

Гэта — наш Храм і сэрца горада, але ніхто не звяртае на яго ўвагі. А ён стаіць, толькі нябачны,— бо Храм зруйнаваць нельга. Можна зруйнаваць яго цела з зямнога праху, а духоўная сутнасць Храма — бессмяротная.

А побач, у падземным пераходзе метро, безліч кветак ахвярам — загінуўшым на Тройцу маладзёнам. Ці зайшлі іх душы ў нябачны нам Храм?

Балада пра драўлянага Хрыста

На Беларусі Бог жыве...
У. Караткевіч

На той зямлі, дзе столькі крыніц,
І ў кожнай — знічка на дне,
Дзе ў кожным камні паданне ёсць,
Як маці ў дзіцячым сне,
Дзе кожны ўзгорак — былы курган,
А кожны з прадзедаў — вой,

Жыве стары калгасны пастух
У хатцы сваёй старой.
Таму, напэўна, што ўвесь свой век
Глядзеў ён на Божы край,
З драўніны бурштынавай дзед зрабіў
Не абы-каго — Хрыста.
Звычанай сякеркай, па вечарох
Шчапаў сасновую плоць.
Нязграбны, бедны, шурпаты быў,
Але — сапраўдны Гасподзь.
І майстар вочы намаляваў блакітнымі,
Быццам лён,
І лёг на жытнія валасы
З калючага дроту цёрн.
Падняўся крыж пасярод сяла,
Над хатамі паміж дрэў.
І на здзіўлёных сялян да іх падобны
Хрыстос глядзеў.
Прыйшоў з бліжэйшай царквы святар,
Казаў пра кашчунства штось.
Пасля спыніўся ля Божых ног,
Што цвік прабіваў наскрозь,
Крануў чырвоную фарбу — і
Пераражагнаўся, пайшоў
І трызніў, што ён — Няверны Фама
І з пальцаў не сцерці кроў.
Казалі майстру: «Прымі свой крыж,
Страхоцце адно глядзець...»
Але — прывыклі... Бо да ўсяго
Прывучыш нашых людзей.
«О, фольк! Аўтэнтык!» — замежны пан
Хрыста фатаграфаваў.
Хацеў за даляры купіць, але
І слухаць майстар не стаў.
І ліўся айчынны халодны дождж
На сумны драўляны твар,
І з шыльды змыўся надпіс, што тут
Прыбіты юдэйскі цар.
Як воран з могілак — ноч ляціць,
А бусел нясе зару.
І пазірае Хрыстос з крыжа

На бедную Беларусь,
Такі ж гаротны, як і яна,
І плоць ад плоці яе,
У вёсцы паміж крыніц і азёр,
Паміж курганоў і дрэў.
Драўляны, каструбаваты — ён
Наш Бог, наш край і наш лёс.
А значыць — будзе жыць Беларусь,
Таму што ў прызначаную пару
Сыдзе з крыжа Хрыстос.

* * *

Ён ішоў па вадзе.
А нам здавалася — крануўся Сусвет.
Ён ішоў па вадзе, і нам не верылася ў плыткасць вады.
На хвалях цёмных пагасаў Яго след,
Нібыта човен патанаў залаты.
А дзе зліваецца з вадой небасхіл,
Таненькім паскам грэшны дзень дагараў.
Ахвяраў медныя чакалі багі,
Мы справядлівага чакалі цара.
А Ён ішоў па вадзе, і зрэбным быў Яго жабрацкі хітон.
І пагасалі сляды, і расцякаўся час па цёмнай вадзе.
І аддаляўся, і глядзеў сумна Ён,
І плакаў, што ніхто за Ім не ідзе.

Варава

Натоўп наталяўся чужою пакутай.
Дзяцей падымалі на плечы бацькі.
А грэшнік, канчыны пазбаўлены лютай,
Ступаў на травінкі, нібы на цвікі.
Яшчэ не ўсвядоміў раптоўную волю,
Праз тлум прабіваўся, сусвету чужы.
Але — азірнуўся, як выйшаў у поле,
І ўбачыў цяжкія ад целаў крыжы.
Паветра ліловым было ад спякоты,
І пыл залацісты стаяў над гарой.

Варава, забойца і грэшнік, ды хто ты,
Што Божаю смерцю купляеш спакой?
Вядома, ты мужна і горда трымаўся,
А той, на крыжы, не саромеўся слёз.
Ты моцны і злосны і тым спадабаўся,
Не тое што ўсёдаравальны Хрыстос.
Цяпер жа — чаму, ледзь прыпомніўшы гэта,
Ужо не ад шчасця ты плачаш, герой,
І ўбачыўшы крыж, што ляціць над сусветам,
Шкадуеш раптоўна — чаму ён не твой?

Пальмавая нядзеля

Пальмавае вецце клалася пад ногі.
Цёплы мёд паветра ап'яняў надзеяй.
І крычала славу для цара — не Бога,
І цара зямнога прагнула Юдэя.
Хто ты, з горкім ротам, што прыпаў да глебы?
Як сухое лісце — гук твае малітвы.
Што ж не паспяшаў ты да пасланца неба
З пальмавай галінкай, з песняю шчаслівай?
Хутка нашы сховы перапоўніць зерне,
Пойдуць караваны ў наш магутны горад,
І чужынцы стануць ціхія, як цені,
А палацы — быццам залатыя горы.
Ці ты апантаны? Ці, магчыма, трызніш?
Слоў такіх разумны не прысніць ніколі:
«Вы яго заб'еце, пройдзе толькі тыдзень,
Цень крыжа пагасіць фарбы нашай волі.
Шэлега не варты дым любві народнай.
Хвалі захаплення й трэскі не ўтрымаюць.
Сёння — мёд і віны, а праз тыдзень — воцат,
На пяску хвілінаў піша наша памяць».
Словы адгучалі, бы сцягнула рану.
Не было ў тым ранку месца для трывогі.
І народ спяшаўся да галоўнай брамы,
Пальмавае лісце падала пад ногі.

Выйсце з пусткі

З пусткі Ён выходзіў, нібы з саду.

І свяціўся ціха твар Яго.
Хоць хапала ў свеце вінаграду
Для людзей і для людскіх багоў,
Ён ішоў, забыўшыся пра голад,
Адзіноту, здраду і жуду
І пра свой ад слёз ахрыплы голас,
Што пытаўся: «Хто я? З чым іду?»
Першыя травінкі заблукалі
Між каменняў, зблiснула вада...
Трэснулі Майсеевы скрыжалі,
Быццам неба Страшнага суда.
Ён ідзе, і пустка за спіною —
Кокан пад крылом у матыля.
Будзем жыць, любіць жыццё, панове,
І ўзірацца ў неба спакваля.
Кіпарысы падпіраюць неба
З храмавай суровасцю калон.
Ёсць часы, калі не просіш хлеба
Не таму, што не патрэбны ён.
...Вучні, як спалоханыя дзеці,
Сыплюць незакончанасцю фраз.
А настаўнік — самы лепшы ў свеце —
Сам і ёсць нячутны ім адказ.

Грэшнік

Гасподзь са мною не гаворыць больш,
І ў келлі пуста, як у воку старца.
І ў такт малітве барабаніць дождж,
Ды словам ручаінай не зліваецца.
Якая ціша, як замоўкне Бог!
Зямное цела
уціскае ў глебу
Яе нязносны цяжар... І дарог
Цяпер няма — аглухламу — да неба...
Я голас Божы, грэшнік, успрымаў,
Нібы ліюцца вогненныя кроплі.
Здавалася — пакутую дарма,
Няздольны да прароцтваў у натоўпе.
Ну што карысці — між каменных сцен

Сціскацца пад нябачнаю маланкай,
Калі жыццё па залатой вадзе
Кіруе човен да чужых прыстанкаў.
Не затрымаць, не растлумачыць жах
Той прорвы, што наперадзе чакае...
І Бог пачуў... І цішыня ў вушах,
Жаданая, вар'яцкая, цяжкая...
Гасподзь маўчыць... Я словы гавару,
З якіх малітва скласціся павінна.
...І брат мой цягне рукі угару
І шэпча: «Чую, Божа мой адзіны...»

* * *

У час, калі крылом сваім душа
Няроўную мяжу ў пяску пракрэсліць,
І будзе позна нешта вырашаць,
І за сталом трынаццаць рыпнуць крэслаў,—
Ну што прамовіць, падзяліўшы хлеб,
Віно пусціўшы чарай кругавою?
Пра кроў, што праступае на крыле?
Ды госці хочуць згоды і спакою.
Я не хачу, я не хачу ўміраць!
Хай зацвярдзее неба сінім лёдам,
Няхай не лётаць болей, не спяваць
І не прарочыць прад сваім народам —
Але запозна...
Першы з-за стала
Падняўся і пайшоў хадой упартай.
Рассыпаная соль бялей крыла,
І чысцяць зброю рымскія салдаты.
Ах, як захочацца усё спыніць,
Вярнуць сабе дарогі і бясконцасць...
Але ад сэрца срэбраная ніць
Бясхібна працягнулася да сонца.

Стары Запавет

1

Цудоўны Іосіф

Калі Іосіф прыйшоў да братоў сваіх,
яны знялі з Іосіфа адзежу яго,
адзежу рознакаляровую, якая была на ім;
і ўзялі яго, і кінулі яго ў роў...

Быццё, 37:23-24

І прадалі цябе твае браты,
Каб каляровай не насіў адзежы,
Абрыдзеў — бо інакшы... Зараз ты
Няпэўнай хвілі і купцам належыш.
Над хвалямі бясконцымі пяскоў
Цыклопам вісне сонца Палесціны.
Браты нясуць у клунку да бацькоў
Тваю адзежу і кіпцюр ільвіны.
Ну хоць цяпер навучышся ілгаць,
Анёльскі хлопчык?
У людзях — прыдасца,
Там, дзе стаіць егіпецкі палац
І пальмы ў Ніл замутнены глядзяцца.
Маленькі дабрадзей чужой зямлі,
Снабачаннік, аматар лашчыць словы...
Цябе браты ўсё роўна прадалі б.
А не насі адзежы каляровай.

2

Нараджэнне Майсея

...і вось, дзіця плача ў кошыку;
і злітавалася над ім дачка
фараонава...

Сыход, 2:2

Нібыта папірусны звітак, разгорнуты дзень.
Дачка фараона сядзіць перад бронзавым люстрам.
А кошык з маленькім Майсеем плыве па вадзе,
Нікім не заўважаны.

Сёння на беразе пуста.
Ніхто не абудзіць скароны, згалелы народ.
Калыска лазовая зробіцца ў хвалях труною.
Прынцэса глядзіцца ў люстэрка, прыкладвае лёд
Да шчокаў смуглявых, каб ззяць прыгажосцю зямною.
А маці на крык немаўляці не смее ісці.
І кошык сплывае туды, дзе мядовыя рэкі.
І што нам чакаць у егіпецкім нашым жыцці,
Калі нараджаюцца нашы прарокі так рэдка.
І мы не ўратуем нікога з прарокаў сваіх.
Пад нашымі стрэхамі ім не знаходзіць прытулку.
І крык немаўляці ў вільготным тумане заціх,
І маці трымае на вуснах скрываўленых руку.

3

Сыход з Егіпта

Калі народ пабачыў, што Майсей
доўга не сыходзіць з гары, то звярнуўся
да Аарона і сказаў яму: устань і зрабі нам
бога...

Сыход, 32:1

То манна нябесная, то перапёлкі,
То льецца вада са звычайнай скалы...
Ды толькі былыя рабы — не анёлкі.
Абрыдлі ім скалы, пясок ды арлы.
Ану, паспрабуй адысціся на хвілю,
Прыўзняцца да неба, да Бога Айца...
Унізе з металу каштоўнага выльe
Твой брат улюбёны куміра-цяльца.
Куды ты вядзеш іх, звяглівых, дрыготкіх,
Няўжо спадзяешся, што ў новай зямлі
Забудуць на зайздрасць, нянавісць і плёткі
І ўспомняць прарока, якога клялі?
І мала ім цудаў, іх вера не ўздыме,
І хочацца зноў пад чужую руку...
І Бог паміж іх — не заўважаны імі.
Скрыжалі разбітыя ў хвалях пяску.

Ефрасіння

Балада аб жаночай волі

На фрэсках лік яе жаўцее,
Сухі, як ліст, і гожы цяжка...
Прадслава, ўнучка Чарадзея,
Упарта хоча стаць манашкай.
«Навука дзеўку папсавала!» —
Старыя па вуглах скуголяць.
Але яна была — Прадславай!
А слава вымагае волі.
Счарнеў аж з твару горды бацька.
Жаніх гульбою ганьбу глушыць.
А маці!..
Што ж казаць пра маці...
А слава да таго ж — і мужнасць.
Жанкі!
Такі наш выбар будзе
Паўсюль, няўмольна і адвечна:
Ці — крыж на маладыя грудзі,
Ці — церам з цемрай чалавечай.
Балюча нам даецца воля.
Заплаціш мужнаю душою.
А дзеці?!
Што належыць болей —
Сваё радзіць? Вучыць чужое?
І што на што мяняць не варта —
Ні адгадаць, ні прадугледзець...
...Прадслава хоча стаць упарта
Святой — і вольнаю, як вецер.

Кляштар

Каменная вежа на фоне адлігі.
Вада ў каляінах люструе аблокі.
Ідуць да калодзежа ціхія мніхі,
Крывавыя звады віруюць далёка.

www.kalinka.org

Раз'ятраны Арэс у шлеме пагнутым
Разводзіць і зводзіць аслепленых злосцю.
Брунгільда над чашаю, поўнай атруты,
Чакае цара пераможнага ў госці.
«Бог з намі»,— гарлаюць абодва натоўпы.
Як гэта далёка.
Як гэта дарэмна.
Каменныя вежы, нібыта цыклопы,
Ахоўваюць востраў кляштара таемны.
Шаргочуць малітваў нягучныя словы...
Работа няхітрая па гаспадарцы...
А звону няма.
Бо метал адмысловы
Спатрэбіўся воям — каб зброяю стацца.
Тут сэрцаў ні смерцю крануць, ні дарамі.
Тут — вечная ціша і вечная любасць.
І ў гразкай калюзе ля самае брамы
П'е неба груган акрываўленай дзюбай.

Храм Уладзіслава Чарняўскага

Быць пастарам цяжка ў часіну ваўчыных згрызот.
Ды храм паўстае на пяску, набрынялым крывёю.
І зноў сумняецца і манны чакае народ
І болей ахвотна не пастару верыць, а вою.
Ды выбраны шлях, і ўзвышаецца велічны храм.
І мова тутэйшая там узлятае да Бога.
І Ойча, не статак — народ твой збіраецца там,
Няхай нешматлікі —
Сцяжынка спародзіць дарогу.
І храмы, і кнігі згаралі на гэтай зямлі.
І вера, і веды для зграі ваўчынай — пагроза.
А з маннай аблокі далёка-далёка сплылі,
І зноў пераблытаны веры, і праўды, і лёсы.
Ды ў келлі палае лампада прад Дзевай Святой.
Маўчаць старадрукі, як сурмы архангелаў белых...
І пастар гаворыць і моліцца моваю той,
Што родная сэрцу,
А значыць, уцямная небу.

Вечаровая малітва

І дождж, і снег, і сум адвечны мой.
І кнігі бескарысныя, і песні.
І час ляціць над мёртваю травой,
І па траве слізгаюць хмараў цені.
О, рэдкі міг самотнай нематы!
Людскія крыўды не вярэдзяць сэрца,
І ланцугом астылыя сляды
Ідуць з нябыту — шчасцем ён завецца.
Настаўнік вышні ў гэты час бліжэй
Схіляе лік свой над маім адчаем.
Яшчэ малітва, слова — і лягчэй,
Хто прабачаў — тым неба прабачае.
І мне наверх не страшна пазіраць.
І мне не страшна гаварыць з сабою.
Як дождж і снег, мае гады ляцяць,
І толькі міг малітвы — міг спакою.

У царкве

Непагадзь. Слата і мокры снег.
Установы зачыняе горад.
І плыве марудна, нібы ў сне,
Неба карабель, цяжкі і мокры.
Пастаю за свечкамі ў чарзе.
На штуршкі штурхаць не пажадаю.
Хочуць у царкву змясціцца ўсе,
Бы ў каўчэг, што зараз адплывае.
Подыхі людскія, свечак дым,
Ладану пранізлівая нота.
Хто мы — тут і на каго глядзім
У тумане незямной самоты?
Так было, напэўна, шмат разоў —
У прадонні буры — зграйка птушак
І надзея, што чыясьці кроў
Выкупіць душу тваю ад сцюжы.
Не дастукацца сюды дажджу.
Паміраць — ці ратавацца ў кучы?

Свечцы проста ў вока я гляджу,
А яно міргае так сляпуча.
Можа быць, спагада і спакой
На мяне, самотную, пральецца?
Кожны застаецца сам сабой,
Як чарга чаргою застаецца.

* * *

Перажывём мы ўсе свае няшчасці,
Як некалі дзіцячыя хваробы.
Спазнаюцца маланкавыя страсці
І горкай адзіноты цяжкі вопыт.
Перажывём смерць блізкіх і далёкіх,
Мяжа пакут не перакрэсліць сэрца...
Што ж застаецца ў нас, няверных Богу,
Каб выжыць?
Жах прад смерцю застаецца?
Бо на зямлі яго ніхто не ўладны
Ні высушыць, ні выпіць дзікім мёдам.
Жаданнем жыць
ваўкі лякуюць раны.
Жаданнем жыць
лякуем мы самоту.
І дай мне, Божа, у апошнім крыку
Спасцігнуць сэнс зямной кароткай драмы:
Хаця жаданне смерці — грэх вялікі,
Але баяцца смерці — грэх таксама.
І хай не боязь назаўсёды знікнуць,
Не жах адплыць на невядомы бераг,
А свет святла, куды калісь я знікну,
Дасць сілы мне і прабачаць, і верыць.

* * *

Што вам трэба ад Бога?
Спакою, любові, багацця?
Ці ратунку ад боязі знікнуць у вечнай імгле?
Вы прыходзіце ў храмы, з самімі сабою не ў ладзе,

І адзін аднаго вы не любіце, брацці мае.
Я сумую па еднасці душаў. І, мусіць, дарэмна,
Бо наіўна шукаць разумення, не стаўшы ў чаргу.
І бясконцая вера прымаецца, быццам бярэмя.
А яна — гэта крылы, якія раскрыць не магу.
Мы такія слабыя прад цёмнай грахоўнай стыхіяй,
Бо захоўваем зерне яе пустазелля ў душы.
Толькі Бог можа нас затрымаць на бязлітасным схіле,
І не позна звярнуцца да літасці нат на крыжы.
Што нам трэба ад Бога?
Слабыя ў духоўнай навуцы,
Чым прад Ім апраўдаем
шматлікія просьбы свае?
За багаццем зямным у чарзе не штурхайцеся, людцы.
Тут не купіш за грошы,
што кожнаму з нас не стае.

Душа

Свой воблік сапраўдны
яна не прыпомніць даўно,
Але памятае
цяпло чалавечае хаты —
Сівая варона
маё прылюбіла вакно
І лётае з могілак,
сеючы рогат хрыпаты.
На вокны другія лятуць
галубы, вераб'і...
Што хоча сказаць мне
абвуглены сколак сумнення?
Не птушка — душа,
а гарлае — таму што баліць,
І пер'яў баіцца сваіх
з хваравітым адценнем.
Дваром пралятае —
шпурляюць каменні ў яе
Хлапчыскі, якія жывуць
паміж сёння і заўтра.
Прадзедаўскі боль

прылятае штодня да мяне
У пер'ях праклёну,
у паху палынавай гары.
Садзіцца за шыбай —
а цень адкідае ў пакой.
Паветра здаецца гаркавым,
а шкло — непразрыстым.
...А сёння на шкле падсыхала
вароніна кроў
І голуб за шыбай
бялюткія перайкі чысціў.

Два крыжы 1937 года

На крыжы маланак соладка памерці.
Прад усім Сусветам праблішчэць пакутай.
А абраць Галгофай тую кучу смецця,
На якой жывеш ты — гэта ж на смех юдам.
Ведаць, што ўзнясешся,— чым не ўзнагарода.
А сысці ў нямоцтва — чаша для аскета.
На крыжах з маланак — геніі народа.
На крыжах аконных — ціхія паэты.
Божа літасцівы, не пазбаў надзеі
За зямлю хоць гукам, словам зачапіцца.
Не для нас так страшна неба залацее,
Ды затое пахне тлом — для нас — ігліца.
За раскрыжаваных п'е народ штодзённа,
Толькі не падыдзе зняць з крыжа — ніводны.
Над крыжом з маланак — скіпетр і карона,
Высахлая кветка — пад крыжом аконным.

www.kniga.by

* * *

Самыя доўгія ночы.
Ночы без зораў, без снегу.
Не адпускай мяне, Ойча,
ў гэтае цемрыва грэху.
Не аддавай мяне, Ойча,
гэтаму свету прарокаў,
бо Саламея ўсё танчыць,
рукі ўздымае высока.
Тонка звіняць бранзалеты,
кружаць яе пакрывалы,
з шоўку празрысцей завеі,
з вогненным імем Ваала.
Стан выгінаецца гнуткі,
твар не ўсміхаецца белы...
Не пасылай мяне, Ойча,
ганьбіць лілейнае цела.
Ёсць у няведанні — шчасце,
святасць — у жорсткасці цноты.
Не наракай мяне, Ойча,
увасабленнем самоты.
Пасак таненькі ўзыходу —
сцежка ад цемры ды сцюжы.
Там сарамлівая Дзева
цеслю прымае за мужа.
Не спакушае нікога,
не забівае нікога.
Проста і трохі наіўна
волю выконвае Бога.
А Саламея ўздымае
рукі так страсна і гожа,
і Магдалінай святою
я не ўяўлю яе, Божа...

www.kamunikat.org

Магдаліна

1

Вецер, восень... Проста нечаканасць —
Ад марэння выйсці ў жоўты сад
І сустрэць праз агароджу брамы
Дзіўнага настаўніка пагляд.
Вецер, восень. Сіні плашч і сонца.
Яблыкі ў траве. Адно ўзяла.
Праз узор каванай агароджы
Шчэ без разумення падала.
І ўраніла пад паглядам строгім.
І жаноцкасць не патрэбна мне.
І лісцё ляцела ўздоўж дарогі,
І ляцелі цені па сцяне.
Тут мой дом! Чаму я не шкадую
Гэты дом? Ці вочы прада мной —
Вочы Бога? І куды пайду я
З болем гэткім, з прагаю такой?
Я кахала — гэта не каханне.
Чаравала — не чаруе ён.
«Грэшніца, табе — выратаванне!»
І пайшоў, нібы світальны сон.
Вецер, восень. Яблыкі лавіла
Чорнымі далонямі зямля.
Гэтым днём забілі Магдаліну.
Ёю быці перастала я.

2

Настаўнік! Паміж небам і зямлёй
Што ведаем пра сад жыцця і смерці,
Дзе ўліўся ў вецер яблычны напой
І цяжар нахіляе шчасця вецце.
Настаўнік! Тут пажоўклая трава
І прыгажосць заўсёды прадаецца.
Няхай асенні горад Магдала
Згарыць, як памяць аб распусным леце.
І я пабачу сад жыцця і смерці.

www.kamunikat.org

Настаўнік! Ты не бог, бо слепну я
Ад слёз тваіх — не боскае знямогі.
Каханне — гэта ісціна мая.
Так, як расстанне — ісціна дарогі.
Я рушу за табою. След у след.
І смерць за смерцю. Гразка пад нагамі —
Да ног прарокаў прыліпае свет
Гразёй, а да запясцяў — ланцугамі.
Я больш нічога ў свеце не хачу,
Абы навечна здоўжыць гэту восень,
І бачыць вочы вашы, словы чуць,
І толькі ветру даць расплесці косы.

3

Доўга пыл глыталі за прарокам,
Не пыталіся, куды ісці,
Ты прывёў нас да гары высокай,
Толькі ўзыдзеш на яе адзін.
Прадала даўно я бранзалеты,
Звонкія маністы і парчу.
Я даўно аплаканая ветрам
І вяртацца ў восень не хачу.
Мой настаўнік! Ты не мне належыш,
Значыць, не належыць мне нішто.
І зямля — як збураная вежа.
І як саван — белы мой хітон.
Ты прывёў нас да гары высокай.
Ты адзін узыдзеш на яе.
І сляза, сляза туманіць вока —
Мой апошні жэмчуг — для цябе.
Ты гаворыш — хутка расставанне.
Хутка — вечнасць. Што ж, апошні мой.
Яблыкі пакоцяцца ў світанне,
Стрэсеныя Евінай рукой.
Як ніхто ніколі не шкадуе,
Што напіўся чыстае вады,
Я кахаю восень залатую,
Я цалую Божыя сляды.

Калядныя вершы

1

Ззяла зорка над начною пусткай,
Быццам першы залацісты цвік.
Аблачыны падалі, як руты,
Прыглушалі немаўляці крык.
«Аве! Аве!» — птушкі праспявалі.
«Аве!» — адгукнулася зямля.
Паўтарала ўсё жывое: «Аве!»
І заснула ў хлеве немаўля.
Ну а людзі выбягалі з хатаў,
На балконы выбягалі віл.
Зорку вязні бачылі з-за кратаў,
Бачылі нябожчыкі з магіл.
«Быць вайне!» — няшчасныя шапталі.
«Цар памрэ!» — багатыя раўлі.
А аблокі мякка ападалі
І стваралі ружы на зямлі.
І святло, запаленае ўночы,
Бачылі нямногія яшчэ.
...І заснуў у хлеве ціха хлопчык
Пад сузор'ем матчыных вачэй.

2

Сёння ўночы народзіцца Бог,
Сёння днём не змяніліся людзі.
І валхвы не пратопчуць дарог
Да Марыі па снезе і брудзе.
Я люблю гэты час і мароз,
Вастразорае неба і шэпат
Аблачын. І няпэўны свой лёс,
І далоні, узнятыя ў неба.
Сёння ўночы народзіцца свет.
П'е гарбату наш госць выпадковы.
Хутка пойдзе — і выстыне след,
І развеюцца сумныя словы...
Словы, словы... Частункі душы...
Б'е гадзіннік. Да поўначы блізка.

Толькі ў полымі свечкі дрыжыць,
Як пялёстак, блакітная рыска.
Хутка, хутка народзіцца Бог.
Прыйдзе любасць хаця б на хвіліну.
Хто хацеў дараваць і не змог —
Сэрца ў свеце мінулым пакінуў.
Хто не ўспомніў пра Бога — сляпы.
Мітусня, хлеб штодзённы — не вечнасць.
Сёння горад — ад зор залаты,
Батлеем — у каляднай цямнечы.

* * *

Ці крыж, ці крылы — застаюся з тым,
Што даў Гасподзь, нявечнае, як Рым.
Чаго жадаць мне звыш таго, што ёсць?
У Вавілоне — выпадковы госць,
І ў маскарадзе птушак і багоў
Мой лёгкі след затопчуць зноў і зноў.
На пляцы, дзе гандлююць белым сном,
Мне адчыняе дзверы ціхі дом.
Не танчаць там, не прадаюць, не лгуць.
А тое, што Гасподзь даў, берагуць.
Ці крыж, ці крылы... Воцат ці віно...
Мне дадзена на ўсё жыццё — адно.

Сад агню

Агонь — увасоблены пераход з адной якасці ў другую. З аднаго свету — у другі. У храмах заўсёды гарыць агонь. Калісьці ён спальваў кроў і плоць ахвяр, сёння — кнот у свечках і духмянасць у лампадах. Калі глядзіш у полымя, сустракаешся з позіркам боства. Але варта зблытаць і абагавіць сам агонь — з яго трапятліва-блакітнага асяродку зірне ў тваю спалоханую душу той, чыё імя не называнае... І неадольна захочацца адкупіцца ад гэтага бязлітаснага позірку і кінуць прагным чырвоным шчупальцам... ну, хоць трэску. І з насалодай, з неўсвядомленай баязлівай агідай назіраць, як дрэва курчыцца і

чарнее, як бессаромна адкрыта адбываецца дзея смерці і распаду...

Не ведаю, ці пакланяюцца агню дзе ў свеце так, як у Беларусі. Лясы і паляны вакол гарадоў спрэс у чорных воспінах кастрышчаў.

Колькі седжана ля такіх вогнішчаў, колькі слухана песень! Спачатку — пра сініх птахаў ды заснежаныя вяршыні, пасля — пра стан дзявочы Белай вежы ды зорачкі далёкай чужыны... Сышла рамантыка, дагарэла... А можа, гэта толькі здаецца тым, хто адышоўся далёка ад колішніх вогнішчаў? Нехта ж падкідвае ў іх па-ранейшаму сухое голле надзей...

У ведыйскай і індуісцкай міфалогіі Агні, бог агню, адначасова стары і малады, зямны і нябёсны, забойчы і выратавальны, пасрэднік паміж багамі і людзьмі. На выяве ён мае два аблічча — усмешлівае і пагрознае...

Грэкі верылі, што Праметэй, каб прасвятліць розум чалавека, вынес з Алімпа святарны агонь, схаваўшы яго ў сцябло трыснягу. Але агонь сам сышоў да людзей — агонь, які не абпальваў і не забіваў. Майсей размаўляў з ім. Ён сыходзіў на апосталаў. Ён і цяпер штогод у Вялікую суботу сыходзіць на Труну Гасподню, і ўсе свечкі ў храме самі запальваюцца дзіўным, непякучым полымем...

Калі палілі ведзьмаў ды ерэтыкоў, інквізітары шчыра верылі, што робяць дабро тым, каго паляць. Некалі на скалістых узбярэжжах так званыя берагавыя піраты — звычайныя тубыльцы — распальвалі ўначы агні. Караблі плылі на іх і разбіваліся. Паводле закону, усё, што трапляла пасля крушэння на бераг, рабілася ўласнасцю мясцовых жыхароў. Гэта была звычайная, побытавая, сямейная справа.

У Кракаве там-сям можна сустрэць дзіўныя скульптуры, падораныя мясцовым ураджэнцам-скульптарам, які з'ехаў у Японію і зрабіў там добрую творчую кар'еру. Гэта металёвыя «агеньчыкі» — мадэрновыя фігуры, у якіх можна ўгледзець і рысы твару, і што яшчэ заўгодна... Лічыцца, што яны прыносяць шчасце, і ў Японіі яны дужа папулярныя. Дый тут, у горадзе, які памятае Скарыну і Каперніка, да адной з іх, што хаваецца ў тысячагадовым дворыку, абавязкова прыязджаюць маладыя пары — як у нас да Вечнага агню.

У Беларусі жыве сто пяцьдзесят відаў дзённага матыля, які завецца агнёўка. Псуе гэтая агнёўка ўсё, маючы дзеля кожнае псоты свой асобны від: кукурузу і буракі, хвою і зерне, каноплі і

воск у вуллях... З выгляду матыль зусім непаглядны, шэры. Мусіць, назва абумоўленая гэтай усёеднасцю, як у полымя?

Зачараванасць агнём у чалавеку этолагі тлумачаць інстынктам. Яны ж прыпадабняюць агню мільганне светлавых эфектаў, думак і вобразаў на экране тэлевізара, які заварожвае сённяшняга гома сапіенса гэтак жа, як некалі сапраўдны агонь у вогнішчы. Гэты інстынкт з жывых істот ёсць толькі ў чалавека ды ў сабакі.

Алхімікі насялялі агонь жывымі істотамі — саламандрамі. Хаця Пліній, старажытнарымскі гісторык, апісваў іх як рухавых яшчарак, рамантыкі Сярэднявечча нярэдка ўяўлялі саламандру прыўкраснай жанчынай з вогненнымі валасамі. Яе існаванне было доказам таго, што можна жыць у агні. Бо як жа будуць вечна гарэць уваскрэшаныя грэшнікі? Тканіны з асбесту прадаваліся пад выглядам скуры саламандры.

Геракліт называў агонь асновай сусвету. Старая медыцына лічыла агонь адным з чатырох складнікаў чалавечае крыві. Калі гэты складнік пераважаў, чалавек валодаў халерычным тэмпераментам.

На раскопках старога Менска відаць на глыбокім зрэзе зямлі чаргаванне шэрых палосаў з чорнымі. Гэта сляды пажараў. Кожная такая паласа — нібыта чорны радок, з якога наноў пачыналася гісторыя горада.

Пралетарскі пісьменнік Максім Горкі любіў ладзіць маленькія вогнішчы ў попельніцах ці хаця б спальваць запалкі. Ягоны герой Данка вырваў уласнае палаючае сэрца, каб асвятліць свайму народу дарогу з цемры. А народ па тым сэрцы патаптаўся... А вось сябра Горкага Карней Чукоўскі ў дзённіках пісаў, як разам са знаёмцам-камісарам і славутай балерынай ездзіў на звычайную забаўку савецкай эліты тае пары — глядзець, як спальваюць нябожчыкаў у новаадчыненым крэматорыі. Дамам асабліва падабалася, як у агні выбухаюць вочы.

Агонь — гэта «amor ardens», каханне палаючае. Калі з'ядноўваюцца ў адно цялесная прага і духоўная еднасць. Але найчасцей атрымліваецца ўсяго толькі люстраны агонь — халодны і прывідны, бо цешыць толькі таго, хто люструецца.

На Алімпе Гефест, бог агню, выконваў ролю блазна... Зусім як у старым савецкім дзіцячым кінафільме — дзе Агонь іграў заслужаны чэчэнец Махмуд Эсамбаеў. Ён скакаў у парыку з чырвоных стужачак і прасіў: «Не пускайце мяне на волю...» І галоўныя героі — піянеры — абяцалі: «Не пусцім, не бойся!»

Сын скульптара Бембеля, паэт, які зараз стаў святаром у Жыровіцкай абіцелі, у паэтычным мінулым меў вогненны псеўданім Зьніч. Гэтак жа называецца беларускі паэтычны тэатр, што месціцца ў сутарэннях Чырвонага касцёла... Агонь у сутарэннях... Метафара нашае паэзіі.

Знаёмы мастак, сябар паэта Анатоля Сыса, Алесь Квяткоўскі спрабаваў намаляваць вогнішча. Намаляваны акварэллю, вадзяной празрыстай фарбай, агонь усё роўна пазнавальны. Гэтак жа, як партрэты Сыса — паэта агню... «Гараць камяні ў маім вогнішчы, расцвеленыя агнём» — гэты радок Анатоля, ухвальна працытаваны мною ў артыкуле, выклікаў цэлы шквал нападак правільных, але бязвогненных паэтаў. Хіба камяні могуць гарэць?

Так, не могуць... Для гэтых — не могуць. Бо сказана ў Пісанні: «Няхай бы ты быў калі не гарачым, дык хоць халодным... Але ты проста цёплы — і таму адвергну цябе...»

Вогненныя вёскі, Вечны агонь, купальскае вогнішча, зніч, агонь чарнобыльскага рэактара... У крыві маёй радзімы дастаткова агню...

Два рыцары

Рыцар Сонца, з мячом, што, як промень, блішчыць,
З ясным тварам, спакойны і светлы.
Ты пад ногі мне клаў залачоны свой шчыт
І смяяўся, ахутаны ветрам.
Колькі сэрцаў дзявочых ты лёгка скарыў,
Колькі сэрцаў варожых спыніў ты.
Толькі дому майго не палохай муры
Гордым гоманам славы здабытай.
Бо інакшыя песні пад гэтым вакном
Кожнай ноччу пяюцца так гожа.
Рыцар Месяца, ззяючы срэбным ільдом,
Сон і душу мае растрывожыў.
Ён не зброю, а лютню плашчом захінуў,
Ён не золата сыпле, а вершы.
Не жанчын ён шукае — жанчыну, адну.
І не рыцарству — Богу належыць.
Рыцар Месяца, строгі і сумны ваяр,
Не забіў ты нідзе і нікога.
Ды палацы зруйноўвае песня твая

Ці душу набліжае да Бога.
Рыцар Сонца ўздымае каня на дыбкі
І смяецца, як звон, пераможна.
Ды мяне чорны плашч разам з лютняй прыкрыў,
І дагнаць нас, як песню, няможна.

Норвіду

Паэтычны цыкл па матывах біяграфіі

1. Нерытмічная серэнада па дарозе ў госці

Я — цьмяны паэт.
Я забыўся, што дождж — вада,
А не стома асенняга неба,
Што вецер — паветра,
А не стогн...
Я сябе жабраку, быццам грошык, аддам,
Я ўпаду хуткім позіркам
За таямнічы веер.
Я — цьмяны паэт.
Я варты насмешкі, як Ной,
Што каўчэг будаваў
Пад бязвоблачным небам габрэйскім.
Я забыўся,
Што трэба любіць гэты свет, гэты гной,
І ў Евангелле клею свае каляровыя ўрэзкі.
Я — цьмяны паэт.
І штодзённае вашай гульні
Не запомню ніяк прадпісанняў.
І я не гуляю
Разам з вамі.
І горад свае расстаўляе агні,
Як аблогу, якую
Я цэлую вечнасць трываю.
Я — цьмяны паэт.
Я ў альбомы не ўмею пісаць,
І нічога прыемнага не прысвячу я нікому.
Я — цьмяны паэт.

Непатрэбныя вершы згараць,
І святло разліецца няўрымсна
Па вашаму дому.

2. Праменад паэта

Як соладка, калі падчас прагулкі
З маленькай пані,
сціплай і прыгожай,
Дзеля якой ты быў гатовы ўчора,
Як Гамлет, з'есці кракадзіла ці
Пісаць, як падабаецца народу,
Як соладка падчас такой прагулкі
З п'янюгам незнаёмым прывітацца,
Увасабленнем вулічнага гною,
І мімаходзь сваёй заўважыць даме:
— Я хутка пазнаёмлю вас бліжэй —
Ён вельмі каларытная асоба.
І сэрцам адчуваючы павагу
Да інстытуткі, што збялела толькі,
Але ж ідзе, не страціла прытомнасць,
Шпацыраваць па чыстым тратуары,
Здымаючы свой чорны капялюш
Прад кожным жабраком і валацугам.
Так робяць дасканалыя паэты.

3. Маленькае галоднае трызненне

Павута зацягвае вакно.
Гэткія фіранкі мне да густу.
Сябра мой, Арахна, ладзіць зноў
Нітку сэнсу дрогкую праз пустку.

Што мне да атручаных багоў,
Да таго, што трэба піць і есці...
Сябра мой, Арахна, ладзіць зноў
На жыццё, нібы на муху, сеці.

Вечны вечар хату апавіў.
І багі маўчаць, і я таксама.
На абрус самоту я праліў,
І няма каму заўважыць пляму.

Можна п'яным быць і без віна.
Мне ўдаецца гэта кожнай ноччу.
Пасмачкі Ясонава руна
Сыплюць, сыплюць золатам у вочы.
Цемра пакалыхвае фатэль.
І жанчына злоснай прыгажосці,
Што жыве за трыдзевяць зямель,
Ключ не павярнуўшы, уваходзіць.

Як ніколі, ціхая яна,
Слухае мае п'яныя скаргі
І сядзіць са мною давідна,
Поўная спагадлівай увагі.

А пасля знікае, як прыйшла.
І няма жыцця ў маім пакоі.
І абрус злятае са стала,
Быццам плашч параненага воя.

І вакол пляцецца павута,
Заплятае ўсё паветра ў хаце,
Дзе няма ні ежы, ні пітва,
Ні сяброў, ні золата, ні шчасця.

4. Роздум пад кустом шыпшыны (Rosa canina)

Сабачая ружа, мая несарваная кветка,
Мой дзікі агеньчык, запалены лёсам самім.
У белыя рукі паненак трапляеш ты рэдка,
Ты сходная вельмі
З няўрымслівым лёсам маім.
Трава не расце там,
Дзе крочыць прывыклі натоўпы,

www.kamunikat.org

Таму я заўсёды
Іду па высокай траве.
Сабачая ружа
Квітнеецца ў цэнтры Еўропы.
Пад пышным кустоўем
Паэт непрызнаны жыве.

5. Vade mecum![1]

Ідзі за мной!
Бо я не абяцаю
Ні Меккі, ні Эдэма, ні Чыпанга,
Бо мудрыя пайшлі за мудрацамі,
Зблажэлыя — за тымі, каму блага.
За слаўнымі памкнулі славалюбцы,
За злоснымі — аматары пабіцца.
За дурнем нехта йдзе, за душагубцам,
За д'яблам, за распуснай Мілавіцай,
А ты ідзі за мною!
Рэшткі замкаў
Пакрыюць ногі нам цагляным пылам.
Між мармуровых Артэмід і Вакхаў
Жыве Ікар,
Ссівелы і бяскрылы.
Ідзі за мной!
Бо я не абяцаю
Канца дарогі і карыснай мэты.
Ідзі за мной!
Бо я цябе чакаю —
Паэт — паэта.

[1] Так называўся нявыдадзены зборнік Цыпрыяна Норвіда.

www.kanuniat.org

* * *

Што тут паэт? У гэтым сквапным свеце
За тое плацяць, што нясуць у дом.
А вершы — гэта зоры, гэта вецер,
Імгненне, што застыла пад сцілом.
Што можам паказаць мы багацеям?
Не твар багіні — толькі лёгкі след.
Не напалохаюць герояў цені,
Якія ажыўляе кіфарэд.
Таму паэт — жабрак і ёсць, і будзе,
Хаця ўладарыць Апалон над ім.
Але, калі загіне горды Рым,
Па нашых вершах Рым спазнаюць людзі.

Ля бюста Пашкевічанкі

На сэрцы — агонь,
А на вуснах — лёд.
А кажуць, што лёд — на сэрцы.
Але ж за самы святы народ
Без болю не ўдасца ўмерці.
Без болю, жалю, без рэдкіх слёз,
Жаночых — таму — пякучых.
Дзіцячы смех у тваё жыллё
Не ўвойдзе — як неўміручасць.
Каханні прыйдуць яшчэ не раз,
Ды вуснаў не спаляць страсцю,
І часта клічуць цябе:
«Сястра»,
І клікаць не будуць:
«Маці».
Усё адгарыць-адбаліць з жыццём,
З пялёсткамі прыгажосці.
Пяройдзе ў бронзавае ліццё
Аблічча —
І страціць штосьці.
Яно захавае холад тваіх
Збялелых прыгожых вуснаў.
А там, дзе ў жывога — баліць-гарыць —

Холадна.
Мёртва.
Пуста.

Паэзія

1

Прыходзіць. Адбірае нематy.
Нібыта словы маюць сэнс у свеце,
Дзе іх ільюць, нібы ў пясок ваду,
Дзе попел іх разносіць горкі вецер.
Не хлеб яна. І нават не віно.
Не яблык, што пазбавіў нас Эдэма.
Яна — нібы ў сцяне глухой вакно,
Трымценне зор і гук вады падземнай —
Не скарыстаць у побыце.
Не стаць
Яе гаспадаром. Не перайначыць.
Яна зруйнуе слоў тваіх палац,
Калі свайго адбітку там не ўбачыць.
Парве душу... Прымусіць блазнам быць.
А ты ж — герой! Ты марыў пра палёты!
А не прыходзіць — і навошта жыць
І будаваць свае пустыя соты?

2

Не ілгаць у вершах немагчыма,
Бо — мана, што імі зменіш свет.
Толькі гэта ўсё-ткі не прычына,
Каб дачасна замаўчаў паэт.
Вершы хлусяць, а яшчэ — і раняць,
Па пялёстку скубучы з душы.
Распрануць прылюдна, зганьбяць памяць...
Не пішы, мой браце, не пішы...
Ты не крыж — а подыум майструеш,
На якім ты — блазан, не герой.
І глядач адданы не даруе,

Што тваёй захоплены ігрой.
Там, унізе, дзеляцца і дзеляць,
На ўзвышэнні вершаў — толькі боль.
Ты маўчыш, мой брат... Нібы пацэліў
Зноў у верш твой малады кароль.
Словы тыя, што ў сабе зняволіў,
Не памруць — а спапяляць знутры.
Вершаў не даруюць нам ніколі.
Вершы не даруюць нам ніколі.
Замаўчы, паэт... Або згары.

3

Прадавайся хутчэй, мастак.
Тут ніхто цябе не ўратуе.
У мастацтве заўсёды так —
Хто — красуецца, хто — красуе.

4

Словы не жадаюць паміраць,
Як ні забіваю іх бязмоўем.
Нада мной, нібы пачвары Гоі,
Непрамоўленыя сны гараць.
Немагчыма змусіць знікнуць іх,
Душы вершаў, мной ненапісаных.
Я шукаю толькі беззаганных —
Ды ніяк не адшукаць такіх.
І таму — нямею... І жыву
Пад сваёй раскрыжаванай марай.
І лятуць на мой агонь пачвары,
І хілю да сшытка галаву.

5

Падаюць зоры, нібы паміраюць анёлы.
Сцежкамі смерці бліскучай закрэслена вечнасць.
Ды нараджаюцца зоры — ўсё болей і болей,
Дзівіцца светлы анёл мітусні чалавечай.
Мой зарапад не адменіць працягу Сусвету.

www.kalinka.org

Восень мая ні адцення ў вясны не адніме.
Сцежкай бліскучай у цемру сыходзяць паэты.
Ды не сыходзяць анёлы і вершы за імі.

Паэт

Паэт сівыя лашчыць камяні.
І не таму, што мала дам прыгожых.
Кладзецца вецер у каменны ложак
І задзімае зорныя агні —
Паэт сівыя лашчыць камяні.
Чытае ім абвугленыя вершы,
І не таму, што слухачоў няма
Сярод жывых; але жывым — дарма
Казаць пра боль...
Для іх ты — толькі грэшнік,
Што ім — паэт, апошні ён ці першы...
Вар'ят, няйнакш...
У полі галасіў,
Крывавіў сэрца аб глухія глыбы...
Прыгорблены, пайшоў... Ссівелым німбам
Свяціліся пад поўняй валасы.
...І камяні за ім, п'яным, ахрыплым,
Каціліся, бы кропелькі расы.

Забытыя паэты

1

Калі скончыцца Час — і не будзе сцяжыны маёй,—
Адпачнуць мае рукі ад вечнага прадзіва сказаў.
Пачакай, мой анёле, нябёсны няўрымслівы вой.
Я сувой не даткала, я сэнс не спасцігла ні разу
Той няўлоўнай гульні, за якой мы прабавілі час,
За якую плацілі такою высокай цаною.
Ды анёлы не чуюць, а можа, не слухаюць нас,
Бо не сталі малітваю словы, а сталі маною.
Калі скончыцца Час — і на ўсё атрымаю адказ,—
Ці пачнецца пакой? Ці пясок Вавілона ўзвіхрыцца

І засыпле дарогу дадому і дом наш... А ў нас
Будзе сэрца ўсё гэтак жа словамі зніклымі біцца.

2

На магіле маёй трава —
Самы вечны помнік на свеце.
Сталі друзам дом і царква,
На пагосце гуляюць дзеці.
Сталі кнігі пылам... А сад
Карчавалі ўсёй талакою.
Пралятаў анёл між прысад —
Захінаўся светлай рукою.
Ну а скрыпачку прадалі,
Майстраваную з векам разам.
Ціха гукі яе сплылі,
Быццам кроў забытага часу.
Расцягнулі па хатулях
Абразы і старую зброю.
І забылі на вугалях
Знічку, знятую з неба мною.
Свет расколаты напалам.
Я ў расколіне, я ў міжчассі.
І травінка, нібы страла,
У зямлю сухую ўпілася.

3

Правінцыя... Непазбежная, быццам смерць.
У салоне свецкім гараць залатыя свечкі.
Тут усю Беларусь прадстаўляе адзін паэт,
Незаўважны, самотны, нібыта зімовы вечар.
Ну а што гаварыць?
Тут нават крычаць — дарма...
Менуэт, мазурка...
А потым — гуляць у фанты.
І заўсёды ў пары з іншым танчыць Яна,
Гнуткая, быццам вярба
ля бацькоўскай хаты.
Цені слізгаюць па сценах, нібы гады,

www.kamunikat.org

Што правялі ў спадзеве на незалежнасць.
Воск, што калісьці ў сотах быў залаты,
Стыне лужынкай,
брудны, нібыта грэшны.
Хутка, як свечка, гэты свет аплыве.
Нібы васковыя, знікнуць сцены палаца.
Першым, вядома, на плаху пойдзе паэт.
Паэтаў, нават маўклівых, усе баяцца.
Касіянерскім лязом саржавеў той век.
Пані ў жалобе ў гародчыку песціць кветкі.
Правінцыя... След ад калёс на сухой траве...
Паэт нарадзіўся.
Але ён яшчэ маленькі.

4

Паміж кніжных старонак шукайце мяне,
Проста высахлай кветкай — не прадзівам фраз.
Б'е гадзіннік на белай высокай сцяне,
Ля якой расстралялі, закрэслілі нас.
Кнігай меней у доме — і пылу паменш.
Ад чырвоных сузор'яў адчысцяць сцяну.
Пад абцасам памрэ недастрэлены верш.
Між старонак сарванаю кветкай засну.

5

Падаць, падымацца, падаць, падаць...
Лёс ніколі не спраміць шляхі.
Зноў паэт, п'яны, слабы, хрыпаты,
Піша верш, бы сплочвае грахі.
Крывіцца сусвет у белых шыбах,
Быццам чуе дотыкі радкоў.
А вясна халодная, як рыба.
І, як смерць, халодная любоў.
Бы апошні таўр нямой Таўрыды,
Аскалёпкі волі падбіраў.
Выбеглі на сцежкі маргарыткі,
Каралевы прыдарожных траў.
А паэт у хаце непрыбранай
Піша — і не ведае каму.

Пакараны ён або абраны —
Сам не ўцяміць...
Дый нашто яму?

6

Ты марыш пра шчасце, якога здабыць не ўдалося.
Упалі гады на зямлю, як пустыя калоссі.
І што засталося — паперы не вартыя вершы,
І вечная прага быць першым, і вера: «Я першы».
Навошта? Вясна пераробіць усе ручаіны,
Скране ўсе сцяжынкі і стане дзіцёнкам наіўным
З пытаннем: «Навошта?»
А ты застанешся з ільдамі,
З каменнымі сценамі, што збудаваны не намі.
І мовай травы загавораць паэты і дзеці,
І будзе вясна... І партрэта не будзе ў газеце.
І іншыя промням падставяць далоні і твары.
І ў новай краіне растануць халодныя мары.

Старасветчына

Абарвалася нітка, і перліны ўпалі ў пясок.
Не хапае паненцы — карункаў, а пану — валок,
Не хапае рамізніку п'яных багатых гасцей,
Не хапае касцёлу — званоў, Беларусі — людзей.
Толькі лірнік здаволены ўсім. Ён дарогай сляпой
Носіць песні пра шчасце на дне сваёй кайстры старой.
Асабліва здаволены, што не пабачыць наш свет.
І ніхто пра яго не напіша: «Прарок і паэт».
Тут не любяць паэтаў. Тут любяць сляпых спевакоў,
Любяць песні пра шчасце, якіх не хапае ізноў,
Бо хапае трывогі і болю... Падай мне руку —
Пазбірала я перліны ў мокрым халодным пяску...

* * *

Сумніцельнае шчасце ўзяў паэт
На кірмашы наканаванняў лепшых.

Паэт, як дэміург, стварае свет
І сотні жыццяў пражывае ў вершах.
Ён можа быць усім, чым хоча быць.
Хаця ў грамадстве ён — нішто, і меней.
Ён можа ўсё — але не ўмее жыць,
Як стод не ўмее падаць на калені.
Пакутуе — дзе іншы ўсё б прыняў.
Ідзе з жыцця — дзе іншы б пасмяяўся.
Ён — гэта тое, што ён напісаў.
Астатняе — не падлягае ўвазе.

* * *

Ну што ёсць Вечнасць? Неўявіма —
Лічы, нібыта і няма,
Як не было Афін і Рыма,
Як ёсць трупярня і турма.
Няма нічога па-за намі.
А мы — такі маленькі свет,
Дзе купал неба пад нагамі
З бліскучых складзены манет.
І крыл няма, і часу многа
Для пустаты, для марнаты.
Што ты гаворыш мне пра Бога,
Калі ёсць толькі я і ты?
Ёсць я — і ты. І нашы зоры —
Яны прыклеены на столь.
Ну што такое смерць і гора?
Жывы — і значыць, ты — кароль.
Набгом пацір асушым гэты.
Нас не спалохаць чорным дням.
Ты мне гаворыш, мы — паэты?
Мой мілы, гэта сніцца нам!

* * *

Не для вас пішу. Не для сябе.
Вось цяпер, пры гэтай лямпе цьмянай,

З водбліскам гардыні на ілбе,
З беднай зоркай у вакне туманным,
З кім вяду бясконцы дыялог?
Перад кім мая начная споведзь?
Не наважуся прамовіць: «Бог»,
І ніколі праўды не прамовіць.
Ціша разліваецца — ці гук?
І няма самоты ў час вызнання,
І аловак выпадае з рук,
Быццам важыць болей за чаканне.
Дык пры чым да гэтай прагі жыць,
Да пакутаў гэтых і любові
Той, хто смутным вокам прабяжыць
Зноў па кратах чатырохрадкоўяў?
Не, няхай галодны Мінатаўр
Сцішыцца ў замкнёным лабірынце.
Хай сляды губляюцца між траў
На далёкім рамантычным Крыце.

* * *

Першая. Апошняя. Чужая
Чара вечнай ісціны жыцця.
Мне няма пакласці што на шалі,
І не злітасцівіцца суддзя.
Ноч перацякае падваконне
Водарам язміну і нуды.
У каменных сотах — сто агоній
Бедных душаў царства нематы.
І ніяк, ніяк мне не ўсвядоміць,
Дзе напрацаваны намі мёд,
Ці ў нябёсным, недасяжным доме
Робяць свечкі з воску нашых сот?
Ці ў начы, сасмяглай ад спякоты,
Кіпень пераварыцца жыцця
І сцякуць у глебу мёд і соты,
І абрыне шалі ўніз суддзя.

* * *

Халодныя духі! Сёння вас запрашаю да сябе,
вашай хачу дапамогі, хачу быць падобны да вас
і пагарджаць светам!

Я. Баршчэўскі

Халодны агонь, што вандруе на свеце маім,
Няверны, як брат, і спакусны, як водар мелісы,
Ніяк не спаймаю на лапінах чорных адліг,
Ніяк не злаўлю на распаленым жнівеньскім прыску.
Халодны агонь... Ён прылашчыць, і будзе спакой,
Бясстрасная думка ўвесь свет мітуслівы прыўлашчыць.
Пякучае полымя, што безупынна са мной,
Суціхне — і болей не будзе нясцерпна гарачым.
Шукаю агонь — і баюся аднойчы знайсці.
Уладных людзей таямніцу раскрыць не жадаю.
Халодны агонь прабягае па жоўтым лісці
І ў шыбах багатых кварталаў, як здань, прападае.

* * *

І расколаты, звон не забудзе ніколі свой голас.
Я апошняя ў свеце, хто Вежу збудуе сваю.
Па нябёсах чужых залатое пракоціцца кола,
А карэта мая спачывае ля брамы ў Раю.
Басанож, басанож па аскепках люстэрак і мараў,
Па халоднай зямлі, у якой цяжка выкапаць дол.
А камусьці здаецца — я мякка ступаю па хмарках,
І ліхтар нада мной клапатлівы трымае анёл.
Ні крыжа і ні крылаў — жаночыя вузкія плечы.
І каму ты пакажаш палаючы ў сэрцы агонь?
Невыносны мой боль, і нябачны, і, можа быць, вечны...
Але я — ці хачу назаўсёды пазбыцца яго?

Невядомая паэтка

Я ніколі не бачыла вас.
Можа быць, толькі позіркам сэрца.

І над вамі сівее трава,
І ніхто вас не помніць на свеце.
Вы былі гэткай самай, як я,
Шмат чыталі і вершы пісалі.
І самота была ў вас мая,
І зялёныя вочы палалі.
Не хацелі вы жыць, як усе.
А інакш не выходзіла, пэўна.
І суседзі смяяліся ўслед:
«Бач, якая ідзе каралеўна».
Правінцыйны глухі гарадок.
Што маглі вы, шляхцянка-паэтка?
Вам прыпісвалі звад і сурок.
І мужчыны паглядвалі рэдка.
Хто знайшоў вашы вершы і як —
Пажаўцелыя стосы паперы,
Ваш нашчадак, далёкі сваяк
Ці чужынец у шэрым шынелі?
Ці чытаў перад тым, як спаліць?
Вочы Вашы глядзяць праз бязмежжа,
Як душа мая ў часе гарыць
І ўскрасае спалёныя вершы.

Маналог Маці Божай Вастрабрамскай

З драматычнай паэмы «Amor ardens»
(«Каханне палаючае»)

Дзеянне адбываецца ў Вільні ў 1916 годзе.

Я падарую вам каханне.
У гэтым свеце так сцюдзёна
Для чулых душаў, гэтак цёмна —
І я дарую вам каханне.
Яно — не квецень веснавая
І нават не на шчасце, можа.
Яно — агонь на раздарожжы,
Які ад ветру не схавае.
Яно — не ціхая лампада.

Яно наскрозь прапаліць сэрца.
Яно навечна застанецца,
Якія б ні спасціглі страты
На той зямлі, дзе так трывожна,
Дзе гоняць лепшых, злых баяцца,
Дзе не дае спажытку праца,
Дзе тое ёсць, што быць не можа,—
У час адчаю і чакання
Я падарую вам каханне.

* * *

Такі ёсць рыцарскі звычай, бязлітасны, як двабой:
Твая Чароўная Панна ніколі не будзе з табой.
Бо мусіць быць недасяжнай, халоднай, як чорны снег,
І ўзнагарода шчасліўцу — яе меладычны смех,
Калі з турнірнага поля, паслізгваючы ў крыві,
Ты ёй вянок пераможцы нясеш, амаль нежывы,
І не чакаеш нічога за раны свае, за боль.
І ведаеш, што ўладарыць магутны ёю кароль,
І мае яна каханкаў, і шляхам граху ідзе,
І ты не адзін, хто носіць яе імя на шчыце.
А недзе ў далёкім замку, у памяці на мяжы,
Цнатлівай і дабрадзейнай нявесце тваёй тужыць,
Што хоча зямнога шчасця, абдоймаў тваіх і слёз,
Што раны твае абмые і прыме такім, як ёсць,
Даруе, што толькі з левай — не з правай — рукі з табой
І што аднойчы загінеш ты дзеля жорсткай, другой,
Ды я, няўрымслівы рыцар, не дакараю цябе,
Таму што, напэўна, гінуць і варта дзеля яе,
Бязлітаснай і прыўкраснай...
І ў смерці сваёй пару
Прашэпчаш ты не «Юльяна»,
а «Панна мая, Беларусь...».

* * *

Безнадзейнасць... Страшнае слова...
Срэбны рыцар упаў з каня.

Вербы хіляць над ім галовы,
Плача дождж на сыходзе дня.
Па шчыце барабаняць кроплі,
Прапаўзае смела мураш...
Не падыме рыцар ніколі
Свой цяжкі баявы палаш...
А вароны сабе кружляюць,
І ніжэй усё, і ніжэй...
І грамнічную свечку паліць
Тая, што за ўсё даражэй...
І тваё адступае войска,
І зямля твая — у агні.
Свечка плача гарачым воскам,
Ды не бачыш ты з вышыні.

Леся Украінка

...Вітаю ясны край, дзе я бывала,
І дзён калісьці правяла нямала,
А шчасця ні хвіліны не спазнала...

Леся Украінка

Бераг мора вясну вітае.
Квецень вішняў. Эдэм сухотных.
І вішнёвы сок праступае
Гэтак часта на вуснах родных.
У кавярні ад гукаў цесна,
Набягаюць хвалямі гукі.
І на плеценых ручках крэслаў,
Як празрыстыя, вашы рукі.
Паглынае пясчаны бераг
Слёзы-вішні майго кахання...
Я ж для вас — ці сястра па веры,
Ці хаўрусніца па змаганню.
Ну зірніце! Ці ж я — пачвара?
Ці на шчасце правоў не маю?
О мужчыны, адданцы мараў,
Вы — забойцы жанчын адданых.
Разумею я ўсё: ахвярнасць,

Гераізм і святую мэту...
Толькі ўбачце ж ва мне, упарты,
Вы жанчыну, а не паэтку.
Зразумейце: сама я — вішня
Пад абцасам вашым няўважным...
Вось — барвовая пляма...
Цішэй...
Сок вішнёвы... Гэта не страшна.
Як душа, аблятае квецень,
Філіжанку рука губляе.
І прысела за столік трэцяй
Госця, што ад болю збаўляе.
Аднаго з нас Дадому просіць,
У свой свет, дзе няма бяздомных.
...Крым і мора. Плач безгалосы.
Квецень вішняў. Эдэм сухотных.

Памяці паэта

За чырвонай шторай
дагарае свечка.
Ціха свішча вецер,
бы катрынка грае.
Сем цвікоў забітых
у цяжкое вечка,
Быццам сем прыступак
трэснула да раю.
Пачакай, не трэба
раніць гэты аркуш
Горкімі радкамі,
што жыццё атруцяць.
Прамяняй на волю,
прамяняй на чарку
Гэтых слоў атруту —
іх не прымуць людзі.
За чырвонай шторай
нізка цень схіліўся.
І дарэмна ў шыбы
стукаецца голле.
І са слоў крывавых

з горла дождж паліўся.
І аціхла ў жаху
наша наваколле.

Сад папяровы

Кнігаўка — дзіўная беларуская птушка, якой Бог забараніў піць з возера ці рэчкі, але толькі лавіць дажджавыя кроплі або збіраць расу з камянёў і травы... Кнігі, што наталяюць смагу, гэтак жа рэдкія, як кроплі на камянях. Яны не належаць да стракатых хваляў кніжнага тавару.

Кажуць, што кніга, якую ніколі не захочуць спаліць,— не вартая вечнасці.

Калісьці палілі Святое Пісанне, выдадзенае Францішкам Скарынай, бо друкаваныя кнігі лічыліся нечым падазроным, у адрозненне ад правераных, рукапісных.

Сённяшнія камп'ютэрныя кнігі — гэта ўжо бязважкі попел на віхурах часу.

Самым вядомым у гісторыі літаратуры кніжным гандляром быў, бадай, Герман Гесэ. Чалавек, які гадаваўся сярод кніг, жыў сярод іх, можна сказаць, «сілкаваўся» імі. Ахвяра «кніжнага комплексу» і стваральнік «Кніжнага чалавека», што не мае ўласнага твару.

Напрыканцы дваццатага стагоддзя расейскі канцэптуальны літаратар Аляксей Цвяткоў стварыў «Забівацеля кніг», які расчляняе вокладкі і свідруе літары да нерваў.

Ператварэнне кніг у звычайны тавар — ці не ёсць інстынктыўнай спробай чалавецтва зменшыць іх містычны ўплыў на свядомасць? Тое, што можа быць куплена, шматкроць паўторана, страчвае сваю таемную ўладу.

У кнігарню прыходзіш зусім з іншым пачуццём, чым у бібліятэку. Хаця і там, і там прысутнічае азарт паляўнічага. Праўдзівы Кніжны чалавек свята верыць, што дзесьці на пыльных паліцах, у самым далёкім кутку хаваецца тая самая Кніга, якую ён шукае ўсё жыццё...

Але трыумф бібліятэчнага чытача — гэта часовы трыумф забойцы. Ён павінен за адведзены бібліятэчнымі правіламі тэрмін дастаць душу кнігі і назаўсёды прыўлашчыць, высмактаць са старонак, падобна вампіру, духоўную энергію і

вярнуць назад пустую абалонку... Якая для наступнага спажывальніка зноў напоўніцца крывёй — мудрасцю... Ці эрзацам эмоцый, якія дазволяць чытачу ашчаджаць уласныя.

У кнігарню прыходзіць не чытач, а пакупнік. Бібліятэчны чытач падобны да аматара фліртаў, пакупнік — прыхільнік шлюбу. Кніґа, якую ён набудзе, застанецца з ім... Ад кніг не так лёгка пазбавіцца, нават калі яны нелюбімыя,— выкінуць шкада, падарыць ужываную няёмка... Бібліятэчны чытач можа рызыкаваць і браць кнігі наўгад. Пакупнік выбірае напэўна. Тое, што патрэбнае.

Вітрыны кнігарняў больш, чым паліцы бібліятэк, адлюстроўваюць ментальнасць нацыі. Парады гаспадынькам і гісторыя халоднай зброі з шыкоўнымі ілюстрацыямі, уперамежку абрады чорнай магіі і рэцэпты праваслаўнай кухні, беларускамоўная літаратура ў куточку...

Самыя цудоўныя кнігарні — букіністычныя. А ў іх я найбольш люблю антыкварны аддзел. Часам удаецца знайсці кнігі, якія доўга не куплялі, і прызначаная цана за гэты час зрабілася зусім невялікай. У гэтым таксама выпадак і рызыка — невядома, што патрапіш набыць.

Новыя, толькі што з друкарні кнігі для мяне маюць адчужаны выгляд. Яны нібыта апранутыя для свецкага візіту. А я люблю камерныя гаворкі. Старая кніга захоўвае памяць пра ўсіх тых, хто дакранаўся да яе, схіляўся над ейнымі старонкамі. Яна з'ядноўвае ў адным коле былых і цяперашніх чытачоў і кожнаму перадае эмоцыі папярэднікаў. Сучаснае перавыданне, нават рэпрынтнае, ніколі не дасць таго ўражання, тых адценняў успрыняцця, што Старая Кніга.

Яшчэ большую каштоўнасць, чым тэкст, у Старой Кнізе маюць маргіналіі, аскалёпкі люстэрка эпохі. Напрыклад, на шмуцтытуле набытага ў «Вянку», у Траецкім прадмесці, падручніка агульнай геаграфіі 1907 года штамп аптэкарскай крамы і неахайныя запісы алоўкам не вельмі абазнанага гімназіста, кшталту «Мефология — различная сказания», «Релефт — неровность земли», «Скомпрометировать — значит — объясниться в любви».

З Вільні я прывезла том дадаткаў да часопіса «Ніва» 1913 года выдання. Неразборлівы экслібрыс прыватнай бібліятэкі, побач — пячатка перасоўнага фонду Ленінградскага Дома мастацтваў. У артыкуле «Дарагавізна жыцця» адзначаецца, што

драматург Астроўскі за свае цудоўныя творы атрымліваў па 25 рублёў за аркуш...

У расейскіх фантастаў братоў Стругацкіх ёсць такія персанажы — мудрыя мутанты-макрацы, якія рыхтуюць Апакаліпсіс і пераўтварэнне свету. Макрацы харчуюцца чытаннем. Без кніг яны паміраюць ад голаду. Праўда, яны лысыя, слізкія і да таго ж імпатэнты.

Побач з кнігарняй, што ля нашага дома, сціплага выгляду кабета спрабуе прадаць мне вялікую, у цвёрдай бліскучай вокладцы рускамоўную дзіцячую кнігу. Аказваецца, кабета — аўтар гэтай кнігі. Доўга рэкламуе свой тавар, збаўляе цану... Я не купляю. Мне страшна, нібыта перад крывым люстэркам.

Алюзіі

1. Высокая літаратура

Лаўравы ліст,
дастаткова засохлы і хрусткі,
Бронзавы ключ, відавочна мастацкай работы,
Што адчыняў — невядома.
Высокай натуры
Гэта прыдасца...
Кавалачак высахлых сотаў,
Месячны промень,
абрывак калючага дроту —
Гэта, панове,
высокая літаратура.
Пэўна ж, рэцэпт дасканалы.
Галінка агрэсту,
Фігавы лісцік ад першай мадэлі Адама,
Два паламаныя алоўкі,
чыясь тэлеграма
З доўгім шматкроп'ем замест шараговага тэксту,
Трохі тугі па нязбытным.
Пяро херувіма,
Усведамленне сваёй непатрэбнасці.
Бура
У крышталёвае шклянцы.
Дзве порцыі дыму —

Ад цыгарэт і спаленага гунамі Рыма —
Гэта, панове,
высокая літаратура.
Трохі крыві ад уласнага сэрца.
Атрута,
Што выдзяляе гніючае цела натхнення.
Рогат нармальнага дурня.
Бутэлька аблуды.
І папяровыя крылы твайго пакалення.
І Апалонам садраная з Марсія скура —
Гэта, панове,
высокая літаратура.

2. Аліса

Дзяўчынка ў карунках
спявае анёльскую песню.
Стракозы над рэчкаю крэсляць арабскія лічбы.
А човен плыве.
І раўнюткую лінію крэсліць.
І ў хвалях люструюцца
дрэвы, карункі і німбы.
Дзяўчынка ў карунках
і пастар у чорным касцюме.
Над імі стракозы, аблокі
і вокны ў Засвецце.
Сціскаецца час і расцягваецца,
як гума,
І ў свет за люстэркам
знікае карункавы вецер.
Дзяўчынка ўтаропіла ў неба блакітныя вочы.
Яна не патрапіць ніколі на баль каралевы.
А пастар у чорным
паверыць у гэта не хоча,
Вяслом разбіваючы
німбы на хвалях і дрэвы.
Дзяўчынка падзякуе за незвычайную казку,
З люстэрка асыплецца выцвілы слой амальгамы.
І што нашы казкі,
алюзіі, німбы і маскі
Прад яснай вітрынаю галантарэйнае крамы.

Дзве ручкі ў пальчатках
пакручваюць сон-парасонік,
Стракозы мільгаюць, як феі.
Пейзаж пастаральны.
І белым пылком
безнадзейнасць асыпала скроні.
У шлях праз люстэрка, паэце.
У шлях развітальны.

3. Замак Эшэр

Мой замак патанае.
Па сцяне
Расколіна прабегла, як маланка.
Ён для мяне надзейным быў прыстанкам,
Каб паміраць наяве,
жыць у сне.
Загаслі ўсе лампады.
Кажаны
У вітражы запыленыя б'юцца.
І промні дня ў расколіны ліюцца,
Знішчаючы ілюзіі і сны.
Гляджу — у першы і апошні раз —
Пры асвятленні дзённым на пакоі.
Іржа на ланцугах, іржа на зброі,
І там не дыямент блішчыць, а страз.
О, колькі пылу!
Мёртвых матылёў,
Аплыўшых свечак,
павуты і друзу!
Я тут жыла, прымала фей і музаў,
Памерлых каралеў і каралёў...
Кідаюцца пад ногі пацукі.
Яны вішчаць, як вязні Тарквемады.
І возера ўваходзіць вадаспадам
Праз вокны, што зачынены вякі...
Што ж, прызнаю паразу...
Гэты свет
Трымаўся на святле трапяткім свечак,
Што пакідала ад істот і рэчаў
Бязважкі вытанчаны сілуэт.

Навошта ж мне трымацца за жыццё,
Бязлітаснае ў плоцевасці грубай?
Расколіны ўсё большаюць.
І кубак
Напоўнены марэннем і асцём.

4. Парцэлянавая пастушка

На каміннае паліцы
так высока, так спакойна.
Мерна тахкае гадзіннік,
пыл кладзецца на падлогу.
Не шапчы, што ў іншым свеце
свежы вецер, светла, зорна.
Не шапчы, што на паліцы
не спазнаць сябе, ні Бога.
Парцэлянавае цела
разбіваецца так лёгка
Разам з лялечнай красою
і маленькім нашым шчасцем.
І ў аповедзе жыццёвым
застануцца, як апостраф,—
Нат не літара, не слова –-
выбітныя нашы страсці.
І таму — куды спяшацца!
Ціха дзынькае званочак
Музыкальнага куфэрка,
дзе захоўваюцца зоркі.
А інакшых не пабачаць
парцэлянавыя вочы.
І чаго ты, камінар мой,
плачаш горка, гэтак горка?
Ад таго, што недзе — вецер,
недзе — месяц, недзе — воля?
Ад таго, што, як ні пніся
быць найпершым над другімі,
А рукі дзіцячай дотык выпадковы —
і не болей —
І асколкі на падлозе,
а душа, як пыл, над імі.

5. Крошка Цахес

Прычэсвае фея маленькага злога калеку
(Адорваюць феі заўсёды маленькіх і злых).
Няшчасны карузлік, асуджаны лёсам на здзекі,
Цяпер ператворыцца
ў талентаў змесцішча ўсіх.
Чужых, не сваіх, зразумела.
А справа якая
Натоўпу, які пакланяцца кароне прывык?
І моўчкі паэт пажаўцелыя сшыткі гартае,
І моўчкі хавае ў шуфляду,
бы ў склеп, чарнавік.
Маленькі карузлік
здаецца прыгожым і дужым.
Уладай надзелены —
мае і вартасці ўсе.

Красуні свой гонар яму прапануюць,
як ружы.
Нашто яму ружы —
ён душы, як цукар, грызе.
А толькі пакіне яго дабрадатная фея —
Імгненна затопчуць,
у вазе патопяць начной.
І зноўку паэт перагортвае аркуш надзеі,
І пырскае новы карузлік на троне сліной.
І фея ўсё тая ж
пачвары расчэсвае космы
І верыць, што ўлада надзеліць яго дабрынёй.
Ніколі не скончыцца гэтая метамарфоза.
І можа, паэт і карузлік зліваюцца ў ёй.
Ніколі на троне паэт не застаўся паэтам.
Ніколі на троне карузлік
не выпрастаў горб.
Але распрасцёрты ля колаў бліскучай карэты,
Адны залатыя пантофлі і бачыць натоўп.

Шчаслівая

Ці Цэзар, ці ніхто... Чакаць зацята.
Фіранкі непразрыстыя завесіць.
І сыпаць у камін сухую мяту,
І ля вагню пісаць, пісаць і крэсліць...
І ўсё чакаць. Ці Цэзар, ці самота.
А прыйдзе ён — стары, знямоглы, брудны.
Ён толькі што з каня. Ён піў з балота.
І час на лбе яго накрэсліў руны.
Ён зойме ложа, крытае вісонам,
Не для кахання — выспацца з дарогі.
І раніцою рушыць легіёны
Да новай легендарнай перамогі.
Падымеш перакуленыя вазы,
Дап'еш віно з яго пустога кубка,
Завесіш вокны, перамысліш фразы
І да агменю зноў працягнеш рукі.
Ці Цэзар, ці ніхто. Няхай мястэчка
Вірує ад неверагодных плётак.
Ты нешта зноўку пішаш кожны вечар
І зноў на вуснах адчуваеш дотык.
А побач — шчасце са штодзённым супам
І пацалункам, звыклым, быццам грошы.
А ты ў самотным доме шэпчаш: «Любы...»
А хто — ні ўспомніць, ні ўявіць не можаш.

У чаканні героя

Дап'еш віно з яго пустога кубка...
З верша «Шчаслівая»

Цэзар пакінуў мне келіх пусты.
Больш аніякіх ён рук не кранецца.
Спіны свае выгінаюць масты
Коткамі дзікімі... Кроіцца сэрца.
Толькі не трэба сябе дакараць.
Цэзар заўсёды сыходзіць у славу.
Кросны парыпваюць, быццам кара
Райскага дрэва пад рымскім кінжалам.
Тчы — забывайся, праводзячы ніць

У лабірынты асновы — пра зоры,
Храмы, дзе можна пра гора забыць,
Мора, якое з табою гаворыць
Мовай гамераўскіх строф... Не табе
На мармуровай падлозе раскладваць
Мапы шляхоў піфагоравых сфер,
Ладзіць прыступкі да славы і ўлады.
Ты — у чаканні героя... Таму
Тчы дыванок яго крокам стамлёным.
І паспрабуй патлумачыць яму,
Скуль ты ўзяла столькі барвы для воўны.

Імпрэсія

...Патрапіць у парыжскую газету,
пад вустрыцу з лімонам прачытаць...
І просіцца да рыфмы цыгарэта,
вядома, з залачоным абадком
і прысмакам ментолу...
Цьху... Ніколі
табак і мяту ў водар не з'яднаць.
Тым больш без рыфмы прамаўляць жадаю.
І не куру.
Парыжская газета,
абавязкова белы капялюш,
кавярні крэсла белае таксама,
і сіні-сіні на стале абрус
падкрэслівае тонкасць філіжанкі.
А як жа кава? Кавы я не п'ю,
але карціна вымагае кавы.
Хай гэта будзе вадкі шакалад,
гарачы і густы... Але самота —
самота — у Парыжы? Божа мой,
ці варта турбаваць тады ўяўленне?
Насупраць — за сталом — вядома, Ён.
Чытае моўчкі... Курчыцца газета
ў руках, што звыклі шанец свой лавіць
за дужае крыло ці за капыта —
якое ўжо аблічча прыме Ён.
Дыміцца кава. Шаргаціць газета.

«Віншую. Ты ў зеніце».
І пайшоў,
як вустрыца, халодны і закрыты.
І плашч ягоны колеру пяску
мне нагадаў бязлітасную пустку.
Ну што, дамроілася? На стале
мігціць у крышталёвым кубку свечка,
нібы на беларускія Дзяды.
Нябожчык ёсць — гармонія памерла.
Скамечаны газетны шар ляжыць
у сумачцы са скуры ведзьмака,
які мне нагадаў маю дарогу.
Нікому анічога не кажы,
я не вярнулася з парыжскае кавярні.
Калі не верыш — пачытай газеты.

* * *

Калі пішуцца вершы, то можна ўміраць паступова,
Смерць па кроплі смакуючы, быццам бы мёд і цыкуту.
І вітацца з аднымі крыжамі, і верыць у слова,
І забыцца на тое, што кроў твая стала атрутай.
Калі пішуцца вершы, то можна не лгаць пра адзінства
Між сабою і кожнай быдлячай асобай на свеце.
Як інфанта Веласкеса, выйсці за межы карціны.
І пабачыць дэталі, не будзе якіх на партрэце.
Калі пішуцца вершы, то можна — пра крылы і волю,
Не саромецца пафасу.
Быць і апошнім, і першым...
Не ілгаць, не ілгаць...
Божа мой, як спакусна, як поўна,
Калі пішуцца вершы...
А яны ўсё не пішуцца, вершы...

Да пытання «чыстае красы»

Перацякае срэбны век
У кулю — і цаляе ў сэрца.
Красы шукае чалавек —
І ваўкалакам застаецца.
Сыходзіць чыстая краса

Не да красы, а да пакуты,
Да зморшчын, у якіх сляза
Блішчыць, як кропелька атруты.
Навошта гэты прывід мне?
Уласны век лічыць звыродствам?
А нават ценем мільгане —
Жыць без яе — самазабойства.
Жыць — і не бачыць, як яна
Цвіце валошкамі Айчыны...
І век сплывае, бы труна,
За той красою немагчымай.

Гамлет

Каралева мая, ты згубіла сваю чысціню.
Ад чаго ж тваё цела заззяла, як белая поўня?
Я не Гамлет даўно, я ніколі цябе не прысню
І атруту ў віне каралеўскім барвовым не помню.
Ты смяешся, шчаслівая, і не спазнаеш, чаму
Звар'яцелы твой прынц над магілай блазенскаю кленчыць.
І ніколі, ніколі кароны не бачыць яму,
Бо вар'яту карона, каханне й любоў недарэчы.
Не заб'е ён нікога, ніколі не скажа: «Ці быць?»
Ён бясконцую з прывідам весці гаворку павінны.
Каралева мая можа вольна забойцу любіць,
І з яе чаравікаў магільная выцерта гліна.

* * *

Быць выключным — якая спакусная роля.
І якая страшэнная доля — выключнасць.
...Ты прыйшоў да Радзімы, наіўны да болю,
І на твары яе снег убачыў сляпучы.
А жыццё адбірала твае спадзяванні,
Ты вучыўся любіць — і не мог навучыцца.
Нітку лёсу заблыталі строгія Паркі,
І яна не падобная да бліскавіцы.
Ты ў сабе адчуваў агнявую ахвярнасць,

Ты сябе ашукаў. Ты не здолеў нічога.
Жоўкнуць кнігі, што ты напісаў у юнацтве,
Быццам кветкі — у храме паганскага бога.
І зямля не адтала, і неба пустое,
Як ні біся, ні радуйся славе халоднай.
І прызнацца няможна і перад сабою,
Што не дадзена сэрцу іскрынкі ніводнай.

* * *

І без мяне ўспаўзе на помнік смоўж,
І без мяне праб'е травінка глебу.
І купяць славы на ламаны грош
Усе, хто зажадае ўзняцца ў неба.
Што я змяню — пад колы мітусні
Шпурляючы ўсё словы, словы, словы...
Матыль, як верш, злятае з далані,
Пылок прыліп да пальцаў каляровы.
І ўсё-ткі — нельга жыць, калі няма
Наіўнай веры: без цябе — не будзе
Смоўж успаўзаць наверх, расці трава,
І нашы кнігі прачытаюць людзі.
І што з таго, што не было карон,
І што з таго, што ўсе вянкі сплывалі,
І смоўж паўзе на апусцелы трон,
І вершы з горкім дымам пазляталі.

www.kamunikat.org

Майрынк

1

Васковы пісьменнік блукае па вуліцах Прагі.
Драўляныя вусны дзвярэй падціскаюць дамы.
І знічкі, як жоўтыя п'яўкі, спаўзаюць на дахі
З кардоннага неба, сырога ад доўгай зімы.
Пад дахамі дрэмлюць жаўнеры і жонкі жаўнераў,
Жаўнерыкі-дзеці гуляюць і ў снах у вайну.
Іх шчасце маленькае шчыльна ахоўваюць дзверы,
І капае воск на праданую ўчора труну.
Маўчаць сутарэнні, набітыя косткамі мніхаў.
У скрынцы грашовай ля храма накіданы друз.
Васковыя рукі да неба ўздымаюцца ціха,
А ў небе кардонным прарваўся і свеціцца круг.
Як ціха...
Уночы ніхто не надумаў маліцца,
Спяваць пра каханне, шаптаць вершаваныя сны...
Спяць месцічы крэпка ў мундзірах сваіх камяніцаў,
Васковыя кроплі на бруку не ўбачаць яны.

2

Зялёная карэта — фурман хавае твар,
Між ліхтароў па бруку грукочуць глуха колы.
Апалавыя вочы нябожчыка цара
Глядзяць з вакна карэты, як носяць сны анёлы.
А вось з гатычнай вежы празрыстая жанчына,
Падобная да свечкі, плыве...
На вуснах — воцат...
І прыцемным завулкам
Галем ідзе на рынак,
Для раві Бецалеля купіць тры фунты сонца.

Танатас

Танатас двойчы Лету перайшоў.
Бог смерці — ён аднойчы смерці здрадзіў

І разарваў хітона чорны шоўк
І кроў з далоняў змыў у вадаспадзе.
Чаму ён — тут, дзе цемра і пясок
І ў брудным Стыксе гарлапаняць жабы,
Дзе высыхае вінаградны сок
І трацяць цені прыгажунь завабы?
І вось пад цяжкаю нагой — трава,
Аліваў шапаценне, смех дзіцячы...
І... сонца! Як аслеплая сава,
Танатас толькі яркі промень бачыў.
Каб ён не богам быў — відаць, аслеп.
Але туман ружовы разамгліўся,
І бог убачыў: неба — сіні склеп
І вусені з аліў аб'елі лісце.
А людзі аднаго адзін клянуць,
А людзі прадаюць людзей, як рэчы,
І песні непрыстойныя пяюць,
І перад кожным, хто мацнейшы, кленчаць.
Іх думкі, не кранутыя журбой,
Кароткія і злыя... Іх каханне —
Адна пажаднасць... З прагнасцю сляпой
Яны жыццё марнуюць і паганяць.
І застагнаў Танатас, і закрыў
Рукою бледнай стомленыя вочы.
Не разабраць, дзе людзі, дзе звяры.
І толькі смерць ачысціць іх, як хоча.
І прэч пайшоў маркотны цёмны бог,
У свой сусвет бясплённых шкадаванняў.
І сыпаліся з-пад ягоных ног
Сухія кветкі на сухія камні.
...Танатас двойчы Лету перайшоў.

Яхідна

Прыгажуню Яхідну багі-алімпійцы пакаралі
за яе недаступнасць і непавагу да іх,
ператварыўшы ў пачвару —
напалову змяю, напалову жанчыну...

У бездані былая прыгажосць

Так хутка, хутка робіцца пачварнай...
Чаго маўчыш, мой нечаканы госць?
Не пра такую ты багіню марыў?
Тут цёмны свет пячоры і вада,
Што капае з прамежкам неадменным...
І хвост змяіны — алімпійцаў дар —
Хавае прыгажуня між каменняў.
За незалежнасць помсцяць нам багі
Калецтвам і бяздоннем, людзі — плёткай...
І Стыкса спалучае берагі
Не шлях ладдзі — паклон раба таропкі.
Ды як скарацца цемры можа той,
Хто ведае: яна — і на Алімпе,
І ў водбліску кароны залатой,
І ў купленым у ювеліра німбе.
І што багоў бяздушных жорсткі суд
Таму, хто паміраць і жыць не можа,
Бо ісціна — адна, яна — не тут,
Яна яшчэ калісьці пераможа.
Бліжэй да Змеядзевы, чалавек.
Вачэй маіх не зменшыліся чары.
І выпі горкі яд падземных рэк
З ружовых вуснаў пакаранай мары.

Кніжнік

Я захаваю кнігі ад агню,
Ад плесні і ад позіркаў гандлярскіх.
Хто кажа, што нічога не змяню
У гэтым свеце?
Трэба жыць па-царску —
Збірацца ўратаваць няшчасны свет
І грошы аддаваць прарокам божым...
І кнігі запаўняюць кабінет...
Акрым мяне — хто слову дапаможа?
З гарышчаў, з дробных крамаў, з-пад руін
Я чую стогны рэдкіх старадрукаў.
І я іду да іх, і я — адзін,
І дождж ліе ў працягнутыя рукі.
Дзівак, вар'ят ці марнатраўца — мне

Не рупіць, як пашэпчуцца суседзі.
Паліцы кніг на выцвілай сцяне
І бессмяротнасць — беларускім дзецям.
Мне кажуць, што нічога не змяню
І будзе вечнасць для мяне туманам.
Я захаваю кнігі ад агню,
Імя ж сваё — і ратаваць не стану.

Пакаленне

Паніжэла наша вышыня.
Дзень не здзейсніў ні адной надзеі.
Срэбны рыцар прытрымаў каня,
І з анёлаў пер'е абляцела.
Як прыгожа гаварылі мы!
Як мы ганарыліся сабою!
Што цяпер наперадзе? Тамы
Вершаў, што не выдадуць ніколі.
Хтосьці аказаўся стукачом,
Хтосьці зараз крамнік, хтось палітык.
Ну а вершы прыкрашаюць дом
І блішчаць прад людам паспалітым.
Беларусь, крыжы ды Беларусь...
Бы ў адной хрысціліся купелі...
Маладосці лёгкі землятрус —
І з анёлаў пер'е абляцела.
Пакаленне лірнікаў блатных,
Сумесь Караткевіча і Ніцшэ...
Хтось бліжэй — да злосных і п'яных,
Хтось — да тых, што «прэміяльна» пішуць.
Цынікі... Святыя... Божа мой,
Колькі раз сябе мы не пазнаем,
Шлях звянчаўшы тронам ці турмой...
Пішам, пішам, пішам... Не чытаем.

Паэт Неронавай эпохі

Род Юліяў закончаны даўно,
І цэзар — той, хто купіць волю плебса.

Што тут — паэт? Як новае віно
Ў старых мяхах — мутнее і псуецца.
Калі на сцэне цэзар-кіфарэд —
Будзь ты Гамерам — не здабудзеш славы.
Таму — налі фалернскага, сусед,
У кубкі на развалінах дзяржавы.
Сенатары то спяць, то зноў равуць
І топяць аднаго адзін прыгожа.
А што — паэты тут? Паэты — п'юць.
Ці паміраюць — той, хто піць не можа.
Юпітэр! Перад мармурам тваім
Віна пралью... бо Апалон — бяссілы.
У вершах цэзар праслаўляе Рым
Узнёсла, аж да вогненнай магілы.

* * *

Што — словы? Тут не чуюць нават плач.
Шпурляй марэнні ветру наўздагонку.
Навошта ты збіраеш зоры ў гронкі?
Іх паасобку кожную пабач.

Халодны, непакорлівы Сусвет
Не хоча ў вершы цесныя змяшчацца.
Дурная, бескарыслівая праца.
Ты зноў сядзіш на ўзбочыне, паэт.

* * *

І нас забудуць непапраўна рана,
Як мы забылі — так забудуць нас.
Наш след зямны загасіцца, як рана,
Як гасне слуцкі залаты паяс.
Не затрымацца ні радком, ні вершам.
Парсуна страціць колер і імя.
Хто быў апошнім — той не стане першым,
А першага — таксама з'есць зямля.
І я таму над пыльнай кнігай слепну,
І падымаю камні на кладах,

І разбіраю тонкі почырк неба
Па лісцем зацярушаных слядах.
Я Памяці служу, як служаць храму.
Між мною і мінуўшчынай — не тло,
А лёгкі дождж і агароджа брамы —
Архангела празрыстае крыло.
І, можа, я таксама — толькі кніга
З лістамі, недаступнымі дажджу.
Няхай маё імя забудуць звыкла,
Я буду жыць у тым, што запішу.

Сад золата

У старасвецкай Беларусі рынкавая плошча раздзяляла касцёл, царкву і сінагогу — і адначасна аб'ядноўвала іх. На кірмаш прыходзілі ўсе. Для гандлю няма межаў. Мусіць, таму ў савецкай дзяржаве ён быў манапалізаваны да ідыятызму. Першыя фарцоўшчыкі адначасна былі й дысідэнтамі.

Рынак — сэрца горада, якое гоніць залатую кроў па артэрыях вуліц і завулкаў, забяспечвае паступленне свежага прытоку з прадмесцяў і далёкіх краін. Месца абмену таварам і інфармацыяй. Навіны з усяго свету збіраюцца тут, на рынку.

Але як часта рыначная плошча мяняла і сам свой воблік. Захопнікі ператваралі яе ў месца публічных пакаранняў. Інквізітары палілі ведзьмакоў і крамольныя кнігі. Падчас эпідэмій туды ж сцягвалі трупы і яшчэ жывых хворых, раскладаючы абапал вогнішчы з лекавых зёлак. На рыначнай плошчы збіралі даверлівы люд прамоўцы розных перакананняў... І замест коней ды яблыкаў купляліся і прадаваліся жыццё і смерць, целы і душы.

Як у сэрцы адначасна пераганяецца і атручаная венозная, і свежая артэрыяльная кроў, так і на рынку сустракаюцца шчодрасць і сквапнасць, багацце і галеча, безабароннасць і бязлітаснасць. Нідзе, мабыць, няма такой цяжкай, матэрыяльна адчувальнай аўры, як на самым вялікім рынку.

Золата — гэта гандаль... Золата — гэта ўлада... Вужыны кароль мае на галаве залатую карону, цар ракаў Хабёр — залатыя клюшні і вочы...

Адным сваім пярсцёнкам — залатым — я заручылася з рэчкай Іслаччу, што ля колішняга Дома творчасці пісьменнікаў. Згубіла

яго ў халодных як лёд, празрыстых і імклівых хвалях, калі прапускала праз пальцы залаты пясок, шукаючы дробныя ракавінкі, падобныя да пялёсткаў. Другім пярсцёнкам — срэбным — заручылася з Кракавам... Застаўся недзе на бруку ля касцёла Святога Станіслава. Так, яшчэ можна ўспомніць трэці пярсцёнак — жалезны,— згублены ў аўдыторыі нашага універсітэта...

Шкада толькі залатога... Бо і сапраўды быў заручальны.

На месцы сённяшняй гандлёвай Камароўкі ў Менску некалі прасціраўся балоцісты Камароўскі выган. Менавіта там у 1910 годзе адбыўся (дакладней, мусіў адбыцца) першы на тутэйшай зямельцы палёт на аэраплане. Відовішча прыцягнула шматлікіх гледачоў, білеты раскупілі вокамгненна. Але браткі-беларусы ў чарговы раз «выявіліся»... Калі аэраплан быў гатовы ўзляцець, на лётнае поле выбегла бабулька з кадзілам і пачала хрысціць «нячыстую сілу». Натоўп кінуўся на самалёт. Дваіх «экзарцыстаў» забіла прапелерам. Але добрапрыстойнасць перамагла: машына, спароджаная чалавечай гардыняй, была паламаная, а ейны кіроўца, замежнік-гастралёр, збіты да паўсмерці. А не лётай, раз Бог крылаў не даў...

Нейкі час на другім паверсе Камароўкі прадавалі вясельныя ўборы. Быццам белыя прывіды мяшчукоўскага шчасця са штучнага турэцкага шоўку, свецяцца праз вокны развешаныя на металёвых распорках сукенкі, расшытыя аперэтачнымі блішчынкамі. Прыгадваю працы знаёмай па сустрэчы ў Берліне мастачкі Ханы Шоберг: стылізаваныя вясельныя сукенкі, прапітаныя бетонам, мёртва-белыя, кружацца ў мёртвым танцы ў гэткім жа бясколерным пакоі...

Дарэчы, штучны шоўк, здаецца, робяць з нафты... Чорнай нафты...

Прырода не гандлюе. Яна толькі мяняе жыццё на жыццё.

Найвялікшае зло цывілізацыі — ацэненасць. Пры гэтым кожная рэч, з'ява, істота набываюць канкрэтную вартасць і могуць параўноўвацца з іншымі. Хаця Гасподзь стварыў усё непаўторным, незаменным...

Але сам быў ацэнены і прададзены...

У нашым жыцці робіцца ўсё менш таго, што не можа быць куплена. Ці можа не быць куплена. І яно робіцца для большасці ўсё менш патрэбным.

Зямлю даследаваў гандаль. Новыя шляхі ў далёкія краіны адкрываў купец. Гіркі для ўзважвання, пояс з залатымі манетамі

і меч хаваліся пад ягоным падраным плашчом. Сёння наш бедны «чаўнок» хавае пад турэцкай курткай грэлкі і цэлафанавыя «каўбасы», напоўненыя спіртам, а пад спартовымі штанамі — патранташы цыгарэтных пачак, прыкручаных да голых ног скотчам.

«Бізнесмен» — усяго толькі ганаровы эўфемізм гандляра з ягоным спрадвечным «танней купіць — даражэй прадаць». Камсамольцы-рамантыкі шасцідзесятых спавядалі пагарду да матэрыяльнага дабрабыту і, адпаведна, гандлю. Іхныя дзеці, што абазвалі піянерскі гальштук «сялёдкай» і ўвішна перадражнівалі цмоканне генсека, з забароненых рэчаў зрабілі культ. Жуйкі і пластыкавыя пакеты з яркімі рэкламнымі малюнкамі паспрыялі падзенню камуністычнага рэжыму больш, чымся ўся дысідэнцкая літаратура. Гэтак жа, як шкляныя перлы і кішэнныя люстэркі канкістадораў заваявалі Амерыканскі кантынент не ў меншай ступені, чым іхнія ж стрэльбы і коні.

Прывезла з Польшчы суперкіч: тоўсценькае парцэлянавае немаўля ў вялізным чэпчыку мыецца ў стылізаваным пад алюміній вядры. Нічога больш кічавага не прыдумаеш! Дома рагаталі, разглядалі пакупку... Але толькі праз год выявіўся ейны сапраўдны сэнс: капілка. Пад пульхным азадкам парцэлянавага немаўляці, асаджаным у вядры, мусяць скаплівацца грошы, укінутыя праз спецыяльную шчыліну наверсе вядра. Дзеці гатовыя былі выкарыстаць скульптурку па прызначэнні, але яна разлічаная на металёвыя грошы. Таму кічавае немаўля сядзіць над горкай пфенігаў, цэнтаў, польскіх грошаў і савецкіх капеек.

Нашы продкі доўга не лічылі паперку за грошы. Патрабавалі расплочвацца манетамі.

У кожнага караля быў гандляр, які пазычаў каралю грошы. Здаецца, ніводзін кароль не аплочваў войны з уласнай кішэні. Калі адкінуць сантыменты і высокія матэрыі, прычынай усіх войнаў быў гандаль. І ён жа трымаў мір. Калі гэта выгадна.

Пані

Чаго ж ты плачаш,
кніжніца, дзівачка?
Хацела мнішкай стаць, ды расхацела.
Таму цяпер не абцяжарвай плачам
Зямное неспатоленае цела.

Не толькі Бог — твой гаспадар суровы,
Але і князь, які не любіць песень.
Часцей за вышываннем каляровым
Ты бавіш час у залачоных крэслах.
Ты гаспадыня?
Вось насмешка лёсу!
Вергілія чытала і Тацыта,
Стварала для сябе высокі востраў,
Цяпер з прыслугай сварышся сярдзіта.
Дзіця хварэе. Муж на паляванні.
І моль ляціць ад выцвілых кілімаў.
Аб чым ты плачаш? Аб зямным каханні?
Ці аб нябесным, што праходзіць міма?

Балада пра недаступную прыгажосць

Каралеўна старэе ў высокім палацы на выспе.
А была яна зоркай паўночнай, лілеяй далін.
След апошняе знічкі на даху залочаным высах,
І ўюнок не ўспаўзае на сцены з бліскучых цаглін.
Каралеўна старэе... Ніхто пад акном не спявае
Дзёрзкіх песень, спароджаных страсцю душы маладой.
На турнір не спяшаецца рыцар з далёкага краю,
І прыспушчаны сцяг не вянчае смяротны двабой.
Каралеўна ў адчаі люстэркі свае разбівае,
Б'е маўклівых прыслужніц за юную іх прыгажосць.
Той, хто зведаў над сэрцамі ўладу — другой не жадае.
Дзе ж пакінула скарбы кахання яе маладосць?
І, надзеўшы расшытыя вогненным золатам строі,
Дыяменты і перлы — хоць колісь блістала без іх —
Валадарка ў свае сутарэнні адправіла вояў,
Каб адтуль прывялі вязняў цемры, дагэтуль жывых.
У часы царавання юнацтва не раз каралеўна
Выпрабоўвала дзёрзкіх паклоннікаў смерцю, турмой.
І хапала шаленцаў, якіх не палохалі сцены,
Невідочныя сцены між тронам і жарсцю зямной.
Хай прыйдуць — і пабачаць сваё нечаканае шчасце.
Хай сагрэюць каханнем самотны багаты палац...
Прывялі аднаго.

Ён калісьці ўсе грошы растраціў,
Каб спагаду прыслужніц сваёй каралеўны купляць.
Як ірваўся юнак да амаль недаступнае мэты!
Ён, нязваны, прыйшоў і да ног гаспадыні прыпаў...
Нават схоплены — ёй усміхаўся аддана і светла
І падчас катавання адно пра каханне казаў...
А цяпер ён глядзіць так сурова, дакорліва гэтак...
— Вольным будзь! Мне служы, пра каханне сваё
раскажы...
Адмаўляецца ён:
— Я пракляты цяпер перад светам.
Больш за маці дзяўчыну любіў, што не мела душы.
Задрыжэлі жамчужыны на каралеўскай сукенцы,
Быццам зоры на срэбнай, міглівай паверхні вады.
Новы рыцар зайшоў...
Быў ён воем чужым, іншаверцам,
Ён адверг сваю волю, бо свет без кахання — пусты.

Як ахвотна калісьці сыходзіў у ноч сутарэнняў,
Толькі б ведаць, што побач — заваба яго і туга...
— Недарма ты пакутваў... Будзь вольны.
Будзь служка мой верны!
— Я пракляты... Я больш за Радзіму жанчыну кахаў...
Пацямнелі ад гневу цудоўныя ўладныя вочы.
Палавінкі карункавай хусткі ляглі на дыван...
Вось і трэці палоннік да Мары мінулага крочыць.
Самы дзёрзкі з усіх, на забойства пайшоў, на падман.
Ён — адзіны, хто змог у абдоймах каханую сціснуць,
Пацалунак сарваць з яе вуснаў — цаной у жыццё...
І цяпер пасміхаецца, як і раней, непахісны...
— Помніш тое імгненне і страсці смяротны касцёр?
— Я пракляты таму, што каханне над годнасцю ўзвысіў.
Што цяпер шкадаваць?
Усё роўна была — вышыня.
Мы старэем, каханая...
Нельга вярнуцца ў «калісьці».
Ты дарэмна прыдумала мару сабой падмяняць.
Недаступнасць была для красы непаўторнай аправай.
А любая жанчына каштуе жанчыны, павер.
Заставайся легендаю, песняй, цнатліваю казкай.
Мы старэем, каханая...

Трэба змірыцца з «цяпер»...
...У высокім палацы на выспе самотна заўсёды.
І гавораць, што хутка там будзе жаночы кляштар.
З чарапічнага даху змываюць дажджы пазалоту,
І лясы абступаюць шумлівай сцяною абшар.

Рыцарскі турнір

Раптоўны вецер і раптоўны дождж
На свята зла і гордасці зляцелі.
Страшны Пярун ударыў — і ніхто
Не змог парушыць скамяненне цела.
Але — прайшло, і сполахі прайшлі.
І зноў гарэлі грэшнай прагай вочы.
А самы моцны рыцар да зямлі
Прыпаў і крыкнуў: «Бог крыві не хоча!»
Ды бойку аніхто не прыпыняў,
Не кінула пальчатку каралева.
І дождж звінеў аб зброю, кроў змываў,
І ўсмоктвалі напой трава і дрэвы.
А рыцар меч, нібыта шчыт, узняў:
«Па волі Божай ворагам дарую!»
Якая ганьба! І на мне яна.
Яму ж дарыла стужку залатую.
Маё імя хацеў ён праслаўляць,
І біцца, і перамагчы — ці ўмерці.
Хіба псалмы паслала я спяваць
Паклонніка, раптоўнага, як вецер?
Ну, забівай жа! Звар'яцеў, ці што?
А ён укленчыў і крычаў пра Бога.
І сціснулі яго паміж шчытоў,
І тры мячы знайшлі сабе дарогу.
А дождж мацнеў, і вецер біў у твар.
І хмары быццам пахавалі сонца.
І не відаць было, дзе чый штандар,
Хто пераможаны, хто пераможца.
І разышоўся паступова люд,
Ахвочы да відовішчаў жахлівых.
І шмат каго страчаў нябесны суд,
А шмат каго — шынок і куфаль піва.

Хто мужнасць меў не забіваць — герой
Ці не? Цяпер мне думка назаляе.
І бліскае раз-пораз нада мной
Замест маланкі — стужка залатая.

* * *

Паўстане з хваляў часу Авалон,
Праб'е на вежы замкавы гадзіннік.
Сівы кароль парушыць доўгі сон,
Змахне пальчаткай з твару павуцінне.
І будзе ўсё, што зоры прадраклі.
Зноў рыцарам царыць у гэтым свеце.
Настане справядлівасць на зямлі,
Маленькай, недагледжанай планеце.
Кароль уздыме рыцараў сваіх,
І подлы люд змяшаецца з гразёю.
Але няма між выбраных — дваіх,
Дзе каралева і найлепшы з вояў?
Таемнай жарсці грэшнай у палон
Яны калісьці трапілі навечна.
Не ўстануць да жыцця
На іх праклён,
І больш ніхто іх еднасць не аспрэчыць.
А як любіў кароль чароўны бляск
Яе вачэй і ціхую пяшчоту
Яе далоняў... Быццам першы раз,
Узрушваў кожны самы лёгкі дотык...
Але — не мог яе не асудзіць
Ён, хто закон і помсту ўвасабляе.
І засталася ў прывідным жыцці
Яна, бясплотны цень...
Але — кахае,
Кахае — не яго...
Навошта — суд,
Які не можа шчасця даць нікому?
Навошта жыць, калі яна — не тут
І нельга не аддаць яе другому?
І выпусціць кароль іржавы меч,
І счэпіць на грудзях знямогла рукі.

І мантыя спаўзе з шырокіх плеч,
Суцішацца ўсе колеры і гукі.
У цемру зноў сыходзіць Авалон,
І засынаюць рыцары і коні.
І не парушыць болей іхні сон
Ніякаю малітвай аніколі.

Рыцар

З мячом — за даму, за караля.
З мячом — за Бога, за грошы.
І толькі раны калі баляць,
Што ўстаць, здаецца, не зможаш,—
Ты марыш пра ціхі кляштар,
Пра пыльныя старадрукі.
І твой славуты жалезны ўдар
Не бачыцца больш заслугай.
А ўстанеш — зноў на бліскучы шлем
Пальчатку чэпіш дурніцы,
Якая цябе называе «леў»
І ходзіць ў касцёл маліцца.
На шыі — ладанка, а ў мячы —
Часцінка Крыжа Хрыстова.
Нібыта Бог забіваць вучыў,
А ў сэрцы — ужо нічога.

* * *

Такі спакой —
                што лепей бы забілі.
Такое шчасце —
                хоць ты ім гандлюй.
Спіць замак мой у цішыні і пыле,
Цень, як мярцвяк, кладзецца на зямлю.
Стары герольд, пясняр віна і дамы,
Не памятае ўжо апошні баль.
І фрэсак напаўсцёртых гаснуць плямы,
І не гуляе з промнямі крышталь.
Гляджу, гляджу праз вузкае вакенца —

Адзін і той абрыдлы краявід.
І толькі дождж аб мур упарта б'ецца
Патокамі празрыстае крыві.
І будзе мне штоночы сніцца вершнік,
І зноў я прачынаюся ад слёз.
І кожны дзень з высокай ціхай вежы
Гляджу я на дарогу, як на лёс.

Сёмая жонка, альбо Сон стамлёнай гараджанкі

Пасля вянчання ад царквы
Да замка ехалі па кветках,
Пазалачаных і жывых,
Што кідалі сялянаў дзеткі.
Перад варотамі — кілім
Каля карэты рассцялілі,
Мой князь сышоў — і перад ім
Усе галовы нахілілі.
«Хадзем, вянчаная мая!
Прымі ўладанне над маёнткам!»
І блазан, пруткі, як змяя,
Вакол мяне скакаў з бразготкай.
І слугі цалавалі мне
Хто след, хто шлейф, хто чаравікі.
Ніхто ж у вочы — не зірне,
І кожны — быццам без'языкі.
А князь сціскаў маю руку —
Пярсцёнкі аж кусалі пальцы.
Ён паказаў мне кожны кут
У залатым сваім палацы,
Парсуны продкаў — каралёў,
Гасцёўні для паноў вяльможных
І ў вежу кутнюю прывёў,
Каб паказаць пакой апошні.
Раскошна ўбраны быў пакой,
Шмат абразоў — і краты ў вокнах.
«Тут пройдзе век жаночы твой.
Сюды прынось кляцьбу ці стогны.
На людзі — ўсмешлівай выходзь.

З майго дазволу, зразумела.
Наш старажытны слаўны род
Пільнуе гонар свой умела!»
Я ўкленчыла, нібыта ў сне.
Між абразамі і сцяною —
Шэсць кос дзявочых... Як мае,
Ды перавіты сівізною.
За што адрэзаны яны?
За здраду? За нялюбасць проста?
І смерць глядзела са сцяны
Марыяй-дзевай безвалосай.
І я... прачнулася ў слязах.
Над горадам быў вечар шэры,
А з кухні плыў смярдзючы пах
Ад прыгарэлае вячэры.
Мой муж крычаў у зале: «Го-о-ол!»
І вылі на дварэ сабакі.
А на балконе мой анёл
Сядзеў і безнадзейна плакаў.

* * *

Звіваецца арнамент геральдычны.
Расколатыя сцены герб згубілі.
І толькі смерць у рыцарскім абліччы
Вартуе пазабытыя магілы.
Не дагукацца згубленых імёнаў.
Герой і здраднік тлом адным з'яднаны.
Бяссільныя малітвы і праклёны
Час аднавіць, калі былі сказаны.
Навошта ж нам, пакуль яшчэ мы ў коле,
Асветленым жыццём на пару хвіляў,
Штурхаць кагосьці ў цемру, секчы голле
На дрэўцах мар, ламаць чужое крылле?
Няўмольны цень і нас пакрые хутка,
Там, па-за колам, іншыя правіны.
Я кнігу, як дзіця, бяру на рукі,
Каб новаму жыццю яе падкінуць.

* * *

Ты кажаш — каралева?
Што ж, вянчай!
Я так люблю стылістыку барока.
Архангел крэсліць «не» лязом мяча,
А слова «так», як грэх, навідавоку.
Таму — вянчай! І ведай: каралём
Ты пры такой не будзеш каралеве.
Аднойчы, недарэчна ясным днём,
Убачыш: ты Ліліт служыў — не Еве.
І яблыка спакуснага няма,
А толькі ёсць змяіная атрута.
І ў райскім садзе надышла зіма.
І ты яе ільдом, як раб, прыкуты.

Вызваленне

Ну а здавалася, гэты палон — на вякі.
Цмок падыхае ля ног прыгажуні суровай.
Рыцар чакае, стамлёны, у латах цяжкіх
З гербам лілейным, майго літасцівага слова.
Што адказаць табе, мой непахісны герой?
Кроў на мячы высыхае, і высахлі слёзы.
Я палюбіла свой закратаваны пакой
І цішыню, у якой нараджаюцца крозы.
Ну а цяпер — за табою сядзець на кані
Вабнай здабычай і сведчаннем воінскай моцы...
Цмок падыхае. Згасаюць на вежах агні.
Не разумее маўчання майго абаронца.
Ціха пагладжу рукой залатую луску
І азірнуся з тугою на чорныя вежы...
Кроў іржавее на жоўтым халодным пяску.
Ты памыліўся, ваяр. Я табе не належу.

Воўк

Паводле прымхі старажытных лацінян,
той, каго пры сустрэчы воўк убачыць
першым, знямее.

Воўк, ты ўбачыў мяне не першым.
Я не страціла слоў, о не.
Мне здалося, што ты залежаў,
Дзікі звер, ад хатняй, мяне.

Шкода бачыць, як ты, магутны,
Па траве, як вужака, поўз,
І пагляд твой зрабіўся мутны
Не ад злосці — адчайных слёз.

Звер, скуголіў ты так, бо ведаў,
Што ў мяне, пяшчотнай такой,
Столькі жорсткасці воўчай гэткай,
Колькі ўлады ёсць над табой.

Не здыму я з цябе, ваўчышча,
Зачарованы ланцужок,
Каб вярнуўся ў сваё аблічча,
Каб ізноў да людзей прыйшоў,

Каб устаў, малады, прыгожы.
Засмяяўся, пацалаваў...
На Купалле так лёгка можна
Заблукаць між высокіх траў...

Не! Забуду, пераступіўшы
Праз пакуту тваю — на ўсё:
Як свяціліся, быццам вішні,
Вочы, поўныя воўчых слёз,

Як дрыжэў ты, не змогшы болю,
І завыў на мае сляды,
І кацілася рэха полем
У далёкія гарады,

І каціліся з неба знічкі,

www.kamunikat.org

І вянкі па рацэ плылі...
...Ты ў ваўчыным жывеш абліччы,
Мой адзіны на ўсёй зямлі.

Кола

Корд вастрыём цалуе сэрца,
І трон пусцее, як душа.
Так новы князь да ўлады рвецца,
Нібыта грэшнік да крыжа.
Ён ладзіць баль у замку, поўным
Парсунаў велічы былой.
А за высокай спінкай трона
Стаіць славалюбівы вой,
Прымервае ў таемных марах
Плашч пурпуровы ўладара.
Ад скіпетра збягае старасць,
Як ад паэтава пяра.
Мяняюцца паны і чэлядзь.
Не бачна прыгажунь былых.
То вераць Богу, то не вераць
Між гэтых сценаў залатых.
А праз вітраж праходзіць месяц
І набывае фарбы сноў...
Адзін астролаг з кутняй вежы
Перажывае ўладароў.
Ён трэба кожнаму — бо кожны
У прышласць марыць зазірнуць,
Сузор'і Панны і Дракона
Ці прымірыць, ці абмінуць.
Бо кожны ведае: не вечны
Ягоны род, ягоны зман.
І рвуць пергамент з рук старэчых,
Нібы магутны талісман.
Спазнанне будучых няшчасцяў,
Аднак, збавення не дае.
І ізумруд пярсцёнка гасне
Малой расінкай на траве.
Ідуць сузор'і вечным колам.
Ніжэе замак, памяць спіць.

У вежы кутняе астролаг,
Нібы сівы пугач, сядзіць.
А па карчомках навакольных
То п’е, то лаецца паэт.
І хто ўладарыць зараз тронам —
Бадай што, не цікавіць свет.

Паляванне каралевы Боны

Паліць вусны пал, як воцат.
Пушча. Коні. Зброі ззянне.
Каралева Бона Сфорца
Пачынае паляванне.

Як палаюць шчокі ярка
І ў вачах пыхлівасць стыне
Белай Русі валадаркі
З валасамі залатымі.

Вось абапал гордай Боны
Рыцары — ліцвінскі з ляшскім,
Закаханыя абодва
Без надзей на дотык ласкі.

І дарма так прагна воі
Позірк ловяць каралевы:
Спеліць плод яе любові
Залатое ўлады дрэва.

Толькі ўлада! Дзеля ўлады
Трубіць рог, палае сэрца
І загнаны звер калматы
Са стралою ў горле б’ецца.

Толькі ўлада! І жанчына
Арбалет трымае цвёрда.
І тужлівы рык звярыны
Паляванню —
ўзнагарода.
І — чуйдух!

Ахвярай новай
Будзе воўк і новы рыцар,
І ў кароне яснай Боны
Промнем больш пачне іскрыцца.

Каралева едзе конна
Белавежскаю дарогай,
Не кахаючы нікога,
Не шкадуючы нікога.
Рог турыны — голас боскі.
Вецер шлейф матляе вузкі...
...Справа плача — рыцар польскі,
Злева — рыцар беларускі.

Вінцэсь Каратынскі

У карчме прыдарожнай,
старой, як асінавы пень,
Можна верш напісаць,
звонкі і залаты, як манета...
Ды манету прап'еш.
Ну а верш — неадвязны, як цень.
Ён у сэрцы дрыжыць, як страла.
Ён з чужога сусвету.
У сырым сутарэнні,
адкуль край магілы відзён,
Можна верш напісаць,
быццам зорку прыўлашчыць малую.
Толькі зорка пагасне...
А верш — бласлаўленне й праклён —
Ён з табой назаўжды,
як на скуры агню пацалунак.
Можна верш напісаць
у дарозе, у доме, у сне,
Можна выплакаць словы
ці вычуць у спевах свірэлі.
Толькі тут... Толькі ў гэтай
суцэльнай, вялебнай мане
Верш такі недарэчны,
як мнішка у танным бардэлі.

www.kanunikat.org

Рагнеда

Чаму яго ты не забіла,
Чужынца, бабніка, забойцу?
Якая сіла нож спыніла —
Кальчуга? Шлюбны сон? Жаноцкасць?

Ты — не забіла... Не парвала
Ахвяр і хціўцаў сувязь злую.
І ў божай ночы пакрывале
Зямля твая, як ты, вякуе.

Крывавы Полацк не счакаўся
Крывавых Кіева маленняў...
Не дыяменты-слёзы — стразы,
Падробкі — ты ліла, напэўна,

Князёўна — болей не князёўна,
Княгіня — болей не княгіня,
Пры ўладару — п'яным і сонным,
Па скошанай, як луг, радзіне.

Ты мусіла забіць, Рагнеда!
Ты столькі год жыла рабыняй,
Кляла яго — ды ён — не ведаў,
Нянавісць прывівала сыну,

І — ўсё дарма...
Твае нашчадкі
Павязаны чужой крывёю.
Іх будуць ваяваць спачатку,
Пасля — пазбавяць сілы вояў,

Пасля — імя сваё прыўлашчаць,
І будзе край гібець бяссілы...
Твой муж цябе задоўга лашчыў.
Чаму яго ты не забіла?

...Вось ён глядзіць на нож дарэмны,
Усмешка злая крывіць вусны.
Ідзі, няўдалая царэўна,
Далоў з вачэй, да Белай Русі...

www.kamunikat.org

Валет

Белы парык, і ружовыя шчокі, і шпага,
Пена марская — каўнер, і адданыя вочы...
Ён не кароль. Не здабудзе кароны адвагай.
Ён ля дзвярэй, за якімі прынцэсы рагочуць.
Сумна ў дзяржаве. Валеты ахоўваюць дзверы.
Ах, як маглі б яны танчыць з казырнаю дамай!
Толькі казырны кароль анікому не верыць.
Шлях для валета — геройская гібель — і ў яму.
Рана ці позна прыходзяць чужыя... Зацята
Улады клянуць і ірвуцца да сэрцаў кардонных.
Гіне віновы валет, толькі ў тым вінаваты,
Што не народжаны ні для труны, ні для трона.
Гіне валет... І яму не ўтлумачыш, нябогу,
Што у калоду не кожная карта кладзецца,
Лепей лісцё падмятаць ля прыступкаў да Бога,
Чым паміраць за чыёсьці кардоннае сэрца.

Бахчысарай

Арабескі, арнамент на сініх, як мора, шпалерах,
Тонкі шоргат шаўкоў і тужлівы пагляд цераз краты...
Колькі казак і песень...
А сёння тут пенсіянеры
Залы сонна вартуюць і стомлена лаюць улады.
Муляжы садавіны, якую рабыні насілі
На падносах са срэбра, хаваючы бедныя вочы...
Спяць красуні гарэма ў сваіх зруйнаваных магілах,
І ніхто аднавіць белы мармур і ў думках не хоча.
Ах, няволя... Прыгожая клетка... А сёння на волі
Б'ёмся ў клетцы нястач і абраз і вачэй пажадлівых...
Згасне мёртвы палац пад распаленым сонцам
павольна...
Не было там шчаслівых, і тут не бывае шчаслівых.

Вячэра ў чужым палацы

Цацачная балерына бяжыць па лязе сталёвым —
Нічога, што з парцэляны...
І яна — падданая смерці.
Пунсовы, як сэрца, яблык сярод прысмак адмысловых...
Арнамент срэбраных кветак куфэрачкаў і цукерніц...
Абрус быццам белы саван...
Пра гэта не дбаюць госці.
Маленькая балерына ўсё танчыць — смешная цацка.
Ужо разрэзаны яблык. І цесна, як на пагосце
Крыжам і зоркам; і тлумна, нібы на нядзельным пляцы.
Маленькая балерына слізгае бліжэй да краю —
І зноў вяртаецца, быццам ратунку знайсці не можа.
А келіхі звоняць звонка, як волатавы каралі,
І кроў такая чырвоная на парцэлянавых ножках.

* * *

Вецер з боку мора, вецер з боку сонца —
Гэты ж, як і з боку вечных халадоў.
Добры а ці грэшны — быў бы толькі моцны —
Цар увойдзе ў шаты летапісных сноў.
Выкрасліць не зможаш і забыць не зможаш
Роспачных учынкаў, ссечанай травы.
Назва дробнай рэчы, ці партрэт на грошах,
Ці пліта ў падлозе гарадской царквы,
Полымя гатычнай небаноснай цэглы
І барочны мармур, гладкі, як вада,—
Добрага ці злога — а імя пацвердзіць,
Дойліда забудуць — ды не ўладара.
Вецер буйных лёсаў, што кідае ветразь
За любым жаданнем княскае душы,
Топіць толькі хілых, толькі моцным верыць.
Той, хто даплывае,— будзе ў песнях жыць.

Залаты ліхтар

Я нікога не ўратавала,
Крыж пахілы не падняла.
Я прыходзіла ў замак жалю
З ліхтаром залатога шкла.
І прамень прада мною падаў,
І хавалася зло ў лаўжы,
І на ўсіх маіх слёз хапала
І хапала маёй душы.
Не была забойцам пагрозай,
Не была надзеяй ахвяр.
І працягваў дарогу ў росы
Для мяне залаты ліхтар.
Працякалі яшчаркі побач,
І гайдаліся кажаны.
Вечар, нібы ўрачысты пробашч,
З цішынёю мой жаль жаніў.
Ды аднойчы святло паўстала
Не ад сонечнага святла.
Я ж нікога не ўратавала!
Крыж пахілы — не падняла!
І душу ачышчалі слёзы,
Лекавалі — толькі маю...
І ліхтар зрабіўся анёлам
І пакінуў навек зямлю.

* * *

Рабам так страшна волю мець —
Напэўна, так, як лёду — таяць.
І бранзалетаў танных медзь
Навечна скуру іх прыпаліць.
Плывуць галеры на праліў,
І піраміды неба колюць.
Хто між рабамі вольны быў —
Адны пяскі ды грыфы помняць.
Што ж нам рабіць — з жывой душой,
У свеце злым і безнадзейным,
Пад небам памяці чужой,

www.kamunikat.org

Якое цісне: «Будзь бяздзейным!»
Што — воля? Хто яе спазнаў?
Ні дзед, ні прадзед, ні прапрадзед.
І раб ланцуг пацалаваў
З вільготнай радасцю ў паглядзе.
Плывуць галеры. Сфінкс глядзіць
Паўзверх стамлёнага натоўпу.
Не можаш волі не любіць —
Не блытай Афрыку з Еўропай!

17.03.1991

Успамін

Візантыйскія пярсцёнкі
Абвіваюць яе пальцы,
І з карункаў чорных вэлюм
Яе вочы захінае.
У вушах — жамчужын гронкі,
А спадніцы — як палацы.
А вачэй яе — не помню,
Голас не прыпамінаю.
Помню толькі —
Бранзалеты са смарагдавай аздобай,
Дыямент на дыядэме,
Дыяменты на абцасах,
Дыяменты на манжэтах —
Быццам дажджавыя кроплі.
І высокую прычоску,
І апошнюю абразу...
Што ж кахаў я? Што я бачыў
За завесаю бліскучай?
Толькі рэчы, толькі тое,
Што за грошы прадаецца...
А спадніцы шаргаталі —
І было душы балюча.
А звінелі бранзалеты —
І чамусь палала сэрца.

Палац

Перліны рассыпаны мае
Па каменных плітах у палацы.
Цені тут шапочуць, як аер.
Ад улады ценяў не схавацца.
У палацы таямніц няма,
Хоць хавае кожны — таямніцу.
І блукаюць Дама і Манах
Па аркадах гэтай камяніцы.
У палацы нельга пакахаць,
Золата блішчыць ярчэй, чым вочы.
Перліны ў каралі не знізаць
І не пераняць навукі воўчай.
Тут — чужой — правесці век зямны,
З месяцам гаворачы начыма,
З цяжарам пакутлівай віны
Ад зламаных крылаў за плячыма.

* * *

Састарэлы кароль
не баіцца аб смерці маліцца.
І наследнік яго
не саромеецца ўладнае мроі.
А ваяр малады
на рудой памірае ігліцы,
На дарозе лясной,
пад нагамі чужацкага воя.
Рушнікі пазрываныя
з нашых крыжоў прыдарожных.
Цьмяны час. Цьмяны дзень.
Над краінаю — золак крывавы.
Толькі зноўку ваяр паўстае,
малады і прыгожы,
На шляху чужаніцаў,
не мроячы нават пра славу.
На ахвярнік вайны
самых лепшых прыносіць краіна.
І святлее прастор,

www.kamunikat.org

і сціхае мячоў навальніца.
Пераможцам і збаўцам
завуць каралеўскага сына.
Безыменныя воі
ляжаць на збуцвелай ігліцы.

Балада пра чорны шоўк і белыя карункі

1

Яна апранаецца ў чорны шоўк —
Ні золата, ні каменняў.
Карункаў бель абпаляе зрок,
А твар цудоўны — не меней.
А як заспявае — растане лёд,
А рухаецца — што фея.
За гожасць хваліць яе народ,
Але за розум — не меней.
Пры каралеўскім тлумным двары
Зашмат прыгод куртуазных.
Але пра яе ніхто гаварыць
Благога не змог ні разу.
Шчаслівы, горды яе супруг!
Няма дабрадзейней жонкі.
І кавалераў радзее круг,
І шлюбны блішчыць пярсцёнак.
«Не бачыў свет такой скупінды!
Не хоча шчасцем дзяліцца!»
Смяецца Равіч, пан малады,
Ян Равіч, вясёлы рыцар.
«Не быць мне рыцарам больш, калі
Той чорна-белай сарокі
Ды не злаўлю! Паглядзець карціць
На скарбы пад чорным шоўкам!»
І кінуў кубак пад стол юнак,
Ізноў засмяяўся звонка:
«А я пакахаю цябе не ў знак,
О, пані маршалка жонка!»
Скарыць жаночае сэрца — што

Прасцей! І рэцэпт вядомы:
Напоўні кветкамі ейны дом,
Спявай, балбачы без стомы,
Прыкінься расчараваным ці
Дражні таямніцай страшнай.
А больш ці менш на грэх у жыцці —
Каму з маладзёнаў важна!
Святлее горад і цёмны брук
Ад квецені веснавой.
І гасне лютні пяшчотны гук
І неба над галавой...
«Я сотні вершаў табе складу,
Вянок з іх табе саўю.
Тканіна чорная — на бяду,
Прымі жар-барву маю!»
На паляванні ці на імшы —
Ян побач з Пані сваёй.
«Або даб'юся — або не жыць!»
Змяшаўся агонь з крывёй.
І вось паклікала юнака
Чароўная Пані ў дом.
О, шоўк бліскучы, нібы рака!
Карункі — як снег з ільдом!
Страчае пані Яна сама,
Прыветная, як заўжды.
І згадкі страсці ў вачах няма,
І ўсмешка, як у святых.
«Ты сціплыя вартасці ўсе мае
Уславіў, рыцар, наўздзіў.
І гэта права табе дае
Пабачыць, што ты ўзлюбіў...»
Аплік за аплікам...
Шаўковы шнур
Упаў на белы дыван...
Гарсэт расхінаецца...
Патануў
У жаху смяротным Ян.
Пад чорным шоўкам пабачыў ён
Хваробы страшной сляды.
Барвовы, аж да касцей, агонь —
Згараюць у ім гады.

А пані пранікліва юнаку
У вочы глядзіць — і кажа:
«Страшыся, Яне, толькі граху.
Смерць, хворасць — гэта не страшна».

2

Душа — саламандра.
Агонь пакут
Яе незвычайна жывіць.
Як цяжка выбраць шлях юнаку.
Як лёгка змяніць ці кінуць.
Ян Равіч, дзе ты?
І келіх твой
Прыўлашчаны і дапіты.
А маладосці хмяліць напой,
Як вочы Мадонны Літы!
Пакуль зацішша між войнаў — пі,
Гуляй, маладая шляхта!
А хто ў двабоі каго забіў,
Звёў жонку — помніць не варта.
«Ці чулі, панства, а Равіч наш
Вясёлы — мніхам зрабіўся!» —
«Вось гэта вестка! Хоць стой, хоць ляж,
Хоць тройчы перахрысціся».—
«Дальбог, ён праведнік і мудрэц,
Алхімік і лекар знаны.
І праз які ён прайшоў чысцец?
Ці повідам апантаны?»
Квітнее зноў каралеўскі сад,
І зоры цямней пялёсткаў.
Чаму вярнуўся ты, Яне, брат,
На гэты чароўны востраў?
Такі знаёмы калісьці дом,
Балкон, дзе Яна стаяла
І чорна-белым цнатлівым сном
У промнях бяды растала...
«Вядзіце да Пані мяне хутчэй,
Я — лекар з краёў далёкіх.
І той агонь, што яе пячэ,
Стушу у імгненне вока.

Ну што ж стаіце вы, як слупы?
Я вылечу вашу пані!
Я цэлы свет абышоў, каб быць
Са смерцю змагацца ў стане!
Ах, бель карункаў!
Ах, чорны шоўк —
Кахання майго аздобы!» —
«...Ты многіх вылечыць, рыцар, змог
Ад гэтай страшнай хваробы.
І многіх вылечыш на зямлі
І словам Божым прасвеціш.
Ды пані нічога больш не баліць.
Ёй шчасна ў інакшым свеце».
І мніх раптоўную змог тугу.
«Што ж, стрэчу яе ў інакшым!..
Я помню — «Страшыся толькі граху.
Смерць, хворасць — гэта не страшна».
Я далучыўся боскіх святынь,
Іду да сэрца Прыроды...
Я не шкадую, што назаўжды
Са мной — два колеры цноты!»

* * *

Кароль Пясчанага замка ўладарыць Сусветам поўні.
Усё, што поўня асвеціць,— яму свой лёс уручае.
Кароль Пясчанага замка учора свайго не помніць,
А ўсё, што збудзецца заўтра, ён ведае да адчаю.
Лунаюць яго фрэгаты па хвалях срэбных аблокаў,
Празрыстыя воі ходзяць праз сцены нашых кватэраў.
Кароль Пясчанага замка жыццё забірае лёгка.
Пяском прасыпецца вечнасць, і вецер змяце паперы.
Кароль Пясчанага замка з лускою і доўгім джалам.
Ён скручвае цела ў кольцы. Блішчыць у кароне зорка.
Пясчаны замак аднойчы дзіця маё збудавала.
Мы больш не былі ніколі на тым пясчаным пагорку.

* * *

Беларукая Ізольда, цёзка той, такой каханай,
Нахіляецца над ложкам, дзе паранены Трышчан
Трызніць, трызніць, паўтарае ўсё імя яе бясконца.
Ну чаму б і не паверыць — што якраз яе імя!
Тая, іншая, далёка, па-за морам, па-за лёсам.
Заставайся, бедны рыцар, тут, ва ўладзе белых рук.
Залатыя косы лепей, чымсьці чорныя, ліюцца.
Рукі белыя прылашчаць за смуглявыя — лацвей!
Рыцар кідаецца ў ложку, рве шаўковыя прасціны,
Кліча ён сваю Ізольду.
Не, душу не падмануць.
Кубак падае з адварам на каменную падлогу.
Дзве Ізольды. Дзве пакуты.
Два каханні. Смерць адна.

Сад раллі

Для беларуса поле — смерць лесу.

Дакладней, гвалтоўная смерць.

Лес вынішчаюць для таго, каб з'явілася поле, якое дасць ежу роду чалавечаму.

Але ў поля ёсць свая смерць — людское паселішча. Падобна плесні, разрастаюцца вёскі і мястэчкі ў пачварныя мегаполісы, вакол іх пашыраецца арэал палёў, адцясняючы лясы...

Вартыя жалю астраўкі дрэў сярод барознаў нагадваюць аб сапраўднай прыродзе гэтага месца.

Чэхія, травень... Аўтобус прастуе праз поле, на якім высіцца дзіўны штыкетнік... Аказалася — плантацыі хмелю. Чэшскіх студэнтаў пасылаюць на хмель, як нашых — на бульбу. На адным полі штыкетнік павалены... «Нібыта Кулікоўскае поле»,— задумна заўважае расіянка з нашага экскурсійнага аўтобуса.

Дарэчы, археолагі дасюль спрачаюцца — ці была бітва менавіта на тым Кулікоўскім полі. Вось ужо колькі экспедыцый, а няма дастатковай колькасці выкапнёвай зброі, няма костак...

Палі нашае славы засеяныя касцьмі, якія ніхто не турбуе... Поле бітвы на Нямізе — не мае тае славы... Брат пайшоў на брата...

Поле, зямля, баразна... Карціна Рушчыца — вол, які падымаецца над узгоркам... Ужо як толькі не трактавалі гэтую карціну. І святарны бык, які скрадае Еўропу. І лёс чалавечы, што цягне яго за сабою — маленькую фігурку аратая...

У маім дзяцінстве было поле — у вёсцы бабулі. Я, маленькая гараджанка, іду ў высокіх спякотных залатых хвалях і паўтараю прыгожыя, чутыя тут, у вёсцы, словы: «Жыта... Горача... Хустка...» Бабуля злуецца на мяне: «Ай, гадкая мова... не гавары так...»

Але поле калыша прыгажосць слоў: «Каласы... Жніво... Валошкі...»

Поле дае жыццё, поле забірае яго. Глушцам дастаткова вытаптанай палянкі ў лесе, чалавеку патрэбнае поле, дзе могуць сысціся два войскі. Можа быць, поле патрабуе, каб яго час ад часу засейвалі трупамі? Верылі ж нашы продкі, што на полі ўродзіць усё. Нават вырастуць камяні. Зямля, як вобраз плоднасці,— гэта і ёсць сінонім поля. Крывавыя разоры — сімвал Беларусі больш, чым балота ці лес. На полі, засеяным трупамі, для адных вырастае воля, для другіх — рабства. Поле заўсёды падзяляе людзей — на прыгонных і прыганятых.

Поле — ідэальнае месца для ўціхамірвання. Правадыры сялянскіх паўстанняў ведалі, што важную бойку трэба спланаваць да таго, як самадзейных ваяроў пакліча да сябе поле — сеяць ці збіраць ураджай.

І не было больш дзейснага сродку падняць сялян на супраціў, як вытаптаць іх палі.

Поле — гэта прастора. Неабходная ўмова для развіцця свядомасці цывілізаванага чалавека. Толькі прастора дазваляе ўсвядоміць каардынаты, спараджае патрэбу ў перасоўванні, спазнанні свету. Поле — гэта спакой, сузіранне, засяроджванне. Менавіта ў народаў, што жылі ў пустынных мясцовасцях, раней за ўсіх развілося адзінабожжа. Таму ў беларусаў, дзяцей лясоў, так доўга захоўваюцца рэшткі паганства, пантэізму. Багі, якімі нашы продкі насялялі поле, слабыя. Палявік відавочна саступае ў магутнасці Лесуну ці Дамавіку.

Поле адкрывае чалавечаму погляду неба. І поле ж вымагае зямнога паклону, позірку ўніз, у баразну. Поле заклікае да вольнага руху, і поле ж змушае да аўтаматычнай, аднастайнай працы. Гэта Багдановічава антытэза каласка і васілька, матэрыяльнай карысці і чыстае красы.

Толькі ў полі чалавек адчувае сябе па-сапраўднаму самотным, бездапаможным. Ён адкрыты перад небам і перад іншым чалавекам.

У высокім жыце адчуванне трывогі не знікае — ты па-ранейшаму адкрыты ўсяму, што можа вынырнуць з залатых ці зялёных хваляў, да таго ж губляюцца каардынаты прасторы...

Поле — дзіцячая гульня ў амонімы. Памятаеце: палі капелюша, палі сшытка... А ёсць яшчэ поле манеты, поле герба... Сэнс, аднак, адзін — незапоўненасць, пустка. Не пазбаўленасць сэнсу, але сэнс пустэчы, знакавасць незапоўненай прасторы.

Калі нехта вар'яцеў, пра яго казалі: «Сышоў з поля».

Палі, парослыя крыжамі і камянямі,— могілкі...

Nature

Таямніца зямлі.
Жыватворнасць травы невядомай.
Сіла кветкі, што вечнасць дае.
Бляск галодных расіц.
Дробны вогнік жыцця
раздзімае пажар на адхоне,
А бяссілы Пярун —
на крыжы са сваіх бліскавіц.
Чалавек — уладар над слабейшым.
А голле ялінаў
Да крыві адсцябае
палюючага караля.
І падымуць аблокі душу
на кудлатыя спіны,
Не раней, чымся цела
ў зямлю ператворыць зямля.
Таямніца зямлі.
Хто — слімак, што гадуецца ў камні?
Сэрца камня — ці дух
пашчапанай майстрамі скалы?
І ўзрываецца снамі,
як поле, спакойная памяць.
І кусае за сэрца
бязлітасным срэбрам стралы.

Адраджэнне

Вечаровы язмін —
у зорках,
Белым воблакам —
ля акна.
Беларускіх сяброў суполка
На паўсотні вёсак — адна.
Сын дзячка
ды студэнт-няўдачнік,
Дзве настаўніцы ды ляснік
За гарбатай сядзяць гарачай
І чытаюць:
«Што я — мужык...»
Ды — пра Вітаўта, пра Сапегу,
Ды — пра вольнасць,
ды пра народ...
А па вёсцы гуляе рэха,
Бо на выгане — карагод.
І вясковыя ходзяць пары,
Заўважаюць святло ў акне:
«Во паны
загулялі ў карты!»
«Во гарэлкі кожны ліне!»
«Там — паненкі,
відаць — каханкі.
Як ім замуж пасля ісці?»
І смяюцца зоркі-заранкі
У блакітным густым лісці...
Сціплы поціск рук — развітанне.
«Не сумуй! Беларусь жыве!»
...Праспявала вёска да рання,
Смех згубіла ў мокрай траве.

Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч

Сіняя-сіняя ноч была,
Як вочы — колеру болю.
«Спыніць навучэнне.
Не навучаць.

Нікога больш. І ніколі».
Роднай мове — не навучаць.
Ні слова «хамам» — пра годнасць.
Яе беларусы мусяць аддаць,
Як права на першароднасць
Аддаў калісь галодны Ісаў.
Воля цара ці Бога
Ці то чыноўная драбяза
Так хоча — але — «Нікога!
Не навучаць!».
Не зазнае «хам»
Ні Буднага, ні Шэкспіра,
І ён па загаду зруйнуе храм
І помнік засыпле жвірам.
«Не навучаць!»
Хай дзеці растуць
З пагардаю да Айчыны.
Хай у суседні народ ідуць
Найлепшыя іх мужчыны.
Дурныя, пыхлівыя слепакі!
У смерць беларусаў вераць.
Не я навучу — дык навучаць іх
Вось гэты сівец і верас,
І зоры гэтыя, і агонь,
Што паліць пастух на лузе,
І казкі матчыны, і далонь
Лясного возера,
бусел,
Які не кідае свайго жытла
І верны сваёй сяброўцы,
Любіць Радзіму да скону, так
Як любяць расліны — сонца.
Не я навучу — дык навучаць іх
І годнасці паўнакрылай
Магілы мёртвых і боль жывых,
Мае — і боль, і магіла...
...Сіняя-сіняя ноч была
І сінім-сінім быў позірк,
Калі агонь вясёлы жаваў
Урадавую адозву.

Чорны Война

Верас прытушана ззяе — як боль у грудзях...
Неба Радзімы — такое халоднае неба.
А нада мной аніякі не плешчацца сцяг,
І аніякага вернага войска не трэба.
Я за сабой не паклічу ні хцівых, ні злых,
Ні юнакоў, апантаных ідэямі волі.
Смерці хапае — няхай паміраюць за тых,
Што не саромяцца пышнай прароцкае ролі.
Куля ніколі не ведае шлях у абход.
Война самотны не ведае шлях да спакою.
Маніш, чужынец, што мой не са мною народ.
Ён — гэта я, ён ніколі не будзе з табою.
Вежы маёнтка майго параслі палыном.
Тых, што кахалі мяне,—
суд зямны не ўваскрэсіць.
Покуль жывы, Беларусь мая —
родны мой дом,
Так, Беларусь — не «губерня»,
не «ўсходнія крэсы».
Нават асуджанасць зброяю стала маёй.
І безвыходнасць —
крыніца змагання для смелых.
Верас палае над беднай сцямнелай зямлёй,
Быццам у попеле іскры пажару саспелі.

Чорная быль

Ёсць чорнае сонца.
Малыя ўсе меры,
Каб мераць бясконцы пагрозлівы цень.
Хаця не дае мне ў пагрозу паверыць
Кахання зямнога зіхоткі прамень.
Ёсць цень — і яго перавага ў сусвеце.
Яго адкідалі паважна зубры,
А цень — перамог,
І прапылены вецер
Іх цені ганяе ў гатычным бары.
Цень — пан!

www.kamunikat.org

І дубы гэты цень адкідаюць,
І вежы...
І постаці смелых людзей...
І цені ўсё новыя цені ганяюць,
І меней у свеце высокіх надзей.
І цень пажырае ўжо нават каменне
І светлую памяць...
І гасіць усход...
І яснага сонца ўсё меней і меней,
А чорнага сонца ўсё болей штогод.
Мой бедны праменьчык!
Святла нам хапае
Пакуль што... Пакуль што...
Ды наша любоў
Зайздросны карычневы цень адкідае.
І чорнае сонца ўпаўзае у кроў.

* * *

Мая маленькая смерць
схавацца можа ў куфэрку
Ці ў жмудзе кветак сухіх
жаўцее шорсткім лістом.
Мая маленькая смерць
старанна, як піянерка,
Гадзіны крэсліць і дні,
як скальпель, вострым сцілом.
Далёкі Ерусалім
блішчыць у зрэнках крыжацкіх,
Сафіі Полацкай бель —
на твары мнішкі ў метро.
Мая маленькая смерць
баіцца адлюстравацца,
Ды я нашу на сабе
яе цяжкое таўро.
Навошта ведаць, калі,
якім абрынецца болем.
Мы ўсе — у човен адзін
змясціцца мусім пасля.
Смерць не бывае малой...

www.kamunikat.org

Ёй не бывае даволі...
Але куфэрак маўчыць
і спіць пад лёдам змяя.

Радаўніца

Наш першы плач разбіўся аб сцяну,
А крык апошні не спужаў нікога.
Мужчыны — мы хадзілі на вайну,
Жанчыны — мы ў царкве шукалі Бога.
Любілі бляск караляў, стук дажджу
У шыбы, шчыльна ўпраўленыя ў срэбра,
Вясельны тлум, зімовай ночы сум,
А карацей — усю зямлю і неба.
Няма тут знакамітых і святых.
А сам ты, браце, з іх, прызнайся шчыра?
Мы лёгка неслі груз грахоў сваіх,
Таму цяпер і спачываем з мірам.
Мы — твой народ. Мы — соль тваёй зямлі,
А не імёны камянёў магільных.
І чарку, не шкадуючы, налі
За ўсіх дзядоў — віноўных і бязвінных.

Страла

Адзінота стралы нашу смерць узвышае да Бога.
Адзінота стралы выбірае цябе — ці нікога.
Свісне неба — і плоць невыразна і глуха адкажа.
Вокам раны смяротнай душа паратунак заўважыць.
І няхай ганчакі ап'янеюць ад свежага мяса,
Сонца будзе цнатлівым, нібыта з рамонкамі ваза.
І страла перальецца ў артэрый салёныя воды —
І жыццё амярцвее ад страшнай яе адзіноты.

www.kamunikat.org

Пакаранне паэта

...І калі не спяваць аб Радзіме,
Дык навошта наогул спяваць?

У бронзавы час, калі ноч
нагадвае колерам бронзу,
За бронзавы стол ён сядае
і піша пяром пугачыным
На пругкім пергаменце
вершы і прозу
і вершы
і прозу.
І бронзавы поўні дзыгар адбівае гадзіны.
Ён піша
і піша,
нібыта прадрапвае выхад
З гнілых сутарэнняў —
у вольную ночку лясную.
І след слімака на ілбе, як карона, успыхнуў.
То Бог ужо ночку смяротным вянцом каранує.
І прывід збірае паспешна старонкі, старонкі —
Старонкі цякуць па руках валасамі русалкі,
І з бронзавых пальцаў расой асыпаюцца звонкай
І вершы, і проза,
і дробныя лёсу кавалкі.
...Усё, што напісана, знікне на золку пахмурым,
Калі да Радзімы ні мовай, ні сном не прыкута.
І прывід хаваецца ў бронзавым пекле для мудрых,
Што мудрасць і моц аплаціць не схацелі пакутай.

Позна

Закончыўся вечар у сінім тумане.
Ізноў прасвятляюцца вочы іконаў.
І горад, які існуе на спадмане,
Каменныя спіны згінае стамлёна.
За гэтым вакном — ні кавалачка неба.
Шаргоча, вуркоча начная дарога.
Гніе сарцавіна Адвечнага дрэва.
Галіны ля райскага ссохлі парога.

Ад сэрца да сэрца праходзіць цямрэча
І гасіць, як свечкі па службе царкоўнай.
І зноў загараецца лёс чалавечы
Ад ціхага слова, ад цёмнай іконы.
Сусвет рассыпаецца дробнасцю светаў,
Вялікасцю хрусткай карон маскарадных.
І свеціцца поўня ў вачніцах паэтаў,
Да працы карыснай зямной непрыдатных.

* * *

Паляванне на ведзьмаў — вясёлы занятак.
Мерзлы бруд б'е фантанамі з-пад капытоў.
Хто на свет нарадзіўся — ужо вінаваты.
Вінаваты стакроць — хто ў загон не пайшоў.
Запаўняецца неба пачварамі з дыму
Ад кастроў, у якіх нашы вершы гараць.
Паляванне на ведзьмаў імчыць па радзіме,
Быццам можа нянавісць яе ўратаваць.
Апраўданняў не слухае пан інквізітар.
Дух пячоры. Дым вогнішчаў. Немасць людзей.
І за брамай пакутліва моліцца мытар,
І бліскучы алтар беражэ фарысей.

* * *

Прыкласці ракавінку да вуха
І слухаць мора і Ларэлею
І сэрца ўласнае пільна слухаць
У час, калі на дварэ — завея.
На аксаміт у авальнай рамцы
Сухі і ломкі наклейваць верас,
І не залежаць, і не баяцца,
І анікому ні ў чым не верыць.
А можна вершы складаць пры свечцы
І разрываць іх у страху й скрусе,
Што ты ўцякаеш — не можаш збегчы
Ні ад сябе,
ні ад Беларусі.

* * *

Зразумей мяне — не дай забыцца
На бязгрэшны позірк Мілавіцы.
На зямлю падступную не трэба
Зводзіць тое, што даруе неба.
Не ратуе час, а толькі губіць.
Страчвае каштоўнасць слова «Любы».
І фіранкі дзеляць свет надвое:
Там — сабою быць,
а тут — з табою.

* * *

Святло, запаленае ўдзень,—
яно ж нікому не відно.
Сплывае волі карабель,
мы ціха абжываем дно.
У кожнай ракавінцы свет,
у кожнай кропельцы — жыццё.
А што няма над намі зор —
падкажа толькі небыццё.
Нам позна выплываць наверх.
Паветра вольнае заб'е.
Святло, запаленае ўдзень,
Да вечара не дажыве.

* * *

Выснова дня: ён мог бы і не быць.
Нашто чакалі?
Не збылося слова.
Суцешыць хоча мой анёл-ахоўнік,
Ды ён не ўмее гучна гаварыць.
Жыццё вірує безліччу спакус.
І хто падкажа — дзе высокі востраў?
Вузей сцяжынкі і шырэй пагосты,
Стракатае трыко — для нашых муз.
Дзень быў пусты, як душы.
Можа быць,

Мы хутка назавём яго найлепшым.
Я не жадаю болей гэтых вершаў.
Яны — нішто.
Анёл-ахоўнік спіць.

* * *

Прыйдзе дзень — і мёртвымі будзем.
Прыйдзе дзень — і добрымі станем.
«Адыходзяць лепшыя людзі»,—
Скажа вораг за чаркай таннай.
Прыйдзе дзень — і ўсё надрукуюць,
Прыйдзе дзень — і ўсё прачытаюць.
А пакуль на далонях вуліц
Нашы будні, як снег, знікаюць.

Сябру, які пакутуе па славе

Так, нас падымуць колісь. Як штандары.
І ўславяць. І ў глыбокі кінуць дол.
Ты не жывеш, а ўсё пра гэта марыш.
А час ідзе, ступае, быццам вол,
Па чарапках чырвона-чорных вазаў,
А баразна засеяна касцьмі.
Хто не трапляў пад капыты ні разу —
За славу не змагаўся між людзьмі.
Ах, як карціць нам тая куламеса —
Прыўзняцца, над галовамі ўзляцець
У небасхіл, як бахаўская меса,
І пераблытаць мітусню і смерць.
Ах, як карціць — прыўзняцца хоць на хвілю,
Пастукацца ў нябёсы... Дружа мой,
Шлях да нябёс пачнецца над магілай.
Жывы паэт, як і жывы герой,—
Не больш чым цень ад пасмяротнай славы
Ці ўспышка перад цемрай забыцця.
І чэзнуць нашы словы, быццам травы,
Ад крыўднай немагчымасці жыцця.

* * *

І зноў забівае сонца
сведкаў свайго гарэння.
Крылаў яно не любіць
і Вавілонскіх вежаў.
Толькі ў напрамку сонца
нашы лятуць марэнні,
Толькі ў напрамку неба
зноў вырастаюць вершы.
Сыплецца попел шэры
на зямныя галовы.
Апёкі гараць на душах,
і чырвань перад вачыма.
І зноў у напрамку сонца
ўзлятаюць сляпыя строфы,
Хоць там яны непатрэбны,
а тут яны немагчымы.

* * *

Ці абуджаюся — ці паміраю.
Стукае сэрца ў сусветную цвердзь.
Раскрыжаваць на прыступцы да раю —
Вытанчаней пакарання не мець.
Праведны люд падымаецца ў неба,
Лёгка ступае на грудзі мае.
«Так і належыць, напэўна, так трэба»,—
Нацыянальны характар пяе.
Часам пасядуць вакол херувімы,
Каб адпачыць ад ухвал і святла...
Не адарвацца ад любай радзімы.
Усімі цвікамі ў душу мне ўвайшла.

* * *

Гэта восень. Яшчэ незаўважная.
Што ж спадзявацца
На яшчэ адзін шанс,
на яшчэ адну спробу здзяйснення.

Пахне верасам.
І што карысці гаворкі дарадцаў,
Што яшчэ маладая
і вартая слёзаў натхнення.
Я — падсудная ў гэтым забруджаным,
стомленым свеце.
Я свой крыж не ўсцягнула
і да палавіны дарогі.
Я лічыла аблокі,
лавіла абдоймамі вецер
І ні разу ў зямной баразне не запэцкала ногі.
Непатрэбная самая
ў свеце патрэбных і важкіх,
Нават восень сваю
самавіта сустрэць не ўгадаю.
Аблятае лістота.
Мой крыж анічога не важыць.
І лічу я аблокі.
І новую песню складаю.

* * *

Як да смерці блізка,
так да шчасця блізка.
Звадкаў і выпадкаў
дзе парвецца нізка?
Кожны крок — па дроце,
кожны ўздых — на вецер.
Хоць да шчасця блізка,
ды бліжэй — да смерці.

Двухтварасць

Калі чалавек — гэта ліст,
адкінуты дрэвам на вецер,
ён мае, як ліст, два бакі —
зялёны і срэбны.
Два твары — зялёны і срэбны — ён мае.
Зялёны, да сонца павернуты, твар

піў сонца, цягнуўся за ім,
як мог, вываручваў зялёны хрыбецік,
адпіхваў суседзяў, між ценяў варочаўся, быццам
у коле гарачых вуголляў смарагдавы скарпіён,
абы жыватворныя промні
злавіць, паглынуць, увасобіць
ва ўласную прагную плоць.
А срэбраны бок — прахалодны заўсёды,
мяккі і пяшчотны, але анікому не бачны,
твар месячны і патаемны, задумлівы, сонны,
заўсёды глядзеў на зямлю,
гэта значыць — на смерць,
цвярдую, пляскатую смерць
для лістоў і людзей.
Гляджу ў свае вочы і бачу
зялёны і срэбраны колер,
у зманлівым мігаценні —
як ліст на вятры трапеча.
Дзве існасці. Два абліччы.
Такі вось сюррэалізм.

Сад відачынства

Таямніца тэатра — смерць.

Што яшчэ можа прымусіць сузіраць і суперажываць?

Выгляд смерці, пакут, якія суправаджаюць пераход на той свет, страшаць і вабяць з аднолькавай моцай, як прорва.

Старажытныя рымляне дасягнулі тае вяршыні тэатральнага мастацтва, да якога наш «жорсткі тэатр» набліжаецца паволі, з рэверансамі ў бок гуманізму. Звер у чалавеку перамагаў падчас гладыятарскіх баёў.

Сённяшнія экстрэмальныя тэлешоу, дзе ў цацку ператворанае само Божае стварэнне,— крок да рымскай арэны, дзе пясок паліты крывёю, а не журавінавым сокам.

Усмешка смерці — самая шырокая, якую можна ўявіць,— вось сутнасць камедыі.

Сцэна дае ілюзію несмяротнасці, перамогі над смерцю. Гладыятар яшчаркай курчыцца на пяску, на ягоных вуснах крывавая пена — загінуў ён, не мы! Смерць улагоджаная данінай — мы перамаглі, мы вырвалі сабе яшчэ кавалак жыцця.

Задушаная Дэздэмона прысядае ў рэверансе, і яе шчокі прыемна ружавеюць ад кампліментаў — зноў пераможаная смерць! Гэтак наш продак перамагаў намаляванага на сцяне пячоры зубра, малюючы стрэлы ў ягоных баках.

Тэатр — Янус, двухаблічны бог. Але пад абедзвюма маскамі — адзін твар з пустымі вачніцамі.

Святы Францішак з Асізы першы паспрабаваў вызваліць тэатральную дзею ад улады дэманаў. Жывыя сцэны Хрыстовага нараджэння й распяцця, як і лялечныя яслі ў касцёлах, паўсталі ў наіўным, поўным дзіцячага захаплення Боскім светам сэрцы святога Францішка.

У Чэхіі тэатр называецца «дзівадла». Дзіва...

А ў Беларусі артыстаў называлі глумцамі.

Спрадвечны беларускі тэатр — балаган. У ім трэба крычаць, каб цябе пачулі на галёрцы. Трэба сплываць журавінавым сокам так, каб запэцкаліся першыя шэрагі партэра. Гэта тэатр Юрася Братчыка з бутафорскім крыжам, які мае спецыяльную прыступачку для таго, хто ўдае сябе ўкрыжаваным. Толькі замест журавінавага соку з-пад бізуноў урэшце пырскае сапраўдная кроў.

Беларускі тэатр — гэта шэры будынак з калонамі, які мусіў велічна ўздымацца антычным амфітэатрам, але праз недахоп сродкаў «лішнія» спраектаваныя каланады былі адкінутыя. Рамантычны паэт павярнуўся да гэтага будынка спінай. Ягоная каменная постаць нібы імкнецца аддаліцца ад царства кардоннага месяца.

Герой апавядання Борхеса, маўрытанскі філосаф, дарэмна спрабуе зразумець сэнс сустрэтага ў антычным рукапісе слова «тэатр». Камедыя, трагедыя — што гэта? Разгадка на паверхні: людзі навокал імправізуюць тэатральныя дзеі, разыгрываюць камедыі і трагедыі... Але філосаф-мусульманін не ўвязвае гэта з таямнічым разуменнем.

Развалiны антычнага Эфеса... Мясцовы Калізей... Немаладая японка выходзіць у цэнтр сцэны і спявае — цудоўным оперным голасам. Стракаты шматнацыянальны натоўп змаўкае... Калісьці проста пад гэтыя сцены падыходзілі марскія хвалі — а зараз тут пустка. Па гэтым каменным роўчыку вакол сцэны цякла кроў — першых хрысціян і гладыятараў... А спеў усё гэтак жа дасканала даносіцца да апошніх радоў амфітэатра.

У мінулым стагоддзі археолагі раскапалі пахаванне шумерскай царыцы па імені Шуб-Ад. На царыцы былі

ўпрыгожанні дзівоснага майстэрства... Вырашана было зладзіць выставу, дзе паказаць і ўпрыгожанні, і адноўленае аблічча царыцы... Якая, вядома ж, мусіла быць таксама дзівоснай прыгажосці. Але скульптар, які ўзяўся аднаўляць яе рысы па чэрапе, хутка зразумеў, што ў яго атрымліваецца злосная, звыродлівая мегера... І пасвечаныя ўсвядомілі: гэта пазбавіць сэнсу ўсю падзею... На выставе красаваўся бюст жонкі скульптара. Наведнікі былі ў захапленні. Ведаць праўду ніхто не хацеў, нават журналісты.

Цяпер кажуць, што аднавілі аблічча Барбары Радзівіл і была яна зусім не гожая, з вялізным, гарбатым носам... Не верым!

Тэатр — гэта маскі, лічыны. Яны былі заўсёды, каб чалавек адчуў сябе іншым, абароненым... У мікенскую эпоху старажытныя грэкі нават твары памерлых закрывалі тонкімі залатымі маскамі, каб хаваць сляды распаду. Нават смерць рабілася актрысай.

Беларускія калядоўшчыкі ды валачобнікі носяць на сабе страшныя абліччы Мядзведзя, Жорава, Казы... А ў батлейцы — нашым старажытным лялечным тэатры — галовы лялек былі прымацаваныя на нітачках, каб лялечная смерць магла іх ссякаць. І тады лялькі сыходзілі з маленькай сцэны, пагойдваючы галовамі, як пустымі торбамі...

Беларускую батлейку забараніў на пачатку дваццатага стагоддзя мінскі паліцмайстар. Нават прозвішча яго вядомае, але давайце хаця б беларускага Герастрата забудзем.

Тэатр — гэта Міжзем'е. Кшталту таго, у якое трапляюць героі Толкіена, калі робяцца нябачнымі. Там нельга жыць — але толькі там можна час ад часу знайсці паратунак ад скрыжаваных над табой мячоў.

Першым беларускім вандроўным тэатрам

Воўчае сонца, цыганскае сонца
Над Беларуссю маёй паплыло.
І па дарозе, як песня, бясконцай
Коцяцца шляхам, як гора, бясконцым
Нашы калёсы, тэатр і жытло.
Хто вы такія, у вышыванках
Пані-панове?

З якой стараны?
— Мы — беларускае сцэны світанак,
Дзеці шляхцянак і дзеці сялянак,
Мы — беларускія дочкі, сыны.
Колы грукочуць, нібыта рагочуць
Рэхам натоўпу ў мястэчках глухіх,
Суму не ўчуе, хто ўчуць не захоча.
Зорак блішчаць васільковыя вочы.
Як і да славы, далёка да іх.
Гразнуць у лужынах коні і колы,
Гразне ў абразлівых кпінах душа.
Роднага слова востраў вясёлы,
Першы тэатр беларускае школы
Зараз — мішэнь для пляўка і глыжа.
Воўчае сонца — шчыт для героя,
Сведак для злодзея — светла плыве.
Толькі любоў да Радзімы нам зброя,
Толькі бясконцая вера — у тое,
Што адрадзіць мы паспеем яе.
Спяць у павозцы паненкі-актрысы.
Дай бог бясхмар'я іх душам святым!
Белая Русь,
ты празрыстая, чыстая,
Ты перад ворагам здолела выстаяць,
Перад сваёй жа пакорлівай сціпласцю,
Саманяўвагай — ці выстаіш ты?
Воўчае сонца, цыганскае сонца
Над Беларуссю маёй паплыло.
І па дарозе, як песня, бясконцай,
Так, як змаганне і вера, бясконцай
Едзе вясны беларускай жытло.

Бедны Йорык

Стракаты ўбор блазна
знішчае старасць,
І сівізна глядзіцца, як парык.
Ды паж з табою гідзіцца гутарыць —
Ты безнадзейна для яго стары.
Не хочаш верыць у свае маршчыны,

То лаешся, то сілішся скакаць.
Нахвальваеш, які ты ёсць мужчына,—
І смерць саму ўгаворыш пераспаць.
Прывыклі ў замку да твайго дзівацтва.
Але ў пакоі кутняй вежы ты,
Сам-насам з галубамі і вар'яцтвам,
Шчаслівы, незалежны, малады,
Глядзіш у ноч. Спяваеш пра галубку.
Ніводнага люстэрка — толькі цень.
І поўня гладзіць зморшчаныя рукі,
І ўздрыгвае ад дотыку прамень.
Спыніся, час! Ссівелага сатыра
Забыўся падсадзіць ты ў свой рыдван.
Жыццё ляціць, як бальны танец, вірам,
Бразготкаю, што круціць ураган.
Спявай жа, маладзіся і блюзнерствуй
Перад паважнай сівізной старых,
Стракатай лялькай — у батлейцы смерці.
Ты — апаганшчык ліку дзён сваіх.
Але калі з чарговым брудным жартам
Павалішся пад балявальны стол
Там, дзе віно разлітае і карты
Перамяшаў кашчунны твой анёл,
І ўладу дзён тваіх забудзе сэрца,
Заплачуць воскам свечкі угары,
Гасцей няёмка рогат абарвецца.
І нехта скажа:
«Ён жа быў стары...»

Далі

З гадзінніка цячэ павольна час.
Твар у люстэрку набывае рысы
Паганскіх стодаў.
Столь, як саван, вісне
Перад вачыма і хавае нас.
А неба, як нявіннае дзіця,
Глядзіць праз шыбы лялечна-прыгожа.
І мне амаль што не шкада жыцця,
Але шкада таго, хто жыць не можа.

Глядзіся, свет, у здань сваю, у цень,
І не кажы, што ўсё мастак прыдумаў.
Дзе сонца праплывае па вадзе,
Там лётаюць смуглявыя красуні.
Свет! Ты не ўмееш над сабой пакпіць,
І, як слімак, твой час паўзе па камні.
І мастакоў, што не баяцца жыць,
Ты запрашаеш позна альбо рана.
Разрэзанае мяса ці гранат
Аднолькавага колеру для вечных.
Вада, якою рукі мыў Пілат,
Іх фарбы разбаўляе кожны вечар.

Батлейка

Дарогі пыляць,
бы згараюць сляды за табой.
Маленькі вазок перавозіць загадку сусвету
Ад пляца да пляца...
Па лужынах б'е лістабой.
Ад веры да здрады
ніхто каляіны не зведаў.
Як цар батлеемскі —
мы прышласць касуем сваю,
І танчаць, нібы Саламеі, лісты над дарогай.
І лялькі ў батлейцы мячамі драўлянымі б'юць
У сэрцы драўляныя
пад заахвочвальны рогат.
Мой бедны сусвет прывыкае да смерці сваёй,
Сыгранае весела
дробнымі стодамі славы.
Дарогі пыляць,
бы згараюць сляды за табой,
І межы стаптаныя
між балаганам і явай.

www.kalikat.org

Скокі смерці

1

Раскрыліся ізноў зямлі глухія нетры.
І блазан, і кароль — у скокі Смерці — кроч!
Шалёны карагод кругі кругамі мерыць.
І ўсмешкі ўсё шырэй, бяздонней погляд воч.
І біскуп, і рабін, і вулічная дзеўка —
Не выдзерці з рукі скалелую руку —
Імчаць за кругам круг.
Сатлелыя павекі
Не скрыюць ад вачэй пустых —
апошні круг.
Нябачны барабан прыспешвае кружэнне.
Кашчавы дырыжор з бліскучаю касой
Свой аглядае баль.
Ні жалю, ні ўзрушэння.
Такі вось насамрэч на могілках спакой.

2

І трэсне мармуровая пліта,
І бронзавы анёл стаіць без німба...
Але ўсё тая ж звонкая вада
Цячэ з нябёс на земляныя глыбы.
Жывыя ладзяць могілкі сабе.
Нябожчыкам яны наўрад ці трэба.
І смоўж паўзе па бронзавым ілбе,
І хмара прапаўзае выспу неба.
Ад штучных кветак глебе не ўтравець.
Яна сваю маўкліва робіць справу.
Скранецца крыж, пахіліцца ледзь-ледзь —
А ўжо няма пад ім цялеснай стравы.
Прысядзе на жалезны прэнт груган,
Стамлёны ад бясконцае здабычы.
І мармурова-бронзавы спадман
Сатлелай плоці не надасць аблічча.
Усё, што мае памяць,— у зямлі,
А што ў зямлі — то сталася зямлёю.

І хмары, быццам душы, паплылі
Над будучай магілаю маёю.

3

Усе Там будзем.
Ну, а можа, Там
Для кожнага Сусвет пачнецца ўласны
І ўсё, што тут любілі, здасца нам
Не вартым чарапкоў разбітай вазы.
Старонкі «Кнігі мёртвых» загарні —
Той шлях яшчэ ніхто не прадугледзеў.
Хітон манаскі раздзімае вецер
На целе завадатара вайны.
Ні па сузор'ях, ні па страшных снах
Не вылічыць сцяжынкі пазасветнай.
Ні пірамідаю, ні стодам медным
Душы зваротны не пазначыць шлях.
Дарэмна свечкі, быццам маякі,
На беразе Дзядоў мігцяць уночы —
Душа са сцежкі прывіднай не збочыць,
Пясок бяссіла ссыпецца з рукі
Таго, хто на сустрэчу спадзяецца.
Ды спіць змяя там, дзе палала сэрца.

4

Паламаныя крыжы.
Абамшэлыя глыжы.
Штучных кветак мёртвы шэпат.
Шэры мокры саван неба.
Гэта могілкі мае,
Дзе мне месца не стае.
Тут закон людскі, не Божы.
Месца купяць толькі грошы.
Праху прах стаўляе стод.
Невідочны душ палёт.

5

О мой кароль!
Хто спіць з табою побач,
Пад цяжкім слоем мокрага пяску?
Цяпер твая ўлюбёная Еўропа
Кавалачак — як выцягнуць руку.
Праз краты надмагільнай агароджы
Глядзіш ты, умураваны ў камень.
Там, у пяску, ты не такі прыгожы,
Дзе згусла не тваёй дзяржавы цень.
О мой кароль! У коле краявідаў,
Пакрэсленых крыжамі, цяжка мне
Знайсці шкадобы да магільных плітаў
І да гардыні, што пад імі тхне.

6

Мармуровыя анёлкі плачуць з бронзавых нябёсаў.
Слёзы іхнія, як шкельцы, разбіваюцца аб дах
Цемнатварага касцёла.
Ну а дожджык ходзіць босы,
І крывавыя пялёсткі на яго гараць слядах.
На магілках жухне траўка, агароджы іржавеюць.
А з анёлкаў мармуровых ані перайка не ўзяць,
Каб з крывавай гэтай гнілі, з гэтай восеньскай завеі
Да нябёснай цвердзі ўзняцца, хоць на хвілю ачуняць.
Мармуровыя анёлкі, белавокія, як рыбы,
Шлях ад могілак вартуюць да сваіх цвярдых нябёс,
Каб няўрымслівыя душы не імкнуліся да німбаў
І навек замкнуўся ў кола кожны, крыл не варты, лёс.
Я праходжу па сцяжынках, пратаптаных ледзьве бачна,
Між пагоркаў і каменняў.
Шкло хрумсціць, ліецца дождж.
Мармуровыя анёлкі над маёй радзімай плачуць.
І сляза шкляная рэжа сэрца мне, нібыта нож.

7

Не сыплюць іскры зорнага агню,
І цені не з'яўляюцца з бясчасся.
Я нават іх ніколі не прысню,
Каб Гамлетавай запаліцца жарсцю.
Усё мінае, нават небыццё.
Цяперашніх імгненняў не бывае.
Яны мінаюць, зносячы жыццё,
Нібы лісцё, дзе вогнішча палае.
І па той бок ад попелу адно
Ёсць тло. А душы — з дымам адляцелі.
І сцежкі праз нябёсы не відно,
Куды дарэмна прагнуць нашы целы.
Самотная, над вогнішчам стаю.
Жыццё згарае. Дым імкнецца ў неба.
Але трымае плоць душу маю,
Як над агнём пруток — скарынку хлеба.

Карціны

Гэта радасць мая, гэта — гонар і боль.
Гэта — праца і сон, гэта — зорнае неба,
Палатно і алей, дар прарочы, любоў.
Ды карціна — прададзена будзе для хлеба.
Дзе вы, сны ўвасаблёныя, часткі душы?
На шпалерах ці ў склепах, на смех — ці пашану?
Прадаваць свае творы — дык лепей не жыць.
А стварацъ для сябе — дар нябёсаў паганіць.
З вас сціраюць служанкі анучамі пыл,
Не ўспрымаючы мовы і вобразаў вашых.
Я прадаў — і таму я рамеснікам быў.
Я мастак — і таму гэты продаж мне страшны.
Сонца з месяцам дзеляць накрыж палатно.
Толькі сонца — заходняе, месяц жа — ветах.
І ўсміхнуўся чырвона-срабрысты анёл
На карціне, нявольніцкім пэндзлем сагрэтай.

Два салаўі

Калыханку зямной прыгажосці і смутку
Салавей імператару больш не спявае,
Ціха круцяцца колы —
нягож не па бруку,
Па разбітых дарогах каханага краю.
Для вандроўных артыстаў закрыты сталіцы.
Толькі штучныя птахі не ведаюць межаў.
Светлы князь на мядзведзях па солі імчыцца,
Ад халопскіх «віватаў»
уздрыгваюць вежы.
Лепей збочыць.
Не ў княскіх аздобленых клетках
Салаўіная песня ліецца на золку.
Калыхае дарога загадку Сусвету,
Нашы колы грукочуць
ад баляў далёка.
І блазенскі Хрыстос
у вазку балаганным
Сам сабе крыж рыхтуе
і марыць пра зоры.
Завадны салавей распявае старанна
У палацавай мёртвай замкнёнай прасторы.

Нямое кіно

Калі кінематограф перастаў
Быць чорна-белым і нямым — адразу
Старых артыстаў скінуў п'едэстал,
І не ўтрымаць цяжкое кола часу.
Ах, геніі нямых кінакарцін!
Якія жэсты і якія страсці!
Як погляды гарэлі! А ў жыцці
І твар, і голас кожны з іх растраціў.
І смешныя былі яны, нібы
Сляпыя кажаны, прарокі ночы,
На дзённым сонцы. Не лятаць сляпым
І зморшчыны ніводнай не сурочыць.
І наш нямы адчай, нямы імпэт,

Відаць, ненатуральнымі здадуцца:
«Чаму пра тое так крычаў паэт,
Што зразумелым век было і будзе?»
Але, як бронзу — пацінай, і нас
Прыкрасіць час налётам рамантычным.
...Дрыготкі, як матыль, нямы экран,
Старых акцёраў боскія абліччы.

Мніх

Усё жыццё ён маляваў святых.
Спярша — падмайстрам — тоўк у ступе фарбы.
Цярплівай працай юных дзён сваіх
Вучыўся адганяць грахоў завабы.
Пасля няўмелым пэндзлем — дзень за днём —
Фон рыхтаваў да фрэсак...
Потым доўга
За майстрам дамалёўваў... І агнём,
Цяжкім агнём
гарэлі вочы Бога.
А па начах у вузкае вакно
Маленькай келлі заглядалі зоры,
І пахла ноч дажджамі і віном,
І хвалявалася трава, як мора.
І Бог глядзеў з нябёсаў, як святло,
Само святло — што абразы прад гэтым.
І разуменне ў гэты час было
Між небам — і любым зямным паэтам.
А раніцой званіў няўмольны звон,
І зноў чакала праца і малітвы...
І мніх старэў...
Славутым стаўся ён...
І абразы яго стваралі дзівы.
У кожным з іх была схавана ноч,
Зямная ноч за сценамі кляштара,
І мора траў,
і зарапад,
і дождж,
І ўсё жыццё,
што пражылося ў марах.

Камедыя дэль артэ
для турыстаў

Павуцінне змецена з карцін,
Цень паўднёвы ў белым кубку тоне.
Глянь, як абадраны Арлекін
Лупіць залатога Панталоне.
А П'ерэта плача цэлы дзень,
Каламбіна ж з гэтага смяецца.
З кубка выпівае горкі цень
Крэйдавы П'еро з разбітым сэрцам.
Цені кіпарысаў, як мячы,
Недзе скрыжаваныя ў прасторы.
І ніхто не можа памагчы
Маску зняць і акунуцца ў мора.
Аўтар, ты не зменіш амплуа,
І не стане сумнай Каламбіна.
Дама плечы хутае ў баа,
І жандару цяжка з карабінам.
Сонца нізка. Скончаны спектакль.
Змоўклі гандляры. Пара дадому.
Скрозь звязаны з цёмных нітак шаль
Шоўк стракаты не відзён нікому.
Вось і ўсё. Навошта аўтар тут,
Дзе іграюць маскі, маскі, маскі...
...Мне карціну, дзе Апошні Суд,
Загарніце добра, калі ласка.

Антракт

Працягу не будзе.
Вяртайце білеты, панове.
Джульета памерла
яшчэ да з'яўлення на сцэне.
Стары драматург
скарыстаў свой аловак да кропкі,
Якім сто партрэтаў стварыў
маладой Мельпамене.
І ролі няма мне на сцэне,
стаптанай да бляску

Абцасамі ўсіх,
                штo шукалі высокае долі.
Будзённае сёння здымае катурны і маскі,
І ўсіх абдымае
                крыжамі парослае поле.
Прынцэсы занятыя
                варкай гарохавай кашы.
Куды мне падзецца
                з маёй папяровай каронай?
Кардонная поўня ляжыць у маім сакваяжы,
А з ёй — арсенал
                дасканалых усмешак і стогнаў.
Але — у тэатры пакуль што
                адкрыецца рынак,
Маленькія эльфы з грымёрных
                выносяць люстэркі.
Тэатр не закрыты, панове.
Але перапынак
Надоўга зацягнецца,
                мусіць, да лепшага веку.

Балаган

Пажоўклая трава. Не звяў адзін палын.
Мядзедзь на ланцугу пляцецца за павозкай.
Гірляндам штучных руж натомлены факір
Бліскучасць надае пры дапамозе воску.
Зялёнае трыко цыруе акрабат.
А збоку, ля калёс, маленькая цыркачка
Смяецца і пяе пра салаўіны сад,
Падкідваючы ўверх жанглёрскі сіні мячык.
Заўсёды будзе хлеб — іх не пакіне Бог.
Навошта сумаваць?.. Іх рамяство — вясёласць.
Вазьміце і мяне ў апошнюю з дарог,
Абрыд мне балаган, дзе тонкасці гавораць.
Абрыдла фальш вакол, разумнасцей смуга,
Куды там зорку ў лоб — задавальняйся шнарам.
Мне спрыту не стае. Смяецца балаган.
Ды за пацеху ў ім не кідаюць дынары.
Парыпвае вазок, пагруквае ланцуг...

Дзяўчынка ўсё пяе пра салаўя і ружу.
А песня ўсё далей... Асоту белы пух
Услед за ёй ляціць між аблачын і лужын.

Сад вады

У «Смарагдавых табліцах» Гермеса сцвярджаецца: «Усё ёсць ва ўсім, усё мае палюсы, усё дваістае, усё цячэ, зацякае, выцякае, усё падымаецца і падае».

Так, вада ёсць, прынамсі, ва ўсім жывым. Яна дваіць адбіткамі сусвет. Цячэ... Падымаецца ў неба аблокамі і падае ўніз дажджом... Можа быць ільдом і кіпенем... Але дзе полюсы вады?

Людзі заўсёды стараліся заснаваць паселішча на беразе ракі. Вада, якая цячэ, нясе з сабой энергію, якая робіць чалавека дзейсным, цікаўным і вынаходлівым. І няма нічога згубней застаялай, цвілой вады. Тое, як гарады абыходзяцца са сваімі рэкамі, вызначае і іхні лёс. Змяняць лёс ракі — усё роўна што мяняць на далоні лінію жыцця.

Менск пахаваў сваю раку жыўцом.

У псіхааналітыцы вада, мора — сімвал Неўсвядомленага, застрашлівай і прыцягальнай стыхіі. Працэс індывідуацыі, набыцця цэласнасці асобы, немагчымы без яднання свядомасці з Неўсвядомленым.

У Беларусі ўжо некалькі стагоддзяў, як няма свайго мора.

З чатырох гісторый, варыяцыямі якіх, паводле Борхеса, з'яўляюцца ўсе гісторыі свету, дзве звязаныя з вадой. Адна — пра вяртанне, падарожжа Уліса праз сусветныя воды да роднага вострава, другая — пра пошук, вандроўку Ясона па залатое руно. Дарога па зямной цвердзі канкрэтная, пераадольваецца механічнымі, матэрыяльнымі намаганнямі. Дарога па вадзе — сама стыхія, воля багоў. Таму жаданая мэта заўсёды «за морам-акіянам».

Вада — мяжа. Мост альбо човен — сродкі пераходу, пераправы ў іншы свет. Першы мост — паваленае дрэва, карэннямі да зямлі, адкуль ідзеш, галлём — туды, у той свет.

Любы чалавек, калі стаіць на мосце і глядзіць на ваду, робіцца філосафам. Чамусьці ў нас пры гэтым прынята ў тую ваду пляваць. Можа быць, каб паназіраць, як разыходзяцца кругі?

Людзі — вастравы. Чаму ж мора вакол кожнага з нас такое рознае?

У кнізе парад юным натуралістам, напісанай французскімі аўтарамі, ёсць раздзел пра тое, як стварыць уласную невялічкую сажалку. Дастаткова выкапаць яміну, умацаваць яе дно і сцены глінай альбо іншым шчыльным матэрыялам і пасадзіць водарасці. А насельніцтва ў гэтым штучным вадаёме з'явіцца само.

Апостал Пётра прайшоў за Настаўнікам па вадзе. Адзіны з усіх святых апосталаў, ён намацаў тую сцяжынку, па якой ішоў над безданню Хрыстос. Зноў і зноў людзі спрабуюць намацаць тую сцяжынку. І патанаюць.

Вада — блаславенне і праклён. Як у кожнай стыхіі, у ёй няма дабра і зла, дабром ці злом яе робяць людзі. У Лошыцкім парку нас з дзецьмі даганяла страшэнная навальніца. Чорная хмара сцяной гнала перад сабой вецер. Мы разам з яшчэ некалькімі мінакамі дабеглі да кальцавога прыпынку. На шчасце, якраз пад'ехаў пусты тралейбус. Спыніўся... Дзверы не расчыняе. Людзі тоўпяцца, нервуюцца, бо ўжо на галовы падаюць першыя цяжкія кроплі, бліскае маланка... Страшэнна задаволены адчуваннем уласнай значнасці і лёсавырашальнасці кіроўца вытрымлівае паўзу. А залева ўжо на падыходзе... Вось-вось мы апынемся ва ўладзе нябеснай вады... Нарэшце дзверы літасціва расчыняюцца. Адзін з пасажыраў гучна гаворыць: «Даверылі дурню кнопку...»

Часта даводзіцца ўспамінаць гэтую фразу...

Беларусь атаясамляюць з вазёрамі. Сінявокая, маўляў, вазёрная краіна... Але варта зняць гэтую лічыну, адкрыецца ейны сапраўдны твар — з зялёнымі вачыма балатоў...

Калі, паводле старой медыцыны, у крыві пераважае вада — флегма, чалавек з'яўляецца па тэмпераменце флегматыкам. Тым самым, з анекдота: «Іду. Чую, ззаду кагосьці б'юць. Паварочваюся — мяне». Але стыхія флегматыка — не рака і не мора, а балота.

Адзнакай вышэйшай улады ў людзей заўсёды лічылася здольнасць утаймоўваць водную стыхію. Узвядзенне моста рабілася рытуалам, лічылася богаўгоднай справай. І як сімвал чалавечай грахоўнасці, варожасці — з'явіліся пад'ёмныя масты замкаў.

У парку Горкага быў цудоўны круглы фантан, па краях якога сядзелі зялёныя металічныя жабы. З іх ратоў струменіла вада.

Сёння ў фантане — пясочніца. Жабы, аблезлыя, запыленыя, разяваюць раты ў агоніі смагі...

Можа быць, самае складанае, калі вучышся плаваць,— навучыцца глядзець у вадзе. Неадольна страшна раскрыць вочы ў іншай стыхіі, у іншым свеце. Нават калі гэта — вада ў тваёй уласнай лазенцы. Дзеці падчас купання плачуць і просяць рушнік — закрыць твар, каб вада не трапіла ў вочы...

Гэта толькі ілюзія, што асноўнае жыццё — на сушы. Мы не маем і цені ўяўлення пра тое, што ёсць у стыхіі вады.

У расійскага пісьменніка Міхаіла Анчарава ёсць параўнанне таленту з рыбай, якая плавае не таму, што робіць пэўныя рухі, а таму, што ў яе ёсць плавальны пузыр. Рыба плавае нават мёртвая.

А мы ўсё раўнуемся з птушкамі...

У казках ёсць вада жывая і вада мёртвая. Мёртвая вада, нягледзячы на назву, валодае здольнасцю зрошчваць пасечанае цела, якое пасля аджывіць вада жывая.

Які яшчэ мярцвейшы дождж павінен праліцца на нашу зямлю, каб яна зраслася ў адзіны арганізм, з адной душой і адной свядомасцю?

І дзе пасля ўзяць жывой вады?

* * *

Жыць — для таго,
каб слухаць шум дажджу...
Ты скажаш, мала? Ну а мне — даволі.
У гэтым свеце рогату і болю
Я болей анічога не хачу.
Памкніся ўверх — трымаюць за крысо
І кажуць, што ратуюць ад спакусы.
І словы іх — як вострае лязо,
І пацалункі іх — нібыта ўкусы.
А за вакном ліецца дождж, як лёс,
Ён анікому ані ў чым не вінны.
У свеце сноў і немагчымых кроз
Цвіце мігдал і ззяюць апельсіны.
І можна проста так спяваць пра ўсё,
Не баючыся, хто і як успрыме.
І без руна вяртаецца Ясон,

І спачувае
радасна
сябрына.

* * *

Хоць уласнай крывёй пішы —
а яны падумаюць — фокус.
Мала жыць, для таго, каб быць
ім цікавым,— памерці трэба.
Не пяройдзеш сваю мяжу;
не зірнеш праз чужое вока.
Без Харона не пераплыць
Чорнай рэчкі і наша неба.
У далонях паднесці мёд
да каханых сасмяглых вуснаў
І ўсвядоміць: запозна ўсё.
Толькі воцат яму давалі.
І сплывае за годам год.
І ўсё менее беларусаў.
І кароткі, як верш Басё,
шлях, які мне падаравалі.

* * *

Усё паўторыцца. Але не для мяне.
Дажджом цыганскім шчасце праміне.
І золата дажджынак не збярэш
Ні ў прыгаршчы, ні ў свой тужлівы верш.

* * *

Колькі разумных!
Ніколі не скончыцца восень.
Як паважаюць сябе!
Не згарае лістота.
Юрад праходзіць па сцежцы бетоннае босы,
Ён размаўляе з нябёсамі.
Ён не самотны.

Колькі выбітных!
А ў лужынах плавае лісце.
Нехта ілбом сагравае аконную шыбу.
Кветкі ў празрыстай абгортцы гніюць на граніце,
Дзе пасадзіў генерал персанальную ліпу.
Колькі тут помнікаў!
Восень прастуе праз горад.
Дзеліцца юрад з варонай кавалкам батона.
Людзі вакол мікрафона разумна гавораць
І захлынаюцца розумам ля мікрафона.
Сыплецца дождж і лістота на бедныя душы.
Кроплі на дахах бляшаных грукочуць, што кулі.
Юрад кружляе паміж лістападу і лужын.
Словы нячутныя ў небе над ім патанулі.

* * *

І не варта жаліцца, відаць,
Што чагось не выпала спазнаць.
Толькі гэты вось халодны дождж,
Важны, як венецыянскі дож,
Толькі гэту восень, гэты сум
Я з сабой у вечнасць аднясу.
Прагучыць між воблачных аліў:
«Ці было халодна на зямлі?»
Адкажу: «Усё, што там было,—
Восеньскае чыстае святло...»

* * *

У каўчэгу начной цішыні
Адплывае самота мая.
Пагасаюць у вокнах агні.
Спіць павук у гняздзе салаўя.
Горад спіць, як паранены вой,
Са смаўжом на каменным шчыце.
Адплываю з начной цішынёй,
І не знойдуць мяне анідзе.

Максім Багдановіч

Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі...

Дождж размаўляе млява, як сухотны,
Халоднаю рукой шчаку кране...
Туга... І ў дружных позірках — маркота.
Усе баяцца смерці — ува мне.
Не размаўляй са мною, каляжанка,
Бо шкадаванне ў позірку тваім,
Бо ўжо ля брамы чорная фурманка,
І ў ёй не будзе месца нам дваім.
Адна зямля не згідзіцца хваробай,
Святая самадайка... Божа мой,
У цэнтры неспазнанае Еўропы
Ці ўдасца легчы мне на супакой,
Ці і за брамай здоўжыцца блуканне,
І дзе душа ўсплыве мая, калі
Шукаць маю магілу нехта стане,
Бы той гаршчок ў Егіпецкай зямлі.

* * *

Ну што ты плачаш, браце мой!
Твой плач таксама бескарысны.
Памрэ травінка пад нагой,
Змяшае дождж усе абрысы,
І не абудзіцца ні ў кім
Трывога, што цябе згінае.
Мы — не агонь, мы — толькі дым,
Які агонь жыцця хавае.
Разумных больш, чым добрых, тут.
Ты не дакажаш ім нічога.
Твая гравюра «Страшны суд» —
Ад мастака, а не ад Бога.

www.kamunikat.org

* * *

Я — гэта я... Маленькі востраў,
Дзе толькі вежа над пустэчай,
Дзе толькі зоркі над пагостам,
А крыжам стане толькі вечнасць.
Я — гэта час, які скруціўся
Клубком, каб весці вас да цмока...
Я — гэта восеньскае лісце,
Што ляжа ўсё пад ногі Бога.

* * *

Калі пачынае сэрца
стукаць у рытм дажджу,
Калі пачынае восень
здавацца жалобна шэрай,
Калі мне раптам здаецца —
пішу я ці не пішу,
Нікому тут не цікава,
нікому тут не патрэбна,—
Калі пачынаюць думкі
сплятацца ў сіло залеў,
Калі скрозь шэры іх вэлюм
не бачна замкавых вежаў,
Я проста кажу: «Прабачце, мне трэба ісці далей,
Туды, дзе блакіт і золата,
дзе Той, каму я належу...»
Калі пачынаю верыць
у сэнс сваёй мітусні,
Калі пачынае сшытак
палохаць пустой старонкай,
Я гэты свет перагортваю,
нібы прачытаны ліст,
І бачу блакіт і золата
над замкавай вежай гонкай.

www.kalinka.org

Галернікі

Над намі зноўку ліецца кроў,
Прасочваецца між дошак
На потныя спіны.
І кроў, і зноў
Бязлітасны плётак пошчак.

Каго дагоніць наш карабель —
Навек абвянчае з морам.
А ў нашых жылах не кроў цячэ,
А стома, вечная стома.

Каго дагоніць наш карабель —
Той болей нічым не будзе:
Майно — забойцам, штандар — вадзе
І лаўкам галерным — людзі.

Нікога, нікога нам не шкада,
Нічога няма на свеце,
Што вартае жалю.
Вакол — вада
Бязлітасная і вецер.

Рабам — рабамі другіх рабіць —
Адна што бадай прыемнасць.
І трэба мора вёсламі біць,
Прыспешваць зла непазбежнасць.

Але аднойчы жахлівы крык
«Ратуйцеся!» — ноч прарэзаў.
І наш прыганяты кудысьці знік,
І мы прыўзняліся з месцаў.

І нейкія людзі да нас сышлі
З паходнямі, нібы суддзі.
«Каго вазілі, ведалі вы?
Што з вамі рабіць мы будзем?»

«Рабы мы!» — крыкнуў адзін, другі,
«Рабы!» — ды словы павіслі:

www.kamunikat.org

«Зірніце! Вашыя ланцугі
Даўно іржа перагрызла».
...Яны пайшлі. Засталіся мы
У цемры смярдзюча-мокрай.
...На золку новыя ланцугі
Ізноў абудзілі мора.

Зоська Верас

Шаргацяць па дарозе
чыесьці самотныя крокі,
Праплываюць між зорамі
чоўны заманлівых сноў.
Высыхае надзея,
нібыта слязінка на воку.
І ніхто не пастукае
і не напіша лістоў.
Гэта ноч, гэта дождж,
гэта восень — сярэдзіна лёсу.
Але ўся Беларусь
сон-травою нібы парасла.
І на Млечным Шляху
грукацяць нетаропка калёсы —
Ад'язджаюць Мятлушкі,
якім не хапае цяпла.
Адлятаюць у вырай,
далей ад халоднай Айчыны,
І аблокі, і птушкі, і кнігі,
і нават сябры.
Ну а мы застаёмся
ўслухоўвацца ў крокі начныя.
Ну а мы застаёмся —
і будзе вясна на двары.

* * *

Яшчэ лісты зялёныя зусім,
Ледзь вершаліны жаўцізна кранула,
Яшчэ не адпаўзае горкі дым

Ад гурбаў, у якіх вясна паснула,
Але чамусь перастаеш чакаць
Цудоўнага здарэння ці сустрэчы.
І Папялушка стукае ў палац,
Старой хусцінай ахінуўшы плечы.
Ліст, на які запозна адказаць,
Гарыць — асенніх вогнішчаў правобраз.
Чаго, дурніца, просішся ў палац —
Твой прынц ужо даўно стары і хворы.
І туфлікі з бутэлечнага шкла
Пазвоньваюць у фартуху самотна.
Цябе вядзьмачка-восень уракла.
Спазнілася ты, дзеўка, незваротна.

* * *

Ты хочаш паратунку? Ён — у тым,
Каб лісцем жоўтым вогнішча распальваць,
Каб валасы каханага між пальцаў
Цяклі, нібы струмень марской вады.
Ты хочаш паратунку? Ён паўсюль
Разліты, як святло між чорных ценяў.
Ён — у марэнні, ён — у летуценні,
У здольнасці стаіцца, быццам нуль,
Каб выбухнуць, як вогненнае кола,
Усё аддаць — і не чакаць адказ.
Ты хочаш паратунку? Ён — у волі
Скарыць сябе таму, што хоча Час.

Трывога

Апошняе шчасце, якое не дадзена нам,—
Спакой, што даецца нам верай
у сэнс існавання.
Трывожныя сёння —
трывожыцца будзем і там,
Дзе справы зямныя завершыць
ніхто ўжо не ўстане.
У шыбах кавалачкі неба —

наш бедны Сусвет.
Мой рыцар свой шлем
не маёй упрыгожыць пальчаткай.
Ніколі не бачаны,
ціха спявае сусед,
І гучна пляткараць
Пандоры цікаўнай нашчадкі.
Трывожна... Трывожна...
Дзе праўда біблейскіх лілей,
Затона, што іх,
бесклапотных і светлых, люляе?
Мне цьмянае «заўтра»
за горкае «сёння» бліжэй,
І роздум, як мёд верасковы,
мяне наталяе.
Падманлівасць ісцін,
няпэўнасць агнёў гарадскіх.
Халодная праца дажджоў
размывае ўсе межы.
Апошняе шчасце трывог і маленняў маіх,
Зямное, жаночае шчасце
мне ўсё-ткі належыць.

Страла

У вадзе халоднай праплываюць цені.
Човен серабрысты зачарпнуў вады.
І вясло сплывае, і стралок пацэліў
У другую постаць.
Зловяць чараты
Тонкімі рукамі
ўцекачоў знямелых.
А стралок устане з мокрае травы,
Абтрасе адзежу,
пералічыць стрэлы
І па грошы пойдзе
ў замак радавы.
Спіць срабрысты човен
у тумане срэбным.
Прада мной — папера, а ў руцэ — агонь,

І праз белы аркуш праплываюць цені,
І стралок у лозах
грэе, трэ далонь.
Дай паплыці думкам
срэбнымі радкамі —
Знойдзецца да сэрца
востры шлях стралы,
Замак, дзе заплацяць,
і магільны камень,
І анёльскіх, белых, лёгкіх
два крылы.

Вясна

Халоднае сонца маёй бласлаўёнай зямлі.
Сціскаюцца, нібы ільдзінкі,
маленькія лёсы.
Разбілася птушка
аб шэрую шыбу нябёсаў,
І кветкі барвовыя спеюць на голым галлі.
Пабелка на сценах касцёла —
у кроплях смугі,
Два прывідныя мніхі
ідуць па былой Францысканскай.
Гранітны пісьменнік у парку прыдумвае казкі,
І стрыжаны пудзель
прысеў ля ягонай нагі.
Вясна ў мегаполісе дыхае ў рытме сухот,
За кволыя дрэвы хапаецца, каб не зваліцца.
І выпіты з вуснаў кахання атрута і мёд,
І нават на вершы забытыя можна забыцца.

Вужыная каралева

Я вужынай каралеваю стала.
І карона ў валасах маіх ззяе.
І абсыпаў зорны попел сукенку,
І хлапцы адводзяць сумныя вочы.
Што за лёс мяне спаткаў незвычайны!

www.pamuzhat.org

У бурштынавым жыць буду палацы,
Дзе русалкі падмятаюць падлогу,
А на ложку расцвітаюць лілеі.
Што ж вы шэпчаце ў спіну мне: «Вар'ятка»,
Людцы дробныя, палоннікі працы?
Вам не мець такой хады ганарыстай,
Вашым жонкам не насіць гэткіх стужак.
Вось і ты, нябога, даўні каханак,
Занурыўся, за вярсту абыходзіш.
Я забылася, як бегла да рэчкі,
Я забылася, што зраніла сэрца.
Так высока над табой я паўстала!
І карона вужынай каралевы
Асляпіла і цябе, і астатніх,
Бо чаму я чую нашапы вашы:
«Папсаваў вадзянік бедную дзеўку,
Там, на дне, яна пакінула сэрца
І за сэрцам мусіць хутка вярнуцца».
Што ж, шапчыце, вы не бачыце войска
Вояў гнуткіх у лусцы і бурштыне.
Вы не чуеце, як рог напявае,
Срэбны рог Вялікай Маці жывога:
«Каралева! За табою паслалі.
Каралева! Апранайся у белю!»

* * *

Нібыта жыццё сыходзіць —
кугічуць начныя птушкі.
Ніхто не адкрыў таямніцы —
як жыць шчасліва і ціха.
То ходзіш па тонкім лёдзе,
то сыплеш вуголле ў рукі.
То зноў здымаеш з паліцы
сваю апошнюю кнігу.
Ну што давядзеш сусвету,
пакрэсліўшы гэты аркуш,
Пад кожны радок кідаючы сэрца —
нібы пад нож.
Начныя птушкі-паэты

не пішуць для белых клавішаў.
Іх песні — як ноч над Нараччу,
як студні мсціслаўскай дно.
Вядома, і днём хапае
і шчэбетаў, і руладаў.
Ды часта бывае — людзі
не чуюць птушак сваіх.
І ноч нашы песні хавае,
захоўвае іх крылатымі.
І толькі той, хто абуджаны,
можа паслухаць іх.

* * *

Гэта — горад карынфскіх калон,
Ордэн рыцараў змененай веры.
Збудаваны з пяску Вавілон,
Быццам неба асенняе, шэры.
Тут, за сценамі цёмных дамоў,
За кулісамі вечных трагедый
Адлятаюць самотныя зноў
І нічога не чуюць суседзі.
Бедны храм мой ля ціхай вады.
Толькі ты ў гэтай сварцы — лагода.
І ўзлятае твой крыж залаты,
Быццам хоча зляцець назаўсёды.
І вядзе мяне твой херувім —
Дождж змывае з яго залачэнне —
Пад узвышаным ценем тваім
Я прымаю другое хрышчэнне.
І нічога мне тут не шкада,
І нікога я тут не баюся.
І сцякае па твары вада,
Быццам дотык самога Ісуса.

2000

На верхняй прыступцы стагоддзя,
якая вядзе

Зусім не да неба —
а значна ніжэй і бяздонней,
Знікаю ў халоднай самоце, нібыта ў вадзе,
І падае цень ад крыжа на маё падваконне.
На верхняй прыступцы стагоддзя
прытулку няма.
Таму што адбыўся падзел
на крылатых і слізкіх.
А я — на мяжы,
я не здольная выбраць сама,
Куды падавацца
ад гэтай мяжчасавай рысы.
Мне добра і тут.
Праплываюць сузор'ї і дні,
а дні — як эоны,
А я — перачытваю казкі
На верхняй прыступцы стагоддзя,
пры зорным агні,
З наіўнаю верай
у сілу спагады нянаскай.

Апакаліпсіс

Пакіньма размовы.
Планеты выстройваюць крыж.
Анёл пралятае, няўважна губляючы пер'е.
І кожнага ноч ахінае — хто верыў, не верыў.
Крыж ззяе на небе.
А ты — у пакоі — маўчыш.
Апошняя кропля прымусіла ўпасці пацір.
Далёкая хваля нахлыне калісьці на горад.
А нехта цалуе, рабуе, разумна гаворыць,
І ў «Атласе свету» старонкі працёрты да дзір.
Мы там не сустрэнемся, дзе апынёмся пасля.
І нашы анёлы знясуць нас на розныя зоры.
І ў вокны вось-вось, як магільшчык,
пастукае мора.
Твар сонца закрыты.
Аслеплая гіне зямля.
Звер з хваляў выходзіць.

А мы ўсё маўчым і маўчым.
У цёмнай кватэры, у цёмнай хвіліне зацьмення,
Пакуль пераплавяцца ў цемру адзіную цені.
Архангел чакае.
І кроў у яго на мячы.

* * *

Не падкажуць на развітанне,
дзе чакае Харонаў човен.
Давядзецца самому крочыць
уздоўж балоцістых берагоў,
у цямрэчы, па самай твані,
з камарыным піскам над вухам
(я не веру, што ёсць балота —
хай за светам — без камароў).
Будзеш доўга ісці і падаць,
добра, сам сябе не пабачыш,
перапэцканага дарэшты.
Пад нагою нешта слізгае —
ці то жаба, ці то гадзюка —
што за клопат? Ты — ужо мёртвы.
Шлях бясконцы, гразкі і ціхі —
не пляскочуць у Стыксе хвалі.
Ну, каб ведаў — не паміраў бы.
Дзе басяцкі той перавозчык?
Анічога нідзе. І нават
разумееш — і не было.

* * *

Дзень высыхае, як сляза.
У сне стамлёным патанаю.
Жыву на вастрыі ляза.
Дождж не праліўся на Данаю.
Не здарыцца нічога тут —
Ні добрага і ні благога.
І не паверыць сведкам суд,
І не памілуе нікога.

www.kamunikat.org

Нашто, дакуль цягнуць свой лёс
Па гэтай кальцавой дарозе?
Няма ні дзён, ні чыстых слёз,
І меч ржавее на парозе.

Адысея

Мяне шпурляюць хвалі, хвалі, хвалі,
У думках свету заблукала я.
Чужыя хваляць.
Ну а сэрца паліць
Мая Ітака — Беларусь мая.
Мяне шпурляюць пад чужыя зоры.
Мяне не навучылі іх чытаць.
І адбірае душы мора, мора.
Вось і маю жадае адабраць.
На сініх кроснах выткана натхненне.
На сініх кроснах тчэцца прыгажосць.
Я ведаю — вярнуцца — не збавенне.
Забыты гаспадар — нязваны госць.
І аб каменні родныя разбіцца
Не дадзена.
Шуміць вада ў вушах:
Нічога я не памятаю!
Быццам
Кішэнь абрабаваная — душа.
А колькі нас, гаротных Адысеяў,
Не помніць шлях да родных астравоў,
Хто на чужыне ў глебу зерне сеяў,
Хто на чужыне ў неба рос травой,
Хто ноччу сніў пакутлівыя спевы,
А днём у кніжках лжывых іх шукаў.
О, колькі нас, гаротных Адысеяў,
І колькі ў небе безыменных траў!
Мая Ітака! Хвалі, мовы, словы
І гнеў багоў...
Дакладней — гнеў магіл.
І коцяцца не зоры, а галовы
Над шляхам паратунку і тугі.

Сад снегу

Снег — двойчы здраднік.

Калі ён захоўвае сляды для пагоні.

І калі замятае сляды, па якіх мусіш вяртацца.

Здрадлівая яго роўнядзь — пад ёй можа хавацца бездань. Падманлівая прыгажосць — здаралася, ад бляску снегавога поля людзі траціли зрок. Падступная пухнатая ўтульнасць — сон у ейных абдоймах вечны...

Чаму ж мы так радуемся першаму снегу? Можа, таму, што няхай здрадлівая, эфемерная, але прыгажосць і чысціня на нейкі час зробіць краявіды высакародней. Схаваюцца пад цнатлівым покрывам накіданыя пад вокнамі шматпавярховікаў цыгарэты, бутэлькі, рэшткі ежы ды іншыя сведчанні немудрагелістых жыццёвых праяў у сотах са штучнага каменю. Нешта чыстае з'явіцца ў нашым жыцці... Хаця б на хвіліну — пакуль не стопчуць, не заплююць, не перамесяць у брудную кашу.

Вам даводзілася першым ісці ад свайго пад'езда па снежным цаліку? Самы нерамантычны чалавек у гэты момант ператвараецца ў аднаго са сланоў Ганібала, чый піетэт перад снегам змусіў славутага правадыра да рэтырацыі. На чыстае наступіць немажліва! Бо тут яшчэ й страх шараговага чалавека быць першым. Чысціня — гэта калі яшчэ нікога — да цябе. І ты забіраеш яе кожным сваім крокам у таго, хто пойдзе за табой.

Нездарма ў некаторых плямёнах права пазбавіць нявесту цнатлівасці перадавяраецца жрацу.

Зіма ў горадзе хутка пазбаўляецца цнатлівасці. Армія цётак-брамніц з рыдлёўкамі накідваецца на нявінніцу гэтак апантана, быццам помсціць за ўласнае няўдалае жыццё. Хаця — хіба можна судзіць, чыё жыццё ўдалося, чыё не, паводле колькасці бруду, з якім давялося ваяваць?

Калі патануў «Тытанік», расейскі паэт Аляксандр Блок радаваўся: «Ёсць яшчэ акіян!» Цень тае патаемнай, грахоўнай радасці ў мяне, калі горад засыпаюць гурбы снегу, устаюць з абледзянелымі рогамі тралейбусы і нават машыны з браніраваным шклом і мігалкамі мусяць прытармазіць, пакуль з вартай жалю імітацыі сабвею не пасунуць стыхію.

Зімовая стыхія змусіла неяк спыніцца познім вечарам сярод пустэльных, заснежаных палескіх балот дзесьці за Салігорскам аўтобус, загружаны ўдзельнікамі дзён памяці Яўгеніі Янішчыц у Пінску. Яшчэ пару гадзін таму славутыя сталічныя госці

прысутнічалі пры закладзе саду на радзіме паэткі. Уласнаручна кідалі рыдлёўкамі па жменьцы грунту ў выдзеўбаную ў прамерзлае зямлі яміну, на карэнні бездапаможнага дрэўца, якое на адзіноце мусіла ўвасабляць будучы сад... Гарачыя прамовы, гарачыя выправы... І вось — адны замерзлыя балаты ды сляпучыя зоркі Палесся... Ды жоўты аўтобус польскай вытворчасці без сістэмы ацяплення, выдзелены фабрыкай «Камунарка». Ціха — чуваць, ак анёлы лётаюць. Ні машын, ні паселішчаў, ні мінакоў.

І ў гэтай інфернальнай сітуацыі вядомы паэт выходзіць з прамерзлага салона і хвілін праз дзесяць вяртаецца з маладзенькай дзяўчынай. Напэўна, яе можна было б палічыць матэрыялізаванай Снягуркай. Тым больш пад дублёнкай на Снягурцы не было нічога, акрым сукенкі са штучнага шоўку. Але казачны матыў перакрэсліваўся парэзамі, што прыкрашалі на спіне дублёнку чароўнай госці.

Аўтобус падаў прыкметы жыцця роўна апоўначы.

Пасля казалі, што машыны, якія развозілі іншых гасцей свята па другіх дарогах, гэтаксама без дай прычыны сапсаваліся і крануліся з месца толькі апоўначы...

Самае непрыемнае — гэта бачыць чырвоны снег. Мне здаецца, што зімой не павінна было быць вялікіх боек... І не таму, што зімой цяжэй ваяваць... У васемнаццатым стагоддзі беларуская шляхта памяняла традыцыйныя шаблі на чаканы — насаджаныя на доўгія дзяржальны «малаткі». Нібыта зброя менш смертаносная, чым шабля. Але ў выніку ў спрэчках між шляхтай народу пачало гінуць непараўнальна больш. Бо калі пасля ўдару шабляй лілася кроў, крыўда астывала. А пасля ўдару чаканам крыві не было відаць. І — білі, пакуль усе косткі не патрушчацца... Кроплі крыві на снезе крычаць.

У школе мы старанна выпісвалі ў вучнёўскіх сшытках: «Снегу многа — хлеба многа». Нам тлумачылі, што гэта добрая піянерская справа — будаваць у полі загародкі для затрымання снегу. Але паколькі палі былі далёка, а брудны гарадскі снег аніяк не мог паспрыяць павелічэнню хлеба, мы так і не здзейснілі сябе як піянеры-снегазатрымальнікі. Тым больш снег на нашай вуліцы быў карычневы. Труба завода ацяпляльнага абсталявання забяспечвала гэткі цікавы колер, як і арыгінальны водар, што дазваляў тубыльцам вуліцы беспамылкова вызначаць, з якога боку дзьме вецер.

Як толькі ў горадзе знаходзяць акраец чыстай снегавой паверхні, яго адразу прыкрашаюць цёмныя прамакутнікі — месцы, дзе выбівалі пыл з дываноў. Нібыта сляды ад гарчычнікаў на белай спіне...

Калі мне было гадоў пяць, у хрэстаматыі для дашкольнікаў я прачытала аповед пра дзяўчынку-чукчу. Чукча была савецкая, таму, безумоўна, жыла шчасліва і хадзіла ў школку да рускай настаўніцы, вучыцца мове старэйшага брата. Асабліва мяне ўразіла дэталь ейнага, чукоцкага, побыту. Выходзяць яны з маці раніцай са свайго чума. Доўгім вострым нажом маці наразае снег кубікамі і разам з дачкой назбірвае тыя кубікі ў чайнік. І ідуць гатаваць сняданак.

Я доўга шукала такі снег, які можна было б рэзаць нажом. Дакладна ўяўляла нават тое хрумстанне, з якім лязо заглыбляецца ў белую цвердзь. Але снег заўсёды быў нетрывалы, сыпкі, аморфны. Ён або змінаўся ў вільготны камяк, або рассыпаўся... А пры раставанні — нават самы чысты — ператвараўся ў такую брудную ваду, што гідка было ўявіць — выпіць яе, нават звараную...

У беларускай традыцыі снег яшчэ атаясамляўся са смерцю. Снег у вочы шчэ не падае — значыць, не нябожчык. Снег — сувязь з іншасветам... Гэта — шлях героя «Адвечнай песні» Янкі Купалы...

* * *

Снег... Дрэвы... Неба... Што яшчэ
Патрэбна, каб ісці — і выжыць?
Жыццё, бы кроў з рукі, цячэ,
І смерць-ваўчыца рану ліжа.
Бог не ўбярог — і вось сляды
Замецены, няма дарогі.
І неба — быццам твар бяды,
Які чарнее ад знямогі.
Ніводнай зоркі... Толькі снег
Каля мяне — зусім чырвоны.
Сплывае кроў. Сплывае век.
І дзеляць спадчыну вароны.

Лірнік

І не трэба дваіх — каб пачаць...

К. Каліноўскі

Дарога мая — ад цяпла да цяпла —
Праз белае сэрца зімы працякла.
Далёкія бомы, і блізкі агмень,
І хлеба кавалак, і шчасця прамень.
І продкавы цені, і чысты абрус,
І слаўная песня твая, Беларусь!
У панскіх палацах ці ў хатцы сляпой —
Дзіцячыя вочы гараць прада мной.
На пляцы, на хутары, плацяць ці не —
Зайграю — і ў небе штандар шугане,
Зайграю — і ўспомняць свой род слухачы.
А ты, маё цела, трывай і маўчы,
Таму што дарога — ад болю — ды ў боль,
І ў стозе начуе жабрацкі кароль,
І ў Бога начуе дух ліры яго.
І хопіць, каб край абудзіць, аднаго.

* * *

Загараецца першая зорка ад подыху ночы.
Забываецца першая радасць
у дні прамінулым.
Не разгледзяць далёкага шчасця
стамлёныя вочы.
Памірае пяшчота.
Сціхае атручаны вулей.
Пойдзем, браце, да зорак!
Нічога нас тут не трымае.
Бедны Йорык смяецца
апошняй кашчавай усмешкай.
У даведнік укладвае ружу
апошні рамантык.
І сівее ад крэйдавай фарбы
забытая вежа.

* * *

Ноч пачынаецца першаю смерцю.
Вокны анёл расчыняе імкліва.
Што адратуе ў бязлітасным свеце —
Кніга заклёнаў ці кніга малітваў?
Цяжка прызнацца — не бачу дарогі.
Цяжка змірыцца — не будзе світання.
Сцелюцца цені начныя пад ногі,
Быццам бы змеепадобныя здані.
Звон бранзалетаў па гулкай падлозе —
Сведкай кахання ці сведкаю смерці?
Падаюць рукі на коўдру ў знямозе
Абараніцца ад ночы ў Сусвеце.
Колькі дарэмнага сказана ўчора.
Колькі разумнага лёгка растала.
Вершнікі топчуць павержаны горад.
Душы ўзлятаюць над ідалам славы.

Варагі

У сябе зазіраць неахвота маленькаму вою.
Там нічога няма, у душы,
што названая вечнай.
Рассцілаюцца ў небе спісаныя лёсаў сувоі,
І замежнага князя ўсё кліча аблуднае веча.
Праплывае па самай паверхні снабачання ява.
Пазірае спалохана князь на чужыя натоўпы.
Быццам пластыр на рану,
прыліпла абрыдлая слава,
І змушае цягнуцца да ўзораў паважнай Еўропы.
Захлынаецца болем
чарговы маленькі паўстанец,
І нікога не збудзіць
яго пахавальная песня.
Перад князем русалкі
вясельны выконваюць танец,
І па новай труне
распаўзаецца белая плесня.

* * *

Дзверы не адчыняцца
ў той далёкі свет,
Дзе ідуць Дзіця і Леў
побач, след у след.
Дзе спявае Алканост,
папараць цвіце,
Забівае змея вой
з сонцам на шчыце.
На дзвярах туды замкі,
ну а тут — зіма.
І няма ў мяне ключа,
і мяне няма.

Адліжная ноч

Чорнае голле адліжнае ночы
Неба маё на шматкі падзяліла.
Босы Ісая аб чымсьці прарочыць
Пад ліхтаром ля бетоннай магілы.
Чым дасканаліцца ў гэтым сусвеце,
Звужаным да гарадскога пакоя?
Шыбы вільготны аблізвае вецер,
Дрэмле Айчына пад моцнай рукою.
Недзе, у выраі, родныя птахі
Думаюць, пэўна, ці варта вяртацца.
Спяць на разроўненых могілках гмахі,
Спяць на засыпаных рэчках палацы.
Плача Ісая. Праклён не пачуты.
Звыкліся людзі з прысутнасцю смерці.
Смерцю, змяшанаю з вулічным брудам,
Не напалохаць нікога на свеце.
Голае голле гайдаецца ў небе,
Вокны згасаюць, і шчасце далёка.
Недзе, напэўна, спакойней і лепей,
Толькі не там прамаўляюць прарокі.

Накцюрн зімовай ночы

Зімовая ноч —
гэта прывідны свет таямніц,
Дзе смяртэльная беля зямлі
не схавае пачуццяў.
Дзе пабліскваюць зоры,
як вочы наіўных дурніц,
Што гадаюць на шчасце,
якога ніколі не будзе.
Я чамусьці таксама ўзіраюся ў неба Каляд,
І спакуса нязнанага шчасця ў грудзях —
як ільдзінка.
І здаецца, што дзіўна далёка сягае пагляд
І ў патухлым вуголлі жыцця аджывае жарынка.
Бласлаўлёная снежная ноч! Безнадзейнасць твая,
Быццам лёд каля раны, лякуе трывожнае сэрца.
І нічога прыемней няма — ля вакна пастаяць,
Калі ёсць за спіною агмень і няцяжка сагрэцца.

Мора зімы

У белае мора зімы
адплывае наш човен.
І ў хвалях-сумётах знікаюць за намі сляды.
Хоць зораў не бачна —
ці трэба вяртацца, панове,
У злітыя восеньскім шэрым дажджом гарады?
Пад гэтым бязмежным,
бяздонным, як мроіцца, небам
Адзіная наша,
каханая наша зямля.
А недзе наперадзе
ў першых праталінах бераг
І дыхае хлебам
на поўныя грудзі ралля.
Над морам зімы
так высока праглянула зорка —
Нібы вастрыё скіраванай з нябыту стралы.
А мы даплывём,

даплывём да вясновага золку,
І стане бурштынам
апошняя кропля смалы.
І нават калі
неадольныя выпадуць сцюжы
І помнікам з лёду
паўстанем мы самі сабе —
Мы будзем дарогу паказваць
больш кемным і дужым,
І нехта па сцюжы
дарогу такую праб'е.
У белае мора зімы
адплываем, знікаем.
Таму што — жывыя,
таму што — тутэйшыя мы.
І хвалі сумётаў сляды паглынаюць за намі,
І наша зямля замярзае
пад морам зімы.

* * *

Ноч. Вясна. Анёл ляціць да зоркі.
Стома льецца па каменных вулках.
Растаюць, бы снег апошні, крокі,
Аркуш неспісаны гладзяць рукі.
Казачнік заўсёды беспрытульны.
Казкі ўсе яго — пра адзіноту.
Голле дрэў напятае, бы струны —
Хутка вымкне музыка лістоты.
Ноч. Вясна. У словах мала сэнсу.
Некрануты зноў мае паперы.
Белай крэйдай месяц нешта крэсліць
На асфальце, быццам стома, шэрым.
У каменных лабірынтах часу
Сны аб шчасці таюць, як аблокі.
Толькі я ізноў складаю казку:
«Ноч. Вясна. Анёл ляціць да зоркі...»

* * *

У краявідзе з жоўтым небам
Спакой, нібы лілеі сон.
Здаецца нават, што не трэба
Ляцець за марай наўздагон.
Скруціўся час, нібыта котка
Варкоча ўтульна каля ног.
Агмень гарыць, і цень дрыготкі
Як цень мной пройдзеных дарог.
А за вакном — жаўцее неба,
Снег не заплямілі сляды...
Спакоем наталіцца мне бы,
Яго не маючы гады,
Але па белым-белым полі
Імчыцца вершнік. Снег — як дым...
Што азначае слова «воля» —
Ніхто не ведае... Даволі,
Што паміраць так лёгка з ім...

Выгнаннікі

Глытай цішыню, як тапелец — ваду,
мой апошні...
Вось бляклая поўня над намі,
як згублены грошык,
Не выкупіць нават часцінкі забытага лёсу.
Мы з пекла сышлі —
ды сцяжынку згубілі ў нябёсы.
Цяпер успаміны,
як пластыр ад раны, здзіраем.
Як поўня свяціла,
як ззяла над кінутым краем.
І ў келіху, крыўдамі поўным,
быў водар ігліцы.
Мы поўныя келіхі выпілі —
і не напіцца.
Пад небам чужыны і мёд нібы воцат здаецца.
Мы ў неба сышлі —
ды ў Айчыне пакінулі сэрца.

www.kamunikat.org

Палуян

Што вам — мой боль?
Я б'юся, бы аб шкло
Мятлушка ў празе вогненнае смерці,—
Аб раўнадушша...
Словы ўсе — на вецер...
Іх зерне чорным смехам прарасло...
Мяне не чуюць,
як не чуюць смерць,
Пакуль не падыходзіць блізка-блізка...
Заторгнецца сумотных вершаў нізка
На шыі —
і няма куды ляцець...
Прабачце...
Я сыходжу ў небыццё
Па сцежцы, што пракладзена не мною;
Боль не дае гульні пабыць гульнёю,
А з болем гэткім —
гэта не жыццё.

У адсутнасці кахання

Вечарніца, воўчая зорка,
Пра каханне не нагадае.
П'е туман апусцелы горад,
Адзінокая спіць Даная.
Вечарніца халодна ззяе,
Працінае паганскай дзідай.
Цені танчаць у бальнай залі,
Рвуцца лёсаў самотных ніты.
Не, не тут, між каменных стодаў,
Можна квет захаваць купальскі.
Тут у ложы каменным воды,
Твой вянок не сплывае ў казку.
Тут усё адбяруць — да кроплі,
Да жарынкі жывой, да верша...
Не валун пасівелы ў полі —
А камень у падмурку вежы —
Абчасаны, умураваны —

Лёс — між лёсаў, слаўцо з гаворкі...
Ты забіла мяне зарана,
Вечарніца, Воўчая зорка.

* * *

Праз душу, праз восень, праз Сусвет
Праплывае шчасця сілуэт,
Прывідны і светлы, як анёл.
Толькі на дваіх накрыты стол,
І дваіх чакае цішыня.
Прыйдзеш ты — і будзе так штодня.
І нашто мне ведаць, хто ты ёсць,
Мара, спакушэнне, проста госць...
Можа быць, цябе зусім няма
І плыве не шчасце, а зіма.

Вечар у сямейным коле

Маўчанне ягнятаў
над светам, як саван, вісіць.
Сцяжынкі да вечных крыніцаў
схавалі завеі.
І ціхай размовы звіваецца
срэбная ніць —
Ад вока благога і немачы
сродак надзейны.
Як птушкі драпежныя,
рэдка мы любім спяваць.
Прарокі ўсялякія беды
натхнёна вяшчуюць.
І зноў не належыць нікому
найлепшы палац,
Таму што ў палацах у нас
не жывуць, а працуюць.
Заторгні фіранкі, дачушка.
У свеце такім
Найлепш адасобіцца
ў ціхай і беднай кватэры.

www.kanunikat.org

І Богу найлепшыя думкі свае прысвяцім.
І шчасце само да спакою
пастукае ў дзверы.
Наш востраў маленькі
над морам ваўчыных згрызот,
Магутнасць і веліч —
у шчырай любві чалавечай.
Сям'я ўратаваная —
і ўратаваны народ.
Гадуюцца дзеці ў любові —
ратуецца вечнасць.

1864

На ранішнім снезе ні следу —
дзівота!
Здаецца, ступіць —
быццам грэх сатварыць.
А чорны вярхнік
на шляху адзіноты
Па белым,
па сонечным полі імчыць.
Усё чысцінёй першароднай абнята.
Па грудзі каню —
шаргатлівы сумёт.
Да лесу спалохана
ціснуцца хаты,
А ранак празрысты звініць,
быццам лёд.
З хацінак ніхто
не выходзіць за дзверы —
А раптам пакліча
ці зойдзе вярхнік?
Прададзеным
цяжка ў свабоду паверыць,
Якую крывёй здабываюць для іх.
А хто здабывае?
З якой гэта ласкі?
Не, браце,
падмануць і тысячны раз.

www.kanonkat.org

Пра вымерлых волатаў
сумныя казкі
Больш блізкія,
больш дарагія для нас.
А лес набліжаецца.
Гурбы глыбеюць,
Глытаючы конніка разам з канём.
...Глухое рыданне:
«О Божа! Не вераць!»
Заціхла пад белым, як жах, дыванам.

Тарас Шаўчэнка

Падае снег на стаптаны жаўнерамі пляц.
Крок іх рытмічны, нібыта радок вершаваны.
Гэткія рытмы дыктуе паэтам іх час,
Словы паэта — як снег над зямлёю праданай.
Божа, не верыцца — колісь звяралі радкі
З плаўным антычным прыбоем,
з узмахамі вёслаў,
З тонкім лунаннем у танцы жаночай рукі,
З пошумам ветру,
з руплівымі рухамі кроснаў.
Зараз адзіны даступны свядомасці гук —
Крокі ўбіваюцца ў глебу
ды зброя ляскоча.
Ды не хапае ні кратаў, ні крыкаў, ні рук
Песню ўтрымаць,
што раўняцца па іншых не хоча.
Пляцамі, бы лішаямі, зямля парасла.
Уладары любяць шэрагі і пастраенні.
Пад барабаны прымервай узмахі крыла,
Чайкам дняпроўскім свае падары летуценні.
Стацца жывою магілай для фарбаў і слоў!
Выбіты пляц да адчаю,
да цвёрдасці смерці.
Там, дзе дняпроўскія чайкі —
жывая любоў,
Там аб сваім не забудуць ніколі паэце.
Крочаць па свеце жаўнеры, плячо да пляча.

Снег абсыпае —
і не растае на валоссі.
Час памірае ў той час,
як паэты маўчаць.
І нараджаецца песня
і чайкай галосіць.

Амяла

Дзядоўнік чарнее на снежным сувоі,
І месяц блакітнае сяйва струменіць.
І крочаць маўкліва жанчыны і воі,
І крочаць маўкліва старыя і дзеці.
А той, што наперадзе, серп уздымае,
А ён — залаты і бязлітасна востры.
А той, што наперадзе,— дрэва шукае,
На ім амялы распускаюцца зоры.
Чый род разжывецца чароўнаю кветкай —
Не здужае вораг, ні морак, ні сцюжа.
І той, што наперадзе, дрэва прыкмеціў,
Ён ведае словы і чары парушыць.
А снег пад нагамі рыпіць непрыязна,
І месяц халодны, як мёртвае вока.
Напэўна, агмені апошнія гаснуць
У хатах, пакінутых недзе далёка.
А холад кранае за целы, за сэрцы,
І плачам бязгучным зайшлося малое...
Сагрэцца, спыніцца... Спыніцца, сагрэцца...
А лес набліжаецца вельмі паволі.
А той, што наперадзе, серп прыўзнімае,
І ззяе ляза маладзік смертаносны.
І кветку чароўную племя прыдбае,
Ахвярай ля дрэва абраўшы кагосьці.
Затое жывым — амяла дастанецца.
І людзі маўкліва пад месяцам крочаць.
І той, хто наперадзе, ціха смяецца,
І ззяюць яго невідушчыя вочы.

На Каляды

...І распаліся сцены цаглянага замка,
І каробка са шлюбным вянком — на гарышчы.
А над горадам ззяе сузор'е Сабакі.
Мы аплакаць забылі свае папялішчы.
І сяброў, і вандроўнікаў поім і кормім
І ўпускаем у сэрца, каб некалі выгнаць.
Ад каляднае ёлкі ігліца па доме
Парассыпана — дні незваротныя быццам.
Як не ўмела я жыць — дык дасюль не наўчылі
І цяпер не навучаць, напэўна, ніколі
Ні падзенні, ні ўзлёты...
Я — вецер бяскрылы,
Па памылцы замкнёны
ў вавёрчыным коле.

* * *

Усё, што нараджалася,— памрэ,
Але ніколі быць — не перастане.
Як цяжка думкай сэрца адагрэць,
Калі з яго даўно сышло каханне.
Яно — не ў нас. Рыпіць навокал снег,
З якога не зляпіць чароўных замкаў.
Усё, што нам прымроілася ў сне,
Трымаюць пазалочаныя рамкі.
Памерлага кахання вернісаж.
Цудоўны дом...
Але, на жаль, не наш.

Аднакурснікі

Мы ведалі, што да вясны — далёка,
Што цяжка жыць на гэтае зямлі,
Дзе камянёў — на кожнага прарока.
Мы ведалі... І ўсё-ткі — тут жылі,
Тутэйшыя, рамантыкі, паэты...
Між верасовых пустак і балот,

Дзе паляванне дзікае па следзе
Усё імчыць і трушчыць тонкі лёд.
Мы ведалі, што нашая шыпшына —
Не цвет чырвоны, а крывавы след
І з пушчы нават сцежкаю звярынай
Не выйдзе больш ніякі інсургент.
Чароўнай Панны з'ехала карэта.
Ды колы шлях пакінулі ў траве.
Мы гэткія ж — рамантыкі, паэты,
Тутэйшыя.
І Беларусь — жыве.

* * *

Дрэвы ссівелі. Ламаецца голле.
Лірнік начуе ў заснежаным полі.
Вершнік ляціць да разбураных веж.
Тут — памірае народжаны верш.
Снег засцілае сляды пачуцця.
Вось вам і ўсе таямніцы быцця.

Стогадовая вайна

Зноў выпаў снег. Забілі святара.
Красуня не заторгвае фіранкі —
Жаўнеры едуць.
Золатам гараць
Іх эпалеты гэтым ясным ранкам.
Нічога не змянілася.
Чужы
Прыйшоў і пойдзе. Вадзіцца дарэмна.
Касцёлы, як іржавыя нажы,
Прымерваюцца да нябёсных венаў —
І вось ужо пайшоў крывавы снег,
Але растаў...
У белым — болей смерці.
Заторгнутых фіранак ціхі грэх
Ніколі не адкрые бедны Вертэр.
Назаўтра на далёкую вайну

Зноў чужакі паедуць праз мястэчка.
Рукамі абдымаючы сцяну,
У снег спаўзе чарговы чалавечак.
Сам вінаваты — думай пра сям'ю...
А тут жыццё не скончыцца ніколі.
І людзі песні новыя спяюць
Пра горад свой,
які не хоча волі.

* * *

Снег растане, і зноў, нібы Сфінкс,
Сакавік усміхнецца.
Мы палічым гады, як нямыя зязюлі.
А сэрца
З ільдзяным аскалёпкам —
забудзецца нават на боль.
Снег растане...
Але на шчыце прынясуць нашу роль.
Хто мы? Блазны.
Майстры мармуровых бязвокіх багінь.
Мармуровыя крылы
ніколі не страцяць вагі.
Не сагрэецца сэрца маленькага Кая...
Але
Снег растане... І шэрань
сцячэ па каменным крыле.
І анёл, на якога аднойчы зямныя глядзяць,
Мне прашэпча: «Маліся...
З малітвай лягчэй раставаць».

* * *

Цыганкай злой гуляе замець
Па чорным горадзе маім.
Такая ноч — што толькі плакаць.
Было, было, сплыло, як дым.
І не пайсці былой сцяжынай.
Не веру, што зыначу свет.

www.kamunikat.org

І б'юцца мокрыя сняжынкі
У мой на шыбе сілуэт.
Сусветнай мары белы човен
Мне не патрэбен і на грош.
Што — вершы?
Словы, словы, словы...
Прыступкі ў Вечнасць.
І не больш.

Смерць паэта

Да дому майго не засыпле сцяжыну.
У кубку ніколі не стыне гарбата.
І вэлюм блакітны не скіне дзяўчына,
Якая прыйшла да мяне, як да брата.
Яна спавядаецца,
нешта сакоча,
І просіць парады,
і хваліць мой розум.
І мае такія блакітныя вочы,
Якімі бяруць каралеўствы і лёсы...
І я разважаю...
І раю... І ўрэшце
Яе адпускаю —
у вецер, у казку.
І што — мае вершы...
Я — лішні... Я — трэці,
Які ад самоты прыдумвае маскі.
Нічога! Я зараз прымрою другую,
Каб чорныя бровы і гордыя словы.
Яна дакарае —
але не шкадуе
І сэрца не дзеліць сваё напалову.
Сышла...
Толькі свечкі агонь здрыгануўся.
А вы хто такая?
Я вас не прыдумваў.
Вы — з мроі чужой.
Заблукалі вы, мусіць,
Маім паэтычным заваблены сумам.

www.kamunikat.org

У белае мары я не апранаю.
Ласкавая пані,
змяніце адзенне...
Сцяжыну да дому майго замятае,
Нібыта навек апусцелую сцэну.

Страцім-лебедзь

Жыццё ёсць сон... І я магу прачнуцца.
Але ці ява там, ці новы сон?
Лісты да Бога скурчваюцца ў грубцы,
І грэе рукі ля яе Харон.
Паэт каменны —
на халодным пляцы.
Паэт жывы — ён дзе?
Шукай, гукай...
Люструе Свіслач камяні палацаў,
І край маўчыць,
як прад вясною гай.
Жыццё ёсць сон...
Не можа быць, каб явай
Быў горад, шэры, быццам прасціна,
І лесвіцы, што ўзводзяцца да славы
З прыступак слоў,
на рошчыне віна.
Жыццё ёсць сон...
Амаль што немагчымы,
Дзе ў роднасці —
калыска і труна.
Але жыве, жыве мая Айчына.
І ява толькі там, дзе ёсць Яна.

www.kniga.by

ЗМЕСТ

Сад
Сад камянёў
*** Мы шукаем адзін аднаго, быццам птушкі ў віхуры…
Род
Радавое гняздо
Могілкі Роса
Злодзей
Княгіня
Наваградскі замак
Вільня
Пясняр
Стары інсургент
Вечар у засценку
Курсісткі
Шляхта
Партрэт бабулі
Балада пра Міхала Падабедава
Ноч перад двабоем
Скарына ў Празе
*** воля выбару…
Аблога
Ян Баршчэўскі
*** Надыходзяць Каляды…
Сад скрыжавання
Дзень нараджэння дарогі
Валянцін Таўлай
Забыць Венецыю
Шляхціц Завальня
Апанас Філіповіч
*** Праходжу праз калючыя кусты…
Кракаўскія вершы
*** Усё жыццё за прывідам ісці…
*** Драздовіч хадзіў па палях тваіх цёмных, Айчына…
*** Не згасні, мой вогнік далёкі-далёкі…
*** Чаго баяцца мне?..
Непераможаныя
Шлях да Эдэма
Шукальнікі раю
*** Старасвецкія прарокі не пабачылі Месіі…
Паланез Агінскага
*** Сляды спараджаюць сляды – і спародзяць дарогу…
*** Дарогай залатой – праз восень, поле, неба…
Перасяленец
Мальдарор
*** Шлях пясчаны, пыльны, доўгі…
*** Па дарогах радасці зямной…
Пілігрымы
Эмігрант
*** З нікуды – у нікуды мой цягнік…
26 красавіка 1986 года
Крывічанка
*** Ты гасіш свечку на акне…
*** Сняжынка апошняга верша далонь апякла…
На скрыжаванні лёсаў і падзеяў
Сад храма
Балада пра драўлянага Хрыста
*** Ён ішоў па вадзе…
Варава
Пальмавая нядзеля
Выйсце з пусткі
Грэшнік
*** У час, калі крылом сваім душа…
Стары Запавет
Ефрасіння
Кляштар

www.kamunikat.org

Храм Уладзіслава Чарняўскага
Вечаровая малітва
У царкве
*** Перажывём мы ўсе свае няшчасці...
*** Што вам трэба ад Бога?..
Душа
Два крыжы 1937 года
*** Самыя доўгія ночы...
Магдаліна
Калядныя вершы
*** Ці крыж, ці крылы – застаюся з тым...
Сад агню
Два рыцары
Норвіду
*** Што тут паэт? У гэтым сквапным свеце...
Ля бюста Пашкевічанкі
Паэзія
Паэт
Забытыя паэты
Старасветчына
*** Сумніцельнае шчасце ўзяў паэт...
*** Ну што ёсць Вечнасць? Неўявіма...
*** Не для вас пішу. Не для сябе...
*** Першая. Апошняя. Чужая...
*** Халодны агонь, што вандруе на свеце маім...
*** І расколаты, звон не забудзе ніколі свой голас...
Невядомая паэтка
Маналог Маці Божай Вастрабрамскай
*** Такі ёсць рыцарскі звычай, бязлітасны, як двабой...
*** Безнадзейнасць... Страшнае слова...
Леся Украінка
Памяці паэта
Сад папяровы
Алюзіі
Шчаслівая
У чаканні героя
Імпрэсія
*** Калі пішуцца вершы, то можна ўміраць паступова...
Да пытання «чыстае красы»
Гамлет
*** Быць выключным – якая спакусная роля...
*** І без мяне ўспаўзе на помнік смоўж...
Майрынк
Танатас
Яхідна
Кніжнік
Пакаленне
Паэт Неронавай эпохі
*** Што – словы? Тут не чуюць нават плач...
*** І нас забудуць непапраўна рана...
Сад золата
Пані
Балада пра недаступную прыгажосць
Рыцарскі турнір
*** Паўстане з хваляў часу Авалон...
Рыцар
*** Такі спакой...
Сёмая жонка, альбо Сон стамлёнай гараджанкі
*** Звіваецца арнамент геральдычны...
*** Ты кажаш – каралева?..
Вызваленне
Воўк
Кола
Паляванне каралевы Боны
Вінцэсь Каратынскі
Рагнеда
Валет
Бахчысарай

Вячэра ў чужым палацы
*** Вецер з боку мора, вецер з боку сонца...
Залаты ліхтар
*** Рабам так страшна волю мець...
Успамін
Палац
*** Састарэлы кароль...
Балада пра чорны шоўк і белыя карункі
*** Кароль Пясчанага замка ўладарыць Сусветам поўні...
*** Беларукая Ізольда, цёзка той, такой каханай...
Сад раллі
Nature
Адраджэнне
ВінцэнтДунінМарцінкевіч
Чорны Война
Чорная быль
*** Мая маленькая смерць...
Радаўніца
Страла
Пакаранне паэта
Позна
*** Паляванне на ведзьмаў – вясёлы занятак...
*** Прыкласці ракавінку да вуха...
*** Зразумей мяне – не дай забыцца...
*** Святло, запаленае ўдзень...
*** Выснова дня: ён мог бы і не быць...
*** Прыйдзе дзень – і мёртвымі будзем...
Сябру, які пакутуе па славе
*** І зноў забівае сонца
*** Ці абуджаюся – ці паміраю...
*** Гэта восень. Яшчэ незаўважная...
*** Як да смерці блізка...
Двухтварасць
Сад відачынства
Першым беларускім вандроўным тэатрам
Бедны Йорык
Далі
Батлейка
Скокі смерці
Карціны
Два салаўі
Нямое кіно
Мніх
Камедыя дэль артэ для турыстаў
Антракт
Балаган
Сад вады
*** Жыць – для таго...
*** Хоць уласнай крывёй пішы...
*** Усё паўторыцца. Але не для мяне...
*** Колькі разумных!..
*** І не варта жаліцца, відаць...
*** У каўчэгу начной цішыні...
Максім Багдановіч
*** Ну што ты плачаш, браце мой!..
*** Я – гэта я... Маленькі востраў...
*** Калі пачынае сэрца...
Галернікі
Зоська Верас
*** Яшчэ лісты зялёныя зусім...
*** Ты хочаш паратунку? Ён – у тым...
Трывога
Страла
Вясна
Вужыная каралева
*** Нібыта жыццё сыходзіць...
*** Гэта – горад карынфскіх калон...
2000

kamunikat.org

Апакаліпсіс
*** Не падкажуць на развітанне...
*** Дзень высыхае, як сляза...
Адысея
Сад снегу
*** Снег... Дрэвы... Неба... Што яшчэ...
Лірнік
*** Загараецца першая зорка ад подыху ночы...
*** Ноч пачынаецца першаю смерцю...
Варагі
***Дзверы не адчыняцца...
Адліжная ноч
Накцюрн зімовай ночы
Мора зімы
*** Ноч. Вясна. Анёл ляціць да зоркі...
*** У краявідзе з жоўтым небам...
Выгнаннікі
Палуян
У адсутнасці кахання
*** Праз душу, праз восень, праз Сусвет...
Вечар у сямейным коле
1864
Тарас Шаўчэнка
Амяла
На Каляды
*** Усё, што нараджалася, – памрэ...
Аднакурснікі
*** Дрэвы ссівелі. Ламаецца голле...
Стогадовая вайна
*** Снег растане, і зноў, нібы Сфінкс...
*** Цыганкай злой гуляе замець...
Смерць паэта
Страцім-лебедзь

© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2010 год
© PDF: Камунікат.org, 2010 год